MIESIĘCZNIK
POŁOCKI.
Tom I.
Rok 1818.

№ 1(77), 2026

*«Вестник Полоцкого государственного университета» продолжает традиции первого в Беларуси литературно-научного журнала «Месячник Полоцкий».*

# ВЕСТНИК ПОЛОЦКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА
## Серия А. Гуманитарные науки

В серии А научно-теоретического журнала публикуются статьи, прошедшие рецензирование, содержащие новые научные результаты в области истории, литературоведения и языкознания.

# ВЕСНІК ПОЛАЦКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА
## Серыя А. Гуманітарныя навукі

У серыі А навукова-тэарэтычнага часопіса друкуюцца артыкулы, якія прайшлі рэцэнзаванне і змяшчаюць новыя навуковыя вынікі ў галіне гісторыі, літаратуразнаўства і мовазнаўства.

# HERALD OF POLOTSK STATE UNIVERSITY
## Series A. Humanity sciences

Series A includes reviewed articles which contain novelty in research and its results in history, literary studies and linguistics.

Журнал входит в Российский индекс научного цитирования.
Электронная версия номера размещена на сайте: https://journals.psu.by/humanities

**Адрес редакции:**
**Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой,**
**ул. Блохина, 29, г. Новополоцк, 211440, Беларусь**
**тел. + 375 (214) 59 95 41, e-mail: vestnik@psu.by**

Отв. за выпуск *В.Е. Овсейчик.*
Редактор *И.Н. Чапкевич.*

Подписано к печати 27.02.2026. Бумага офсетная 80 г/м$^2$. Формат 60×84$^1/_8$. Ризография.
Усл. печ. л. 13,48. Уч.-изд. л. 16,25. Тираж экз. Заказ 72.

## *ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ*

**УДК 904:739.1(476.5-21)"10/18"** **DOI 10.52928/2070-1608-2026-77-1-2-9**

# ВЫТВОРЧЫЯ КОМПЛЕКСЫ ПА АПРАЦОЎЦЫ КАЛЯРОВЫХ МЕТАЛАЎ X–XVIII стст. З ТЭРЫТОРЫІ ПАЎНОЧНАЙ І ЦЭНТРАЛЬНАЙ БЕЛАРУСІ

***канд. гіст. навук, дац. І.У. МАГАЛІНСКІ***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай)***

*У артыкуле прадстаўлены вынікі абагульняючага даследавання вытворчых комплексаў па апрацоўцы каляровых металаў X–XVIII стст. з тэрыторыі Паўночнай і Цэнтральнай Беларусі. Аўтар прыходзіць да высновы, што асноўнымі цэнтрамі вырабу прадукцыі ювелірнага рамяства ў X–XVIII стст. у рэгіёне з'яўляліся гарадскія майстэрні (Полацк, Віцебск, Мінск, Друцк). Адзначаецца, што на тэрыторыі сельскіх паселішчаў апрацоўка каляровых металаў магла існаваць у якасці самастойнага віду рамеснай дзейнасці толькі ў межах гандлёва-рамесніцкіх паселішчаў X–XI стст. (Кардон). Аўтарам устаноўлена таксама, што вытворчыя комплексы па апрацоўцы каляровых металаў X–XVIII стст. з тэрыторыі Паўночнай і Цэнтральнай Беларусі адносяца да некалькіх храналагічных груп: X–XI стст. (3 комплексы), XII–XIII стст. (8 комплексаў) і XVII–XVIII стст. (1 комплекс), якія адрозніваюцца асаблівасцямі тэхналагічных аперацый, інструментамі і прыстасаваннямі, а таксама хімічным складам сыравіннага метала.*

***Ключавыя словы:*** *археалогія Беларусі, гісторыя старажытнай тэхналогіі, ювелірнае рамяства, археаметалургія.*

Важным сведчаннем існавання на пэўнай тэрыторыі вытворчай дзейнасці па апрацоўцы каляровых металаў з'яўляюцца знаходкі адмысловых інструментаў і прыстасаванняў лакалізаваных у межах блізка размешчаных пабудоў ці іх слядоў, часам разам з рэшткамі печаў, шлакаў, металічных аплаўкаў і абрэзкаў. Такія комплексы ў літаратуры часта вызначаюцца ў якасці "вытворчых ювелірных комплексаў" і ў гэтым сэнсе сінанімічныя паняццю "майстэрня" [1, с. 100–101; 2, с. 203–204; 3, с. 21; 4, с. 64; 5, с. 233; 6, с. 115–116]. Значэнне даследавання такіх аб'ектаў заключаецца ў магчымасці прасачыць увесь спектр прац па апрацоўцы каляровых металаў у межах аднаго комплекса, вылучыць напрамкі эвалюцыі старажытнай тэхнікі і тэхналогіі, выявіць лакальныя адметнасці ювелірнага рамяства, устанавіць тыпы металічнай сыравіны, якая выкарыстоўвалася мясцовымі рамеснікамі.

***Вытворчыя ювелірныя комплексы і сляды вытворчай дзейнасці па апрацоўцы каляровых металаў у межах гарадоў.*** Найбольшая колькасць майстэрняў па апрацоўцы каляровых металаў была выяўлена ў Полацку, які доўгі час з'яўляўся адміністрацыйным, палітычным, эканамічным і культурным цэнтрам рэгіёна. На сённяшні дзень на тэрыторыі горада археалагічна даследавана 7 вытворчых ювелірных комплексаў, у Віцебску – 2, у Мінску – 1, яшчэ адзін вытворчы комплекс выяўлены ў Друцку [7; 8, с. 128; 9, с. 205–206; 10; 11; 12, с. 121–122; 13, с. 261; 14, с. 45; 15, с. 372]. Вядомыя на сённяшні дзень у межах гарадоў майстэрні магчыма аднесці да трох храналагічных груп: X–XI стст., XII–XIII стст. і XVII–XVIII стст.

*Вытворчыя комплексы X–XI стст.* Майстэрня X–XI стст. была выяўлена ў ходзе раскопак 1989–1990 гг. на Ніжнім замку Полацка. У межах каркасна-слупавой канструкцыі, якая загінула ў пажары, былі выяўлены рэшткі печы-каменкі разам з фрагментамі тыгляў, шкляных пацерак і бурштына. Усяго выяўлена каля 80 кругладонных тыгляў і іх фрагментаў, два шырокагубыя арнаментаваныя ювелірныя пінцэты, ювелірнае кавадлачка, фрагмент раўнаплечых вагаў і гірка-разнавага, сыравінны метал і гатовыя вырабы [9, с. 205–206; 10, с. 267].

Асабліва неабходна спыніцца на характарыстыцы вытворчага ювелірнага комплекса X – пачатку XI ст., які быў выяўлены і часткова даследаваны падчас археалагічных раскопак 2023 г. на тэрыторыі Ніжняга замка Полацка [16]. У ходзе даследаванняў у шурфах № 1 і № 4 былі зафіксаваны шматлікія сведчанні вытворчай дзейнасці па апрацоўцы каляровых металаў. Так, у шурфе 1, у межах другога стратыграфічнага гарызонта выяўлены развал печы-каменкі, у межах якой знойдзены тыглі для плаўкі каляровых металаў розных тыпаў са слядамі ашлакоўвання (звыш 3000 фрагментаў), рэшткі глінянай ліцейнай формы, зробленай па выплаўляемай мадэлі, фрагменты керамічных соплаў, аплаўкі і кроплі металу, а таксама шматлікія фрагменты глінянай абмазкі печы са слядамі шлакаў каляровых металаў. На датаванне вытворчага комплексу ўказваюць венцы керамічных гаршкоў, шматлікія знаходкі шкляных, гліняных і хрустальных пацерак, тыповых для X–XI стст., клад з шасці візантыйскіх фолісаў 60-х гг. X ст., чатырнадцацігранныя гіркі-разнавагі, а таксама абрэзак арабскага дырхема. Знаходкі, звязаныя з вытворчай дзейнасцю па апрацоўцы каляровых металаў, выяўлены таксама падчас даследавання шурфа 4. Сярод артэфактаў тут сустрэты фрагменты плавільных тыгляў, аплаўкі і кроплі металу, металічныя абрэзкі і фрагменты дроту, гіркі-разнавагі, роўнаплечыя вагі (3 экз.), створкі двух металічных ліцейных форм, а таксама сыравінны метал. Важнейшае значэнне мае выяўленне ў мацерыковай яме ў межах Шурфа 5 вялікага фрагмента тыгля разам з адлўкай ажурнай умбонападобнай часткі авальнай рэльефнай фібулы, якую магчыма датаваць першай паловай – сярэдзінай X ст. [17, p. 75].

Знойдзеныя сляды рамеснай дзейнасці ўказваюць на існаванне ювелірнай вытворчасці па апрацоўцы каляровых металаў на вялікай плошчы (каля 7000 м$^2$). Мясцовыя ювеліры спецыялізаваліся на ліцейных аперацыях, на што ўказваюць шматлікія знаходкі плавільных ёмістасцей (тыгляў). Адліўкі праводзіліся ў металічныя ліцейныя формы, а таксама ў пластычныя прыстасаванні, зробленыя па выплаўляемых мадэлях. Ліцейныя аперацыі ажыццяўляліся на аддаленні ад жылых пабудоў у печах-каменках, абмазаных глінай. Высокія тэмпературы ў такіх канструкцыях падтрымліваліся дзякуючы горнам, соплы якіх рабіліся з матэрыялу, блізкага да глінянага цеста тыгляў. Сыравінай для вытворчасці з'яўляліся манетныя медзь і серабро, а таксама металічны лом і зліткі металу. Дадаткова ў майстэрнях апрацоўваўся бурштын. Падчас даследавання сустрэты таксама некалькі дробных фрагментаў охры, якія таксама маглі выкарыстоўвацца для аздаблення прадукцыі ювелірнай вытворчасці. Майстэрні спецыялізаваліся на вырабе ўпрыгажэнняў, арыентаваных як на мясцовае славянскае (фігурныя ромбападобныя (“бутэлькападобныя”) падвескі), так і на скандынаўскае насельніцтва (дэталі авальных рэльефных фібул).

Для лепшага разумення адметнасцей ювелірных майстэрняў X–XI стст. неабходна прааналізаваць склад металічнай сыравіны, якая выкарыстоўвалася ў каляровай металаапрацоўцы на тэрыторыі асобных вытворчых комплексаў[1].

Так, у выніку даследавання хімічнага складу рэшткаў металічнай сыравіны на сценках 60 тыгляў, выяўленых у межах “квартала ювеліраў” X–XI стст. на тэрыторыі Ніжняга замка Полацка, устаноўлена, што ў ёмістасцях у асноўным плавілася свінцовая латунь (52 экз., 87%). Акрамя таго, у выбарцы прадстаўлены двайныя латуні (2 экз.), шматкампанентныя сплавы (3 экз.), а таксама алавяная латунь (1 экз.). Асабліва трэба вылучыць у выбарцы знаходкі двух фрагментаў тыгляў са слядамі медзі, цынка, серабра і золата на ўнутранай паверхні. У цэлым, каляровы метал з вытворчых комплексаў X–XI стст. з Полацка вызначаецца перавагай складаных шматкампанентных сплаваў. Так, сярод 64 артэфактаў гэтага часу, для якіх вядомы хімічны склад, шматкампанентныя сплавы сустрэты ў 25 экз. (39% выбаркі). Пры гэтым у калекцыі ў роўнай ступені сустракаюцца як шматкампанентныя бронзы (13 экз.), так і шматкампанентныя латуні (13 экз.). Складаныя бронзы вызначаюцца перавагай прадметаў з высокімі канцэнтрацыямі волава (звыш 10% – 7 экз.), а шматкампанентная латунь – сярэднімі і высокімі ўтрыманнямі цынка (5–10% – 6 экз., звыш 10% – 5 экз.). Прыкладна ў роўнай ступені ў выбарцы сустракаюцца латуні (14 экз., 22%) і бронзы (16 экз., 25%). Пры гэтым сярод медна-цынкавых сплаваў пераважаюць свінцовыя латуні (13 экз.), якія вылучаюцца істотнымі ўтрыманнямі цынка (5–10 % – 6 экз., звыш 10% – 3 экз.). Сярод бронзавых сплаваў найбольшай колькасцю прадстаўлены алавяна-свінцовыя бронзы (10 экз.). Канцэнтрацыя цынка ў падобных сплавах не перавышае 0,9%, утрыманне волава ў складзе 5 экз. знаходзіцца ў дыяпазоне 1–5%, у 3 экз. – 5–10%, звыш 10% Sn зафіксавана ў 2 экз. Алавяна-свінцовыя сплавы і нелегіраваныя легкаплаўкія металы прадстаўлены ў 6 экз. (9,4% ад агульнай колькасці), пры гэтым пераважаюць сплавы на аснове свінца (4 экз.). Адзінкавымі экзэмплярамі прадстаўлены вырабы з “чыстай” медзі (1 экз.) і сплаваў каштоўных металаў (2 экз.).

Ювелірныя комплексы X–XI стст. выяўлены ў Гнёздава, Гарадку на Ловаці, Рурыкавым гарадзішчы, Навагрудку і інш. [18, с. 67–68; 19, с. 74; 20, с. 123; 21, с. 14–16].

*Вытворчыя комплексы XII–XIII стст.* Найбольшай колькасцю ў матэрыялах археалагічных даследаванняў прадстаўлены гарадскія вытворчыя комплексы XII–XIII стст. (8 аб'ектаў).

Храналагічна найбольш ранню дату мае комплекс XII стст. з даследаванняў Д.У. Дука і А.Л. Коца 2013 г. на тэрыторыі заходняй часткі Запалоцкага пасада Полацка. Падчас даследаванняў раскопа 6, пасля зачысткі другога ўмоўнага пласта ў гумусіраваным слоі былі выяўлены сляды пабудовы, якая прасочвалася ў перадмацерыковым пласце і мацерыковай яме. Характар знаходак, якія былі выяўлены падчас даследавання рэшткаў сядзібы, дазволілі ідэнтыфікаваць яе ў якасці комплексу па апрацоўцы каляровых металаў. У ходзе раскопак знойдзена 16 фрагментаў тыгляў, 5 з якіх не мелі слядоў ашлакоўвання, закрытая лыжкападобная льячка з рэшткамі металу ўнутры, бракаваная луніца, нарыхтоўкі, пласцінкі, дрот, матрыца і іншыя прадметы [11, с. 20].

Для вывучэння адметнасцей мясцовай каляровай металаапрацоўкі намі было праведзена комплекснае даследаванне хімічнага складу вырабаў з каляровых металаў, якія былі выяўлены падчас гэтых раскопак [22]. Вывучаўся хімічны склад 20 прадметаў. У выніку ўстаноўлена, што “чыстая медзь” у калекцыі прадстаўлена адным артэфактам. Сярод бронзавых вырабаў пераважаюць артэфакты, зробленыя са свінцовай (4 прадметы) і алавяна-свінцовай бронзы (2 прадметы). У калекцыі пераважаюць артэфакты, зробленыя са свінцовай латуні (8 прадметаў), якія ў сваім складзе, акрамя цынка, утрымліваюць свінец. Канцэнтрацыя цынка даследаваных вырабаў вагаецца ад 1,7 да 8,8%, што з'яўляецца нізкім паказчыкам для сплаваў гэтага тыпу. Шматкампанентныя сплавы ў калекцыі прадстаўлены вырабамі са шматкампанентнай латуні (1 прадмет) і шматкампанетнай бронзы (1 прадмет). Мясцовыя ювеліры выкарыстоўвалі таксама легкаплаўкія сплавы на аснове свінца (4 прадметы).

Найбольшая па плошчы майстэрня XII–XIII стст. знойдзена падчас раскопак С.В. Тарасава ў 1987–1988 гг. на тэрыторыі Вялікага пасада Полацка. Падчас даследаванняў у другім будаўнічым гарызонце быў выяўлены вялікі сядзібны комплекс, які складаўся з сямі пабудоў, размешчаных на плошчы 1500 м$^2$. У ходзе вывучэння сядзібы знойдзены шматлікія сляды вытворчай дзейнасці па апрацоўцы каляровых металаў: раўнаплечыя вагі,

---

[1] Хімічны склад металу з вытворчых ювелірных комплекаў X–XVIII стст. даследаваўся аўтарам з дапамогай оптыка-эмісійнага спектральнага аналіза і рэнтгенафлуарэсцэнтнага спектральнага аналіза ў лабараторыях Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай і лазернага спектральнага аналіза ў Інстытуце фізікіі НАН Беларусі імя Б.І. Сцяпанава.

гіркі-разнавагі, ювелірны пінцэт, тыглі для плаўкі каляровых металаў, ліцейныя формы, нарыхтоўкі, гатовыя вырабы. У межах комплексу былі выяўлены сляды апрацоўкі бурштыну і шкла. Да майстэрні мог мець дачыненне развал плінфы другаснага выкарыстання разам са значнай колькасцю фрагментаў тыгляў, металургічных шлакаў і соплаў горнаў, які магчыма вызначыць у якасці рэшткаў печы для плаўкі каляровых металаў [10, с. 268–271].

У выніку даследавання хімічнага складу 48 артэфактаў з каляровых металаў, які паходзяць з вытворчага ювелірнага комплексу XII–XIII стст. на Вялікім пасадзе Полацка, устаноўлена, што найбольшай колькасцю ў выбарцы прадстаўлены медна-цынкавыя сплавы – 21 абразец (44%). Пры гэтым істотна пераважаюць высокацынкавыя свінцовыя латуні (20 абразцоў). Так, у складзе 13 артэфактаў з гэтага сплаву ўтрыманне цынка перавышае 10,0% (ад 11,59% да 24,17%). Асабліва трэба адзначыць, што сярод даследаваных абразцоў са свінцовай латуні 6 – гэта сыравінны метал і нарыхтоўкі. Другой па колькасці групай сплаваў выбаркі сталі складаныя шматкампанентныя латуні (15 экз., 31%). Важна адзначыць істотныя канцэнтрацыі цынка ў метале абразцоў. Так, у складзе 5 экзэмпляраў зафіксавана звыш 15% гэтага легіруючага элементу (ад 11,58% да 24,86%), у 8 абразцах канцэнтрацыя Zn выяўлена ў дыяпазоне ад 5,87% да 9,94%. Пры гэтым, колькасць волава ў прадметах не перавышае 4,32% (14 абразцоў). Сярод даследаваных артэфактаў 10 адносяцца да катэгорыі сыравіннага металу (нарыхтоўкі). Колькасць прадметаў з іншых каляровых металаў і сплаваў у выбарцы не істотная. Так, сустрэты 4 экзэмпляры вырабаў з "чыстай" медзі з утрыманнем не менш чым 99% Cu. Бронзы прадстаўлены 6 прадметамі з алавянай (1 экз.), алавяна-свінцовай (4 экз.) і свінцовай бронзы (1 экз.). Два экзэмпляры ў калекцыі з'яўляюцца вырабамі з алавяна-свінцовых сплаваў і нелегіраваных легкаплаўкіх металаў.

Такім чынам, майстэрня XII–XIII стст. на Вялікім пасадзе Полацка спецыялізавалася на апрацоўцы высокацынкавых латунных сплаваў, якія выкарыстоўваліся пераважна для вытворчасці ўпрыгажэнняў балцкіх тыпаў (звярынагаловыя бранзалеты, падковападобныя фібулы). Падобная высокаякасная сыравіна, а таксама шырокае ўжыванне ў працы комплекса бурштыну указваюць на сталыя кантакты ювеліраў з "прыбалтыйскай" зонай каляровай металаапрацоўкі.

Падчас раскопак 1961–1962 гг. на тэрыторыі Верхняга замка былі выяўлены два рамесныя вытворчыя комплексы XIII ст. Першая майстэрня датуецца 40-мі гг. XIII стст. і адзначаецца знаходкамі характэрнага набору артэфактаў, сярод якіх выяўлены 12 масіўных конусападобных тыгляў і іх фрагментаў з нацёкамі металу, абломак каменнай ліцейнай формы, а таксама нарыхтоўкі і гатовыя вырабы. Побач з гэтай пабудовай быў выяўлены развал вуголля і ліцейных шлакаў з нацёкамі сіняга і карычневага колеру, разам з якімі быў знойдзены фрагмент тыгля. Магчыма меркаваць, што дадзеная знаходка маркіруе месца, дзе ажыццяўлялася плаўка металаў і разліўка іх у формы [23, с. 18, 21; 14, с. 45]. Вытворчы комплекс быў знішчаны ў пажары, аднак працягнуў існаваць на іншым месцы ў межах новага комплексу пабудоў, які датуецца 1276 г. Падчас даследаванняў тут былі зафіксаваны матэрыялы, звязаныя з вытворчымі працэсамі па апрацоўцы каляровых металаў: фрагменты каменных ліцейных форм, злітак свінцу, свінцовыя аплаўкі, фрагменты тыгляў, медны выраб і фрагмент пярсцёнка [14, с. 41; 23, с. 9].

Для выяўлення адметнасці ювелірнай вытворчасці ў майстэрнях XIII ст. на Верхнім замку Полацка намі быў даследаваны хімічны склад 33 артэфактаў з каляровых металаў. У выніку ўстаноўлена, што найбольшай колькасцю прадстаўлены бронзавыя і легкаплаўкія сплавы. Бронзы сустрэты ў колькасці 14 экзэмпляраў з алавянай (2 экз.), алавяна-цынкавай (1 экз.), свінцовай (1 экз.) і алавяна-свінцовай (10 экз.) бронзы. Такім чынам, у выбарцы пераважна прадстаўлены сплавы CuSnPb, якія адрозніваюцца сярэднімі і нізкімі канцэнтрацыямі волава (у 5 экз. – ад 1,1 да 4,43%, максімум – 10,72%), пры гэтым утрыманне свінца не перавышае 5%. Варта таксама адзначыць, што сярод прадметаў з алавяна-свінцовай бронзы большасць складаюць прадметы хрысціянскага культу. Важнае значэнне ў каляровай металаапрацоўцы XIII ст. на Верхнім замку Полацка мелі алавяна-свінцовыя сплавы і нелегіраваныя легкаплаўкія металы. Сустрэты "чыстае" волава (1 экз.), сплавы на аснове свінца (2 экз.), волава (6 экз.). З легкаплаўкіх металаў у калекцыі зроблены ўпрыгажэнні (перадусім, манетападобныя падвескі) і сыравінны метал (4 экз.). Адметнай рысай выбаркі трэба лічыць таксама нязначную колькасць медна-цынкавых (3 экз.), складаных шматкампанентных сплаваў (3 экз.) і прадметаў з "чыстай" медзі.

Такім чынам, рамеснікі з майстэрняў XIII ст. на Верхнім замку Полацка спецыялізаваліся на выкарыстанні алавяна-свінцовых бронз і алавяна-свінцовых сплаваў і нелегіраваных легкаплаўкіх металаў. Пры гэтым выбарка з Верхняга замку выразна адрозніваецца ад майстэрні з Вялікага пасада мінімальнай колькасцю медна-цынкавых сплаваў, а выяўленыя прадметы з латуней вылучаюцца нізкімі ўтрыманнямі цынка. Дадзеныя акалічнасці набліжаюць мясцовую выбарку да так званай "вяцічскай" зоны металаапрацоўкі, для якой характэрна пераважнае выкарыстанне алавяна-свінцовых бронз з нізкімі і сярэднямі канцэнтрацыямі волава [24, с. 117–121].

Падчас даследаванняў на тэрыторыі Ніжняга замка Віцебска раскопкамі былі адкрыты рэшткі двух майстэрняў па апрацоўцы каляровых металаў [12, с. 122]. Адна сядзіба датуецца першай паловай XIII ст. і вылучаецца знаходкамі некалькіх дзясяткаў кавалкаў металічных шлакаў, фрагментамі дэфармаванай керамікі з нацёкамі каляровага металу, фрагментамі тыгляў, а таксама комплексам вырабаў з алавяна-свінцовага сплаву. У пабудове таксама знойдзена некалькі кавалкаў жалезных шлакаў і крыц. На думку Т.С. Бубенько, мясцовы майстар займаўся не толькі апрацоўкай каляровага, але і чорнага металу [12, с. 122]. Другой паловай XIII ст. датуецца яшчэ адна майстэрня, падчас даследавання якой знойдзены фрагменты керамічных тыгляў, у якіх плавілася алавяная бронза [12, с. 122].

Асобна неабходна спыніцца на характарыстыцы хімічнага складу 31 вырабу з каляровых металаў XI–XIII стст. з раскопак на Ніжнім замку Віцебска, у тым ліку, з апісаных вышэй майстэрняў [12, с. 172–173].

Даследаваныя прадметы адносяцца да наступных сплаваў: бронза (17 абразцоў, 55% выбаркі), “чыстая” медзь (7 абразцоў, 23% выбаркі), алавяна-свінцовыя металы і нелегіраваныя легаплаўкія сплавы (9 абразцоў, 29% выбаркі), сплавы каштоўных металаў (2 абразцы, 6,5% выбаркі). Важна адзначыць поўную адсутнасць сярод абразцоў медна-цынкавых сплаваў, а таксама перавагу алавяна-свінцовых бронз з нізкім ці сярэднім утрыманнем волава. Шырокае выкарыстанне ў каляровай металаапрацоўцы алавяна-свінцовых бронз і алавяна-свінцовых сплаваў набліжае віцебскую выбарку да матэрыялаў з Верхняга замку Полацка XIII ст. [25, с. 6].

У слоі пачатку XIII ст. падчас даследаванняў Мінска была адкрыта зрубная канструкцыя П61 памерам 4,0 × × 4,0 м. Частка падлогі пабудовы ў яе заходняй частцы была зроблена з бярозавых круглякоў, астатняя частка была засцелена бярозавай карой. Унутры канструкцыі былі выяўлены матэрыялы, якія ўказваюць на яе прызначэнне: дзве створкі адной каменнай ліцейнай формы для адліўкі гузікаў, ювелірны зацiскны пінцэт, прамавугольныя накладкі на конскую збрую, бразготка, гузік. У межах майстэрні была знойдзена мініяцюрная каменная сякера з такога ж матэрыялу, што і форма [13 с. 261].

У выніку даследавання хімічнага складу 32 прадметаў, пераважна, XII–XIII стст. з археалагічных раскопак Мінска ўстаноўлена, што найбольшай колькасцю прадстаўлены вырабы з алавяна-свінцовай бронзы (14 экз., 44% выбаркі), якія вылучаюцца істотным утрыманнем волава. Так, у складзе 6 прадметаў канцэнтрацыя гэтага легіруючага элемента перавышае 20%, пры гэтым большая частка артэфактаў з алавяна-свінцовай бронзы вызначаецца таксама ўтрыманнем менш 10% свінца (10 экз.). Другой найбольш распаўсюджанай ў каляровай металаапрацоўцы на тэрыторыі Мінска групай сплаваў з’яўляюцца легкаплаўкія сплавы і нелегіраваныя легкаплаўкія металы, якія прадстаўлены 9 абразцамі (28% выбаркі) са сплаваў на аснове волава (4 экз.) і свінца (5 экз.). Сярод іншых сплаваў з мінскай выбаркі адзінкавымі экзэмплярамі прадстаўлены алавяная латунь (1 экз.), свінцовая латунь (2 экз.), алавяная бронза (2 экз.), шматкампанентная бронза (1 экз.), шматкампанентная латунь (2 экз.), а таксама адзіны выраб, які складаецца са сплава на аснове медзі з павялічаным утрыманнем серабра.

Такім чынам, для каляровага металу Мінска характэрна перавага алавяна-свінцовых бронз, а таксама легкаплаўкіх сплаваў і нелегіраваных легкаплаўкіх металаў.

Да ліку ювелірных майстэрняў таксама трэба аднесці пабудову, якая была выяўлена ў Друцку падчас раскопак В.М. Ляўко ў 2013 г. На прызначэнне канструкцыі ўказваюць знайдзеныя ў яе межах фрагменты соплаў горнаў плавільнай печы, а таксама створка каменнай ліцейнай формы [15, с. 372]. Трэба адзначыць, што каляровы метал Друцка паводле свайго складу падобны да металу Віцебска, Мінска і Полацка, што ў цэлым адлюстроўвае асаблівасці масавай гарадской ювелірнай вытворчасці для перыяду XII–XIII стст.

Для даследавання друцкай каляровай металаапрацоўкі намі быў прааналізаваны хімічны склад 65 прадметаў XII–XIII стст., якія былі знойдзены на тэрыторыі горада падчас археалагічных раскопак пад кіраўніцтвам В.М. Ляўко ў перыяд з 2008 па 2013 гг. У выніку ўстаноўлена, што найбольшай колькасцю ў выбарцы прадстаўлены бронзы (23 экз., 35%) і легкаплаўкія сплавы (25 экз., 38%), сустрэты таксама шматкампанентныя сплавы (7 экз., 11%), латуні (6 экз., 9,2%), вырабы з серабра (3 экз., 4,6%) і сплавы на аснове медзі з павялічаным утрыманнем серабра (1 экз., 1,5% выбаркі).

Бронзы прадстаўлены вырабамі з алавяна-свінцовай (16 экз.) і свінцовай (7 экз.) бронзы. Абразцы з алавяна-свінцовай бронзы адрозніваюцца высокім утрыманнем волава. Так, у 13 прадметах канцэнтрацыя Sn перавышае 10%. Варта адзначыць, што ўтрыманне свінца ў сплавах з алавяна-свінцовай бронзы ў большасці выпадкаў не перавышае 10%, і толькі ў трох вырабах утрымліваецца большая колькасць гэтага металу. Свінцовыя бронзы прадстаўлены ў калекцыі 7 экзэмплярамі. У метале абразцоў зафіксаваны нізкія канцэнтрацыі свінца (менш за 5% у складзе 5 экз.). Найбольшая колькасць Pb выяўлена ў пласціне невядомага прызначэння – 13,12%. Медна-цынкавыя сплавы прадстаўлены ў выбарцы шасцю прадметамі са свінцовай латуні. Канцэнтрацыя цынку ў вырабах вагаецца ад 2,79 да 14,81%, пры гэтым у метале 3 артэфактаў выяўлена больш за 10% Zn. У складзе 3 прадметаў зафіксавана значнае ўтрыманне свінцу (13,07 – 22,62%).

Вялікую ролю ў каляровай металаапрацоўцы Друцка адыгрывалі вырабы з алавяна-свінцовых сплаваў і нелегіраваных легкаплаўкіх металаў (25 экз.). Сярод даследаваных абразцоў вылучаюцца сплавы на аснове волава: сплаў волава з меддзю (9 экз.); сплаў волава з меддзю і свінцом (6 экз.); сплаў волава з меддзю, цынкам і свінцом (1 экз.), сплаў волава са свінцом (1 экз.); “чыстае” волава (4 экз.). Вырабы на аснове свінцу прадстаўлены сплавамі свінца з меддзю (3 экз.) і сплавамі свінца з цынам (1 экз.).

Шматкампанентныя сплавы прадстаўлены ў выбарцы 7 абразцамі. Шматкампанентная бронза сустрэта ў складзе 3 артэфактаў. Прадметы характарызуюцца значным утрыманнем волава і свінца, якія перавышаюць 10%, а таксама нізкім і сярэднім утрыманнем цынку (да 6,57%). Чатыры прадметы ў выбарцы зроблены са шматкампанентнай латуні. Вырабы характарызуюцца нізкім утрыманнем волава (да 3,46%), а таксама пераважна высокім і сярэднім утрыманнем свінцу (ад 2,97 да 12,46%) і цынку (ад 6,75 да 19,85%). Найбольшая колькасць Zn зафіксавана ў складзе металічнай пласціны невядомага прызначэння (19,85%).

Ювелірныя майстэрні на тэрыторыі Паўночнай і Цэнтральнай Беларусі ў XII–XIII стст. маюць шмат агульнага з сінхроннымі вытворчымі комплексамі з іншых тэрыторый. Вытворчасць вырабаў з каляровых металаў у межах жылых комплексаў была зафіксавана у Наваградку, Ноўгарадзе, Уладзіміры [26, с. 127–137; 4, с. 64]. На аснове тапаграфіі ювелірных майстэрняў спадчынная пераемнасць рамеснай вытворчасці фіксуецца ў Наваградку і Ноўгарадзе [27, с. 226–227].

*Вытворчы комплекс XVII – XVIII стст.* У ходзе даследаванняў 2005 г. на Вялікім пасадзе Полацка была выяўлена адзіная вядомая на тэрыторыі Паўночнай і Цэнтральнай Беларусі ювелірнай майстэрня, якая датуецца XVII–XVIII стст. [7]. Сярод інструментаў і прыстасаванняў вытворчасці па апрацоўцы каляровых металаў падчас даследаванняў у межах сядзібнага комплексу былі знойдзены малаточак і 50 фрагментаў тыгляў. У ходзе прац была выяўлена таксама вялікая колькасць нарыхтовак і гатовых вырабаў [28, с. 173]. Вытворчы комплекс XVII–XVIII стст. мае шмат агульнага з сінхроннымі помнікамі з іншых тэрыторый [29, с. 165; 30, с. 278].

Асабліва трэба адзначыць адметнасці хімічнага складу вырабаў з каляровых металаў, знойдзеных падчас даследаванняў дадзенага комплексу. Так, у выніку вывучэння элементнага складу 13 абразцоў устаноўлена, што асноўнай сыравінай для вытворчасці з'яўляліся цынкаўтрымальныя сплавы, сярод якіх латуні (9 экз., 69% выбаркі) і шматкампанентныя латуні (2 экз., 15% выбаркі). Медна-цынкавыя сплавы вызначаюцца істотнымі канцэнтрацыямі цынка, якія дасягаюць 25%. Акрамя таго, падчас даследаванняў былі выяўлены таксама два артэфакты, зробленыя з "чыстай" медзі, якія характарызуюцца высокім працэнтам утрымання Cu – звыш 98%.

***Вытворчыя ювелірныя комплексы на тэрыторыі гандлёва-рамесніцкіх і сельскіх паселішчаў.*** У сувязі з абмежаванасцю ўскрытай археалагічнымі даследаваннямі плошчы на сельскіх паселішчах у межах Паўночнай і Цэнтральнай Беларусі, інфармацыя адносна распаўсюджанасці каляровай металаапрацоўкі на дадзенай катэгорыі помнікаў носіць адрывачны характар. На сённяшні дзень дакладна не лакалізавана вытворчых комплексаў, якія б адпавядалі ўсім неабходным крытэрыям, што дазвалялі б безумоўна звязаць пэўны аб'ект з апрацоўкай каляровых металаў. Сярод апублікаваных матэрыялаў да катэгорыі *вытворчых ювелірных комплексаў* магчыма з пэўнай верагоднасцю аднесці знаходку аднаго аб'екта на тэрыторыі гандлёва-рамесніцкага паселішча Кардон. Помнік быў выяўлены ў 2015 г. экспедыцыяй Інстытута гісторыі НАН Беларусі паміж сучаснымі вёскамі Кардон і Ілава Шумілінскага раёна [31, с. 87–88].

Асноўная маса археалагічных знаходак, выяўленых на помніку, датуецца IX–XI стст. Аб'ект, які магчыма лічыць вытворчым комплексам па апрацоўцы каляровых металаў, знойдзены падчас раскопак 2016 г. на тэрыторыі Селішча-1, якое размяшчаецца каля ўсходняга схілу гарадзішча (раскоп 1). У ходзе працы сляды вытворчай дзейнасці былі выяўлены ў межах аб'екта 2, які ўяўляе сабой сляды канструкцыі ў выглядзе мацерыковай ямы ў форме авала з размытымі абрысамі (5,0 × 4,0 × 0,3 м). Сярод запаўнення аб'екта неабходна адзначыць скапленне камянёў у верхняй яго частцы, запоўненых вуглістым суглінкам з уключэннямі попелу, што дазваляе разглядаць указаную канструкцыю як рэшткі печы ці вогнішча. У межах аб'екта былі знойдзены фрагменты кругладонных цыліндрычных тыгляў-стаканаў, глінянае праселка, а таксама фрагменты ганчарнага посуду. Аўтар раскопак, С.Д. Дзярновіч, мяркуе, што аб'ект 2 маркіруе рэшткі бронзаліцейнай майстэрні. Неабходна таксама адзначыць, што ў раскопе 1 былі выяўлены 2 фрагментаваныя пінцэты, якія магчыма звязаць з існаваўшым у канцы X – пачатку XI стст. вытворчым комплексам па апрацоўцы каляровых металаў [32, с. 132–133].

Для ўстанаўлення адметнасцей мясцовай каляровай металаапрацоўкі намі быў даследаваны хімічны склад 115 абразцоў, якія былі выяўлены падчас археалагічных даследаванняў на тэрыторыі гандлёва-рамесніцкага паселішча Кардон [33, с. 300–301]. У выніку ўстаноўлена, што найбольшае распаўсюджванне на тэрыторыі помніка атрымалі медна-цынкавыя сплавы, перш за ўсё, свінцовыя і шматкампанентныя латуні. Высокае ўтрыманне лятучага цынку ў вырабах са шматкампанентнага сплава сведчыць аб наяўнасці ў мясцовых рамеснікаў непасрэднага доступу да "свежага" металу. Сыравіна ў майстэрні паступала не толькі ў выглядзе металічнага лома, але і ў злітках, пра што сведчыць наяўнасць у выбарцы падобнага вырабу са шматкампанентнай латуні. Важнай адметнай рысай медна-цынкавых сплаваў з Кардона з'яўляецца перавага абразцоў з высокім утрыманнем свінцу. Устаноўлена таксама, што істотную ролю ў каляровай металаапрацоўцы на тэрыторыі помніка займалі бронзы, агульная доля якіх у выбарцы складае 21,4%. Сярод абразцоў найбольшай колькасцю прадстаўлены свінцовыя бронзы, якія адрозніваюцца высокімі канцэнтрацыямі свінцу. Таксама важна адзначыць наяўнасць вырабаў з "чыстай" медзі (11% выбаркі) і прадметаў са сплаваў на аснове волава і свінцу (16% выбаркі).

Такім чынам, магчыма зрабіць наступныя высновы адносна існавання вытворчых ювелірных комплексаў на тэрыторыі Паўночнай і Цэнтральнай Беларусі ў X–XVIII стст.

1. Асноўнымі цэнтрамі вырабу прадукцыі ювелірнага рамяства ў X–XVIII стст. на тэрыторыі Паўночнай і Цэнтральнай Беларусі з'яўляліся гарадскія вытворчыя комплексы па апрацоўцы каляровых металаў. У межах гарадоў рэгіёна зафіксавана адзінаццаць асобных майстэрняў, якія ў асноўным звязаныя з інтэнсіўным ростам ювелірнай вытворчасці ў XII–XIII стст. і адлюстроўваюць арыентацыю мясцовага рамяства на выраб масавай прадукцыі стандартызаванага выгляду. Галоўным цэнтрам вытворчасці па апрацоўцы каляровых металаў з'яўляўся Полацк, дзе археалагічна было зафіксавана сем розначасовых майстэрняў X–XVIII стст. На тэрыторыі сельскіх паселішчаў апрацоўка каляровых металаў магла існаваць у якасці самастойнага віду рамеснай дзейнасці толькі у межах гандлёва-рамесніцкіх паселішчаў X–XI стст. (Кардон), дзе зафіксавана прысутнасць паўночнаеўрапейскага кампаненту, які, верагодна, і быў носьбітам рамесных традыцый звязаных з каляровай металаапрацоўкай. На іншых сельскіх паселішчах ювелірная вытворчасць не з'ўлялася асобным відам рамеснай дзейнасці і насіла эпізадычны характар, а датаванне сведчанняў вытворчай дзейнасці не выходзіць за межы XIII ст.

2. Вытворчыя комплексы па апрацоўцы каляровых металаў X–XVIII стст. з тэрыторыі Паўночнай і Цэнтральнай Беларусі магчыма аднесці да некалькіх храналагічных груп: X–XI стст. (3 комплексы), XII–XIII стст. (8 комплексаў) і XVII–XVIII стст. (1 комплекс).

Для найбольш ранніх майстэрняў X–XI стст. характэрна выкарыстанне ліцця ў якасці асноўнай тэхналагічнай аперацыі. Адліўкі праводзіліся ў металічныя ліцейныя формы, а таксама ў аднаразавыя прыстасаванні, зробленыя па выплаўляемых мадэлях. Ліцейныя аперацыі ажыццяўляліся ў печах-каменках, абмазаных глінай. Высокія тэмпературы ў такіх канструкцыях падтрымліваліся дзякуючы горнам, соплы якіх рабіліся з матэрыялу, блізкага да глінянага цеста тыгляў. Сыравінай для вытворчасці з'яўляліся манетныя медзь і серабро, а таксама металічны лом і зліткі металу. Дадаткова ў майстэрнях апрацоўваўся бурштын.

Галоўнай тэхналагічнай аперацыяй у майстэрнях XII–XIII стст. таксама з'яўлялася ліццё ў каменныя ліцейныя формы з дапамогай тыгляў і льячак. Плаўка металаў ажыццяўлялася па-за межамі пабудоў на адкрытых вогнішчах ці ў адмысловых печах-горнах. Набор інструментаў і пераважнае выкарыстанне легкаплаўкай сыравіны ўказвае на арыентацыю рамеснікаў на масавую вытворчасць стандартызаваных рэчаў масавага попыту.

Асноўнымі тэхналагічнымі аперацыямі ў майстроў XVII–XVIII стст. з'яўлялася ліццё, коўка і валачэнне, што пацвярджаецца знаходкамі спецыялізаваных інструментаў і прыстасаванняў, а таксама слядамі на гатовых прадметах. Адліўкі ажыццяўляліся з дапамогай тыгляў у формы. Верагодна, найбольшае распаўсюджанне атрымала ліццё па васковым мадэлям са стратай формы, а таксама ў аднабаковыя гліняныя формы. Апрацоўка каляровых металаў у XVII–XVIII стст. вызначаецца істотнай спецыялізацыяй і вузкапрофільнасцю, што знайшло адлюстраванне ў асартыментным складзе прадукцыі, выкарыстоўваемай сыравіне і тэхналагічных прыёмах яе апрацоўкі.

3. Адлюстраваннем асноўных этапаў эвалюцыі вытворчай дзейнасці па апрацоўцы каляровых металаў трэба лічыць адметнасці выкарыстання ў вытворчасці металічнай сыравіны і інструментаў яе апрацоўкі. У межах майстэрняў, а таксама сярод слядоў вытворчай дзейнасці ў X–XI стст. пераважаюць свінцовыя і шматкампанентныя латуні са значным утрыманнем цынку. Для вытворчых комплексаў XII–XIII стст. характэрным з'яўляецца пераважнае выкарыстанне алавяна-свінцовых бронз, а таксама алавяна-свінцовых сплаваў і нелегіраваных легкаплаўкіх металаў. Дадзеная тэндэнцыя характэрная для гарадской вытворчасці, у той час як сярод прадметаў з сельскіх паселішчаў пераважаюць складаныя шматкампанентныя сплавы, якія з'яўляліся вынікам шматразовых пераплавак зыходнай сыравіны і ўказваюць на абмежаваны доступ мясцовых рамеснікаў да крыніц "свежага" металу. Неабходна таксама адзначыць, што асобныя комплексы XII ст. (майстэрня з заходняй часткі Запалоцкага пасада Полацка) магчыма разглядаць у якасці пераходных, дзе ў роўных далях ужываліся як медна-цынкавыя, так бронзавыя і легкаплаўкія сплавы. Вытворчасць па апрацоўцы каляровых металаў XVII–XVIII стст. характарызуецца пераважным выкарыстаннем якасных высокацынкавых латунных сплаваў, якія давалі магчымасць рабіць якасныя прадметы з выдатнымі фізіка-хімічнымі ўласцівасцямі, што было асабліва неабходным ва ўмовах вузкай спецыялізацыі вытворчасці і вырабу стандартызаваных прадметаў утылітарнага прызначэння.

## ЛІТАРАТУРА


1. Зайцева И.Е. Производственные ювелирные комплексы Серенского детинца и их место в системе застройки (XII–XV вв.) // Труды VI Междунар. конгресса славян. археологии. – М., 1998. – Т. 2: Славянский средневековый город. – С. 100–113.
2. Гупало К.Н., Ивакин Г.Ю. О ремесленном производстве на Киевском Подоле // Советская археология. – 1980. – № 2. – С. 203–219.
3. Коваленко В.П. Майстерня ювеліра XIII ст. на дитинці Любеча // Старожитності Русі-Украіны. – Київ, 1994. – С. 21–32.
4. Ениосова Н.В., Жаров Ю.Э. Ювелирный производственный комплекс из "Ветчаного города" домонгольского Владимира // Российская археология. – 2006. – № 2. – С. 64–80.
5. Сингх В.К. Производственные комплексы на усадьбах Славенского раскопа // Новгородские археологические чтения-3. – В. Новгород, 2011. – С. 233–242.
6. Магалінскі І.У. Вытворчыя ювелірныя комплексы старажытнага Полацка (X–XVII стст.) // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2011. – Вып. 21: Вывучэнне археалагічных помнікаў на тэрыторыі Полацкай зямлі (да 1150-годдзя Полацка). – С. 115–121.
7. Дук Д.У. Выратавальныя археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Вялікага пасада Полацка ў 2005 годзе // Веснік "ПДУ". Серыя А. Гуманітарныя навукі. – 2007. – № 1. – С. 5–23.
8. Дук Д.У. Полацк і палачане (IX–XVIII стст.). – Наваполацк: ПДУ, 2010. – 180 с.
9. Тарасаў С.В. Полацкая ювелірная вытворчасць // Археалогія Беларусі : энцыкл. У 2 т. / рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.). – Мінск, 2011. – Т. 2. – С. 205–206.
10. Тарасаў С.В. Сядзіба полацкіх ювеліраў XII–XIII стст. // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі. Матэрыялы IV Міжнар. навук. канф. / Уклад. Т.А. Джумантаева. – Полацк, 2003. – С. 267–272.
11. Коц А.Л. Ювелірная майстэрня XII стагоддзя на запалоцкім пасадзе старажытнага Полацка (па матэрыялах археалагічных раскопак 2013 года) // Вестник Полоцкого государственного университета. Сер. А, Гуманитарные науки. – 2015. – № 1. – С. 18–26.
12. Бубенько Т.С. Средневековый Витебск: Посад – Нижний замок (X – первая половина XIV в.). – Витебск: ВГУ им. П.М. Машерова, 2004. – 276 с.
13. Загорульский Э.М. Возникновение Минска. – Минск: БГУ им. В.И. Ленина, 1982. – 358 с.
14. Штыхов Г.В. Древний Полоцк IX–XIII вв. – Минск: Наука и техника, 1975. – 136 с.
15. Магалинский И.В. Обработка черных и цветных металлов (раздел IV, 12.1) / И.В. Магалинский // Друцк. Друцк и Друцкая волость (княжество) в IX–XII вв. Летопись древних слоев. Князья Друцкие и их владения в XIII–XVIII вв. Ремесло, промыслы, торговля (по данным археологии, нумизматики, письменных источников). Памятники архитектуры и объекты туризма / Науч. ред. О.Н. Левко. – Минск: Белар. навука, 2014. – С. 363–374.

16. Коц А.Л., Магалинский И.В. Предварительные итоги археологических исследований на территории Нижнего замка города Полоцка в 2023–2024 годах // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск: Белар. навука, 2025. – Вып. 35. – С. 207–214.
17. Petersen J. Vikingetidens smykker. – Stavanger.: Dreyers grafiske anstalt, 1928. – 222 p.
18. Ениосова Н.В. Литейные формы Гнёздова // Историческая археология. Традиции и перспективы (к 80-летию со дня рождения Даниила Антоновича Авдусина). – М., 1998. – С. 67–81.
19. Горюнова В.М. Новое в исследовании «Городка» на Ловати // Краткие сообщения Института Археологии. – М., 1974. – Вып. 139. – С. 74–80.
20. Хвощинская Н.В. Бронзолитейное производство Рюрикова городища в IX–X вв. // Труды Института истории материальной культуры. – СПб., 2007. – Т. XXIV : Северная Русь и народы Балтики. – С. 123–141.
21. Гуревич Ф.Д. Ювелиры древнего Новогрудка // Краткие сообщения Института археологии. – М., 1967. – Вып. 110. – С. 14–20.
22. Вынікі даследавання хімічнага складу вырабаў з каляровых металаў з ювелірнай майстэрні XII ст. на тэрыторыі Запалоцкага пасада Полацка / І.У. Магалінскі, М.В. Бялькоў, А.У. Шабуня-Клячкоўская і інш. // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. навук. арт. III міжнар. навук.-практ. канф., Полацк, 14–15 крас. 2016 г. : у 2 ч. / Полацкі дзярж. ун-т ; пад агул. рэд.: Д.У. Дука, У.А. Лобача, А.І. Корсак. – Наваполацк: ПДУ, 2016. – Ч. 1. – С. 98–100.
23. Тарасенко В.Р., Штыхов Г.В. Отчёт о раскопках Полоцкого отряда белорусской археологической экспедиции в 1962 г. // ААНД ДНУ "Інстытут гісторыі" НАН Беларусі. – № 130.
24. Зайцева И.Е., Сарачева Т.Г. Ювелирное дело "Земли вятичей" во второй половине XI – XIII в. – М.: Индрик, 2011. – 404 с.
25. Магалінскі І.У. Хімічны склад вырабаў з каляровых металаў X – XIII стст. з тэрыторыі Паўночнай і Цэнтральнай Беларусі // Вестник Полоцкого государственного университета. Сер. А, Гуманитарные науки. – 2022. – № 1. – С. 2–7.
26. Гуревич Ф.Д. Древний Новогрудок (посад – окольный город). – Л.: Наука, 1981. – 160 с.
27. Рындина Н.В. Технология производства новгородских ювелиров X–XV вв. // Материалы и исследования по археологии СССР. – М., 1963. – № 117: Труды новгородской археологической экспедиции. Т. 3.– С. 200–247.
28. Дук Д.У. Полацк XVI–XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада. – Наваполацк: ПДУ, 2007. – 268 с.
29. Персов Н.Е., Сарачева Т.Г., Солдатенкова В.В. Археологические свидетельства обработки цветных и драгоценных металлов на тверском Затьмачье в эпоху Средневековья // Археология Подмосковья: Материалы науч. семинара. – М., 2011. – Вып. 7. – С. 155–167.
30. Персов Н.Е., Сарачева Т.Г., Солдатенкова В.В. Средневековые ювелирные комплексы бывшего Затьмацкого посада г. Твери (по материалам раскопок 2001–2006 гг.) // Археология Подмосковья: Материалы науч. семинара. – М., 2009. – Вып. 5. – С. 268–280.
31. Левко О.Н. Кордон – ключевой объект предгосударственной истории Белорусского Подвинья // Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі: Шумілінскі край: зб. навук. арт. / Нац, акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; рэдкал.: В.В. Даніловіч [і інш.]; навук. рэд. В.М. Ляўко. – Мінск: Белар. навука, 2018. – С. 87–103.
32. Дернович С.Д. Материалы селища-1 археологического комплекса Кордон в контексте исследований 2016 г. // Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі: Шумілінскі край: зб. навук. арт. / Нац, акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; рэдкал.: В.В. Даніловіч [і інш.]; навук. рэд. В.М. Ляўко. – Мінск: Белар. навука, 2018. – С. 127–147.
33. Магалинский И.В. Химический состав изделий из цветного металла X–XI вв. из материалов исследований на территории археологического комплекса Кордон // Археология и история Пскова и Псковской земли: Ежегодник Семинара им. акад. В.В. Седова. – М., Псков: ИА РАН, 2021. – Вып. 36. Материалы 66-го заседания (2021 г.). – С. 300–310.

*Паступіў 20.11.2025*

# ПРОИЗВОДСТВЕННЫЕ КОМПЛЕКСЫ ПО ОБРАБОТКЕ ЦВЕТНЫХ МЕТАЛЛОВ X–XVIII ВВ. С ТЕРРИТОРИИ СЕВЕРНОЙ И ЦЕНТРАЛЬНОЙ БЕЛАРУСИ

***канд. ист. наук, доц. И.В. МАГАЛИНСКИЙ***
***(Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой)***

*В статье представлены результаты обобщающего исследования производственных комплексов цветных металлов X–XVIII вв. с территории Северной и Центральной Беларуси. Автор приходит к заключению, что основными центрами производства продукции ювелирного ремесла в X–XVIII вв. в регионе являлись городские мастерские (Полоцк, Витебск, Минск, Друцк). Отмечается, что на территории сельских поселений обработка цветных металлов могла существовать в качестве самостоятельного вида ремесленной деятельности только в границах торгово-ремесленных поселений X–XI вв. (Кардон). Автором установлено также, что производственные комплексы по обработке цветных металлов X–XVIII вв. с территории Северной и Центральной Беларуси относятся к нескольким хронологическим группам: X–XI вв. (3 комплекса), XII–XIII вв. (8 комплексов) и XVII–XVIII вв. (1 комплекс), которые отличаются особенностями технологических операций, инструментами и приспособлениями, а также химическим составом сырьевого металла.*

***Ключевые слова:*** *археология Беларуси, история древней технологии, ювелирное ремесло, археометаллургия.*

**PRODUCTION COMPLEXES FOR PROCESSING NON-FERROUS METALS OF THE 10TH – 16TH CENTURIES FROM THE TERRITORY OF NORTHERN AND CENTRAL BELARUS**

***I. MAHALINSKI***
***(Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk)***

*The article presents the results of a general study of production complexes for the processing of non-ferrous metals of the 10th-16th centuries from the territory of Northern and Central Belarus. The author concludes that the main centers of production of jewelry crafts in the 10th-17th centuries in the region were urban production jewelry complexes (Polotsk, Vitebsk, Minsk, Drutsk). It is noted that in rural settlements, the processing of non-ferrous metals could exist as an independent type of craft activity only within the framework of trade and craft settlements of the 10th-11th centuries (Kardon). The author also established that the production complexes for the processing of non-ferrous metals of the 10th-17th centuries from the territory of Northern and Central Belarus belong to several chronological groups: 10th-11th centuries (3 complexes), 12th-13th centuries (8 complexes) and 17th-16th centuries (1 complex), which differ in the features of technological operations, tools and devices, as well as the chemical composition of the raw materials used.*

***Keywords:*** *archeology of Belarus, history of ancient technology, jewelry craft, archaemetallurgy.*

**УДК 904(476)** **DOI 10.52928/2070-1608-2026-77-1-10-13**

# ЗНАХОДКІ ПЛІНФЫ НА ТЭРЫТОРЫІ ПОЛАЦКА

***А.Л. КОЦ***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай)***

*У артыкуле прадстаўлены аналіз археалагічных даследаванняў, падчас якіх быў зафіксаваны будаўнічы матэрыял у слядах разбурэння помнікаў мураванага дойлідства, комплексы гаспадарчага прызначэння, зробленыя з плінфы ці з выкарыстаннем плінфы, месцы канцэнтрацыі знаходак старажытнай цэглы і інш. Усе знаходкі непарыўна звязаны з помнікамі мураванага дойлідства XI–XII стст. на тэрыторыі Полацка. Аўтарам абагулены ўсе вядомыя матэрыялы, якія датычацца масавых знаходак будаўнічага матэрыялу, у першую чаргу, плінфы. Галоўным чынам звяртаецца ўвага на месцы, дзе не былі зафіксаваны рэшткі мураваных аб'ектаў, а знаходкі будаўнічага матэрыялу адрасуюць да падобных комплексаў. Зроблены папярэднія высновы аб размяшчэнні новых помнікаў архітэктуры. Даследчыкам прапанаваны перспектыўныя месцы для правядзення археалагічных даследаванняў, дзе можна выявіць новыя аб'екты дойлідства XI–XII стст. Аналіз знаходак плінфы дазваляе больш шырока раскрыць патэнцыял полацкага мураванага дойлідства.*

***Ключавыя словы:*** *археалогія Беларусі, мураваныя помнікі, храм, царква, пляма разбурэння, будаўнічыя матэрыялы, плінфа, тапаграфія Полацка.*

**Уводзіны.** Знаходкі плінфы і іншых будаўнічых матэрыялаў мураваных помнікаў у старажытнарускіх гарадах у пластах Ранняга Сярэднявечча з'яўляюцца даволі значнымі. Яны адрасуюць даследчыкаў адразу да існавання ў горадзе, найперш, каменных цэркваў або іншых будынкаў, што адразу паказальна для статуса горада, які меў значныя эканамічныя магчымасці. Для X–XI стст. такіх гарадоў няшмат, але ў XII – першай палове XIII ст. іх колькасць значна павялічваецца. У цэнтрах, дзе фарміруюцца ўласныя архітэктурныя традыцыі, цэркваў магло быць больш за дзясятак. Да знаходак будаўнічага матэрыялу варта адносіць плінфу, будаўнічы камень (ці блокі), вапнавую рошчыну, як правіла, з дабаўкай бітай цэглы (цамянку), а таксама фрагменты тынкоўкі (у тым ліку з фрэскавым жывапісам), пліткі падлогі, смальту, фрагменты ці цэлыя лісты свінцовага пакрыцця даху і інш. Безумоўна, большасць дадзеных артэфактаў знаходзяцца ў непасрэднай блізасці да таго ці іншага храма, які зараз разбураны або значна перабудаваны.

У Полацку захаваўся толькі адзін помнік старажытнарускага дойлідства – Спаса-Праабражэнскі храм Спаса-Еўфрасінеўскага манастыра, і той значна пацярпеў напрацягу свайго існавання. Іншыя храмы цалкам разбураны або моцна перабудаваны, як Сафійскі сабор. Далей мы не будзем спыняцца на характарыстыцы слядоў разбурэння і будаўнічым матэрыяле ўжо вядомых помнікаў мураванага дойлідства, якіх на сённяшні дзень зафіксавана не менш 11 (10 храмаў і церам), а звернемся да матэрыялаў мала вядомых. Яны з'яўляюцца сведчаннем іншых архітэктурных аб'ектаў і дазваляюць нам больш шырока раскрыць патэнцыял полацкага мураванага дойлідства.

**Асноўная частка.** У апошняе дзесяцігоддзе ў Полацку значна пашырыліся даследаванні помнікаў архітэктуры XI–XII стст. Гэта звязана з буйнамаштабнымі працамі ў цэнтры горада (рэканструкцыя карпусоў былой бальніцы на Верхнім замку, замена і пракладка новых камунікацый, узвядзенне новых будынкаў і інш.), з рэстаўрацыйнымі працамі Спаса-Праабражэнскага храма і іншай дзейнасцю Спаса-Еўфрасінеўскага манастыра, мэтанакіраванымі даследаваннямі (вывучэнне храмаў Бельчыцкага манастыра, абследаванне Сафійскага сабора і інш.). Разам з гэтым праводзіцца і больш дэтальны аналіз будаўнічых матэрыялаў. Адкрыцці дазваляюць выяўляць новыя дэталі архітэктурных традыцый Полацка. Рознабаковае вывучэнне будаўнічых матэрыялаў, у тым ліку з раскопак папярэднікаў, дазваляе нам меркаваць аб размяшчэнні на тэрыторыі Полацка невядомых на сённяшні дзень помнікаў архітэктуры старажытнарускага часу.

Падчас археалагічных даследаванняў на Верхнім замку ў 2019–2022 гг. была сабрана багатая калекцыя археалагічных артэфактаў з розных помнікаў архітэктуры XI–XII стст.: з Сафійскага сабора, храма на дзядзінцы, храма пры могілках, з царквы ля Чырвонай бальніцы, знаходкі з плямы будаўнічага смецця ў прыватным сектары, з Княжаскага церама [7], плінфа з раскопа 5У [6, с. 147]. Аналіз асноўнага будаўнічага матэрыялу – плінфы – дазваляе выказаць меркаванне аб размяшчэнні невядомых дагэтуль помнікаў архітэктуры. Так, былі вызначаны тры плямы разбурэння, якія належаць асобным помнікам мураванага дойлідства[1]. Адно з іх – гэта пляцоўка каля гарадскіх могілак XI–XIII стст. на Верхнім замку. Па знешнім характары і параметрычных даных плінфа з дадзенага месца вельмі падобная на цэглу з храма на дзядзінцы, але аддаленасць аб'ектаў, лакалізацыя побач з могілкамі і іншыя дэталі дазваляюць меркаваць, што гэта розныя пабудовы. Пляма са слоем разбурэння магутнасцю 0,3–0,5 м была зафіксавана побач з Чырвонай бальніцай. Плінфа мае адрозненне па параметрычных даных у параўнанні з іншымі знаходкамі на Верхнім замку. Па наяўнасці фрагментаў фрэсак у пласце вапны мы можам выказаць думку, што на дадзеным месцы знаходзілася менавіта старажытная царква. Невялікая пляма вапны з

[1] Апісанне дадзеных аб'ектаў ужо было прадстаўлена ў асобнай публікацыі [7], таму ў дадзеным матэрыяле не будзем падрабязна спыняцца на азначаным пытанні.

кавалкамі плінфы была зафіксавана ў межах сучаснага прыватнага сектара на Верхнім замку, але вызначаць яе як след асобнага помніка не мэтазгодна. Дадзенае месца з'яўляецца перспектыўным для далейшага археалагічнага вывучэння старажытнай архітэктуры.

**Заключение**. Формирование представлений о рациональном природопользовании на белорусских землях происходило с использованием нескольких источников знания. Народная традиция содержала эмпирические знания о свойствах почв, циклах урожайности, погодных явлениях. Данные знания, фиксировавшиеся, как правило, в народных приметах, составляли базовый уровень понимания природных закономерностей также и в среде помещиков. Однако в публицистике XIX – начала XX в. отношение к народным знаниям было амбивалентным: признавалась их ценность как опыта многих поколений, но подчеркивалась их недостаточность для ведения эффективного хозяйства. Научная теория, прежде всего концепция рационального хозяйствования Альбрехта Тэера и его последователей, стала ключевым идейным ресурсом для формирования представления помещиков об эффективном хозяйстве. Подразумевалось, что подобное хозяйство основывается на научных принципах, практикует многопольный севооборот и травосеяние с учетом локальных природных особенностей. Зарубежный опыт – прежде всего практики передовых хозяйств Германии, Англии, отчасти Польши – активно транслировался через публицистику как образец для подражания. Вместе с тем, значительная часть публицистов осознавали различия в условиях хозяйствования (климат, качество почв, уровень развития инфраструктуры, доступность капитала и квалифицированной рабочей силы), и необходимость критического отношения к возможности прямого переноса западных практик.

Каналы распространения знаний о рациональном природопользовании включали экономическую периодику, деятельность сельскохозяйственных обществ, опытных станций и образцовых хозяйств. Особую роль играли статистические обзоры губерний и уездов, которые формировали определенный способ оценки природных ресурсов и потенциала их рационального использования, а также описания имеющихся проблем.

Оценка состояния природных ресурсов белорусских земель в XIX – начале XX в. носила преимущественно критический характер. Публицисты констатировали низкое качество значительной части почв, их подверженность заболачиванию, нехватку удобрений, деградацию в некоторых регионах лесных ресурсов. Классификация земель строилась на сочетании народных представлений и формирующихся научных подходов. Детально описывались региональные различия, что послужило основанием для вывода о необходимости адаптации агротехнических приемов к местным условиям.

В публицистике акцентировалась проблемность существующей на белорусских землях ситуации в сельском хозяйстве. Объяснение истоков аграрных проблем было достаточно сбалансированное: назывались неблагоприятные природно-климатические условия (короткий вегетационный период, нестабильность погоды), традиционные экстенсивные методы ведения хозяйства (трехполье без достаточного удобрения, отсутствие севооборотов с травосеянием), социально-экономические факторы (недостаток капитала для инвестиций в улучшение хозяйства, отсутствие квалифицированных специалистов, пережитки крепостнических отношений). Публицисты анализировали циклы неурожаев, указывали на истощение почв в результате хищнического использования, деградацию лесных ресурсов вследствие бесконтрольной вырубки, заболачивание территорий из-за отсутствия дренажных систем. «Человеческий фактор» указывался как одна из основных причин хозяйственного неблагополучия. Современники осознавали несовершенство методов учета урожая, разночтения в оценках плодородия земель, сознательное искажение данных помещиками в целях получения налоговых льгот и государственных субсидий в неурожайные годы. Эти недостатки осложняли выработку эффективных мер по рационализации природопользования.

Предлагался широкий спектр практических решений: внедрение многопольных севооборотов с травосеянием, систематическое использование удобрений, мелиорацию заболоченных земель, рациональное лесопользование, применение улучшенных пород скота и сортов культурных растений, использование сельскохозяйственных машин. Данные меры обосновывались не только с точки зрения повышения текущей продуктивности хозяйств, но и с позиции долгосрочного сохранения производительной способности природной среды.

Вместе с тем существовал разрыв между теоретическими представлениями о необходимости рационализации и реальными практиками большинства помещичьих хозяйств. Препятствиями широкому внедрению рациональных практик выступали: экономические факторы (отсутствие достаточного капитала для инвестиций, высокая стоимость сельскохозяйственных машин и отсутствие навыков их эксплуатации, долгий срок окупаемости мелиоративных работ), институциональные ограничения (несовершенство кредитной системы, слабость агрономической службы), социокультурные барьеры (консерватизм части помещиков, недостаток квалификации, недоверие к научным новшествам). Публицисты констатировали, что передовые практики внедряются лишь в ограниченном числе крупных имений.

Таким образом, проведенное исследование демонстрирует, что в аграрной публицистике на белорусских землях в XIX – начале XX в. происходил процесс концептуализации рационального природопользования. Утверждался приоритет научного знания над традиционным опытом. Рациональность понималась как соответствие практики научным принципам, калькулируемость результатов. Публицисты подчеркивали необходимость учета местных природно-климатических условий. Природа воспринималась через призму хозяйственной полезности. Формировалось представление об ответственности землевладельца за сохранение производительной способности земли. Это еще не была полноценная экологическая этика, но в публицистике присутствовали мотивы критики хищнического отношения к природным ресурсам. Было также выявлено противоречие между знанием о рациональных практиках и их ограниченным внедрением в среде помещиков.

ЛИТЕРАТУРА


1. Каханоўскі А.Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.). – Мінск: БДУ, 2013. – 335 с.
2. Носевич В.Л. Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе. – Минск: Тэхналогія, 2004. – 350 с.
3. Токць С.М. Сацыяльныя і культурныя працэсы ў беларускай вёсцы ў другой палове XIX – пачатку XX ст. – Мінск: ДІКСТ БДУ, 2016. – 328 с.
4. Шумскі К.А. Традыцыйныя экалагічныя веды беларусаў у XIX ст. – пачатку XXI ст. – Мінск: БДАТУ, 2011. – 192 с.
5. Шыдлоўскі С.А. Памеснае дваранства Беларусі: канец XVIII – пачатак XX ст.: этналагічнае даследаванне. – Мінск: Белар. навука, 2022. – 221 с.
6. Тэер А.Д. Основания рационального сельского хозяйства / пер. С.А. Маслова. – Ч. 1–5. – М.: А. Ширяев, 1830–1835.
7. Бакарягин С.С. А. А. Фет и А. Н. Энгельгардт: два взгляда на рациональное хозяйство // История и археология: материалы V Междунар. науч. конф. (г. Краснодар, февраль 2018 г.). – Краснодар: Новация, 2018. – С. 13–15. – URL: https://moluch.ru/conf/hist/archive/290/13596/.
8. Gospodyni litewska czyli nauka utrzymywania porządnie domu i zaopatrzenie go we wszystkie przyprawy: zapasy kuchenne, apteczkowe i gospodarskie, tudzież hodowania i utrzymywania bydła, ptastwa i innych żywiołów, według sposobów wyprobowańszych i najdoświadczeńszych, a razem najtańszych i najprostszych. – 4 wyd. – Wilno: Drukiem J. Zawadzkiego, 1848. – 449 s.
9. Масальский Ф. Пан Подстолич, или Что мы теперь и чем быть можем: Роман административный. – 2-е изд. – Ч. 1–5 – СПб.: тип. К. Крайя, 1834.
10. Massalski E.T. Pan Podstolic, albo, Czém jesteśmy, czém być możemy: romans administracijny: W 5 częściach. Część 4. – SPb: W Drukarni K. Kraja, 1833. – 286 s.
11. Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях // Выбраныя творы / укл., пер. з пол. М. Хаўстовіча. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1998. – С. 81−282.
12. Шыдлоўскі С.А. Сістэма рацыянальнага гаспадарання ў рабоце Ганны Цюндзявіцкай «Літоўская гаспадыня» / С.А. Шыдлоўскі // Вестник Полоцкого государственного университета. Сер. А, Гуманитарные науки. – 2013. – № 9. – С. 2–6.
13. Karpiński F. Pamiętniki. – Poznań: W. Simon, 1884. – 178 s.
14. Kontrym K. Podróż Kontryma, urzędnika banku polskiego odbyta w roku 1829 po Polesiu / Wydana przez Edwarda Raczyńskiego. – Poznań: U Walentego Stefańskiego, 1839. – 72 s.
15. Gorczynska M. Popularyzacja wiedzy w polskich kalendarzach okresu Oswiecenia, 1737–1821. – Lublin: Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, 1999. – 321 s.
16. Шидловский С.О. Информационное обеспечение инновационных процессов в белорусском помещичьем хозяйстве (вторая половина XVIII – начало XX в.) // Новые коммуникативные технологии и современное белорусское общество: электрон. сб. ст. III Междунар. науч. конф, Новополоцк, 27–28 апр. 2023 г., / Полоц. гос. ун-т; под общ. ред. С.О. Шидловского. – Новополоцк: Полоц. гос. ун-т им. Евфросинии Полоцкой, 2023. – 1 электрон. опт. диск (CD-R). – С. 72–76.
17. Целлинский Б.А. Агрономические путешествия по России // Журнал Министерства государственных имуществ. – 1846. – Ч. 20. – № 7. – С. 48–70.
18. Lachnicki I.E. Statystyka gubernii litewsko grodzieńskiej. – Wilno: Nakład i druk J. Zawadzki, 1817. – X, [2], 88 s.
19. Tyszkiewicz E. Opisanie powiatu borysowskiego pod względem statystycznym, geognostycznym, historycznym, gospodarczym, przemysłowo-handlowym i lekarskim, z dodaniem wiadomości: o obyczajach, spiewach, przysłowiach i ubiorach ludu, gusłach, zabobonach itd. – Wilno: Druk. A. Marcinowskiego, 1847. – 489, IV s.
20. Бобровский П.О. Физические и нравственные элементы северо-западных губерний России // Вестник Западной России. – Вильно. – 1865. – Г. IV. – Кн. III. – Ч. 3. – С. 37–64.
21. Лапа В.В. Плодородие почв Республики Беларусь, проблемы и перспективы // Почвоведение и агрохимия. – 2010 – № 1. – С. 7.
22. Севергин В.М. Продолжение записок путешествия по западным провинциям Российского государства, или Минералогические, технологіческие и другие примечания, учинённые во время проезда через оные в 1803 году... – СПб.: Тип. Императорской Академии наук, 1804. – 168 с.
23. Tyszkiewicz K. Wilija i jej brzegi: pod względem hydrograficznym, historycznym, archeologicznym i etnograficznym. – Drezno: drukiem i nakładem Józefa I. Kraszewskiego, 1871. – XVI, 362 s.
24. Винокуров В.Н. Исследование засоренности почв каменистыми включениями и влияния их на поломки плужных лемехов // Лесной вестник. – № 3(86). – 2012. – С. 49–52.
25. Аникиевич К.Т. Сенненский уезд Могилёвской губернии: опыт описания в географическом, историческом, этнографическом, бытовом, промышленном и статистическом отношениях, с картой уезда, схемой двух озёр и рисунками в тексте. – Могилёв: Губ. тип., 1907. – 149 с.
26. Kraszewski J.I. Wspomnienia Polesia, Wołynia i Litwy. – Paryż: Nakładem J. K. Wilczynskiego, 1860. – 144 s.
27. Копытовских А.В., Коржич В.П. Исследование циклов урожайности зерновых культур // Модельные программы реструктуризации и реформирования экономики: материалы 3-й междунар. науч. конф., Минск, 23–25 июня 2005 г.: в 2 ч. – Минск: БГАТУ, 2005. – Ч. 1. – С. 177–183.
28. Опыт описания Могилёвской Губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях: в 3 кн. – Кн. 1 / Под ред. А.С. Дембовецкого. – Могилёв: Тип. губ. прав-я, 1882. – [6], 782, [2] с.
29. Massalski E.T. Pan Podstolic, albo, Czém jesteśmy, czém być możemy: romans administracijny: W 5 częściach. Część 2. – Wilno: W Drukarni A. Marcinkowskiego, 1831. – 268 s.
30. Бобровский, П. О. Физические и нравственные элементы северо-западных губерний России // Вестник Западной России. – Вильно. – 1865. – Г. IV. – Кн. IV. – Ч. 3. – С. 1–17.
31. Севергин В.М. Записки путешествия по западным провинциям Российского государства, или Минералогические, хозяйственные и другие примечания, учинённые во время проезда через оные в 1802 году... – СПб.: Тип. Императорской Академии наук, 1803. – 225 с.

32. Булгак Я. Край дзіцячых гадоў / пер. з пол. мовы Т.Г. Вяршыцкай. – Мінск: Беларусь, 2004. – 415 с.
33. Gołębiowski Ł. Domy i dwory. – Warszawa: Druk. N. Gkücksberga, 1830. – [4], 296 s.
34. Gloger Z. Budownictwo drzewne i wyroby z drzewa w dawnej Polsce: w 2 t. – Warszawa: Druk Wl. Lazarskiego, 1907–1909. – T. 1. – 1907. – 383 s.
35. Gołębiowski Ł. Gry i zabawy różnych stanów w kraju całym, lub niektórych tylko prowincyach. – Warszawa: Druk N. Glücksberga, 1831. – 332 s.

*Поступила 30.10.2025*

## FORMATION OF IDEAS ABOUT RATIONAL USE OF NATURAL RESOURCES IN AGRICULTURAL JOURNALISM OF BELARUS OF THE 19TH – EARLY 20TH CENTURIES

***S. SHYDLOUSKI***
***(Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk)***

*The article examines the process of forming ideas about rational nature management in the Belarusian agrarian journalism of the XIX century – present XX century. Based on the analysis of economic and statistical surveys of the era under study, the main sources of landowners' knowledge about rational management have been identified: scientific theory (primarily the concept of Albrecht Thaer), foreign experience. It is shown how the state of the region's natural resources was analyzed in journalism, and a discourse was formed about problems with soil fertility, crop failures, and waterlogging of territories. Rationalization measures proposed by contemporaries are considered: multi-field crop rotations, land reclamation, and agrotechnical innovations. The economic and socio-cultural obstacles to the widespread introduction of rational practices are shown. The study demonstrates that the formation of the concept of rational use of natural resources has become an important part of the discourse of agrarian modernization on Belarusian lands, reflecting the contradiction between theoretical concepts and real practices in landlords.*

***Keywords:*** *rational nature management, agricultural journalism, landowner estates, Albrecht Thaer, rational agriculture, agricultural modernization, environmental history.*

**УДК 39.01(=161.3)+39.01(=172)](091)** **DOI 10.52928/2070-1608-2026-77-1-71-78**

# АРХАІЗАЦЫЯ ВОБРАЗА БЕЛАРУСАЎ У ЭТНАГРАФІЧНАЙ ЛІТАРАТУРЫ XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ[1]

***канд. гіст. навук, дац. Ю.І. ВНУКОВІЧ***
***(Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры***
***Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск)***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0003-2037-8150***

*У артыкуле разглядаецца стварэнне і канструяванне вобраза старажытнасці беларусаў у этнаграфічнай літаратуры XIX – пачатку XX ст. Асаблівая ўвага надаецца фарміраванню стэрэатыпа аб наяўнасці "перажыткаў язычніцтва" ў народнай культуры беларусаў, на падставе чаго рабіліся высновы не толькі аб іх выключнай архаічнасці і першабытнасці, але і захаванні дахрысціянскіх "старажытнаславянскіх рыс". Навуковую вагу гэтаму наратыву надавала папулярная энвайраментальная тэорыя, калі прыродна-кліматычныя ўмовы ўсяляк накладваліся на фізічныя і духоўныя характарыстыкі беларусаў (асабліва палешукоў). Адносна нізкая мабільнасць насельніцтва Беларусі ў гэты гістарычны перыяд таксама разглядалася як сведчанне іх прыроджанага кансерватызму і патрыярхальнасці. У сваю чаргу цывілізацыйная адсталасць беларусаў і іх знаходжанне на "дзіцячай" стадыі развіцця тлумачыліся не столькі пражываннем у неспрыяльных прыродна-кліматычных умовах, колькі працяглай культурнай ізаляцыяй і гістарычнай адарванасцю ад рускіх, а таксама прыгнётам з боку палякаў і яўрэяў.*

***Ключавыя словы:*** *беларусы, этнічны вобраз, стэрэатыпізацыя, архаізацыя, імагалогія, этнаграфія, Расійская імперыя.*

> *"А что касается в частности Белоруссии, то мы, кажется, не далеко ушли от того времени, когда греки, эти носители цивилизации, были убеждены, что всякий белорусс обязательно должен один раз в год пробегать известное время по лесам в виде волка. Мы и теперь готовы представлять себе белорусса каким-то полудикарем, полузверем, живущим в лесу, и только наука, только правильное, систематическое изучение типа, характера и быта этого народа, а также самой страны, в которой он живет, может пролить истинный свет на эту темную страницу нашего народоведения и позволит со временем сделать какие-нибудь общие выводы и заключения."*
>
> ***М.А. Янчук*** [1, ч. II, с. 2].

**Уводзіны.** Характэрнай рысай айчыннай этнаграфіі і фалькларыстыкі з'яўляецца прыярытэтны зварот даследчыкаў да архаічных з'яў культуры, іншымі словамі – іх пераважная сфакусаванасць на праблемах мінулага, а не сучаснага і, тым больш, будучага. Беларускія даследчыкі, як правіла, аперыруюць даўніной, абмінаючы або зусім мала закранаючы праблематыку мадэрных змен, а ў кантэксце сённяшняга дня перадусім разглядаюць стан і ступень захаванасці тых або іншых элементаў вясковай культуры з пункту гледжання іх адпаведнасці "традыцыі", актуалізуючы такім чынам праблему аўтэнтычнасці як галоўную даследчую праблему. Такі стан рэчаў найперш абумоўлены той навуковай спадчынай і тэарэтычнай парадыгмай, якая склалася ў савецкія часы ў межах эвалюцыянізму і гістарычнага матэрыялізму. Таксама немалаважную ролю працягвае адыгрываць устойлівы стэрэатып, сфарміраваны яшчэ ў этнаграфічным дыскурсе Расійскай імперыі, што беларусы, маўляў, ледзь не самы архаічны славянскі народ. Інструменталізаваны і ператвораны ў адзін з папулярных нацыянальных міфаў, ён міжволі змушае чарговыя пакаленні даследчыкаў штораз вышукваць у полі жывыя пацверджанні надзвычайнай старажытнасці і закансерваванасці беларускай этнічнай культуры[2].

Менавіта ў "доўгім XIX стагоддзі" пад уплывам ідэй рамантызму ў расійскім нарадазнаўстве склалася традыцыя разглядаць сялянства ў якасці асноўнага аб'екта даследавання, прыпісваючы яму захаванне старажытных (незакранутых вонкавымі ўплывамі) элементаў культуры і такім чынам архаізуючы яго, вылучаючы з сучаснасці і атаясамліваючы з гістарычным мінулым усяго народа. Так зразуметы "просты" народ выступаў своеасаблівым "жывым музеем", што захоўваў традыцыі і падмуркі гісторыі "да цывілізацыі", і "першабытнасць" якога патрабавала неадкладнага навуковага апісання [2, с. 456–457, 461].

Мэта артыкула – прасачыць, якім чынам у этнаграфічнай літаратуры XIX – пачатку XX ст. канструяваўся вобраз архаічнасці беларусаў. Крыніцамі для такога даследавання з'яўляюцца этнаграфічныя апісанні XIX – пачатку XX ст. (у першую чаргу, працы П.М. Шпілеўскага, А. Кіркора, Ю. Крашэўскага, С.В. Максімава, Дз.Г. Булгакоўскага, М.А. Янчука, М.В. Доўнар-Запольскага, А.Я. Багдановіча і інш.), у якіх сцвярджалася культурная самабытнасць беларусаў, што непазбежна была звязана з прыпісваннем ім стэрэатыпных рыс і ўласцівасцей[3].

---

[1] Публікацыя падрыхтавана ў рамках выканання праекта БРФФД "Беларусы і Беларусь у візуальных рэпрэзентацыях другой паловы XIX – пачатку XX ст.: фарміраванне традыцыі" (дагавор № № Г25-030 от 02.05.2025 г.).

[2] Не абвяргаючы факта суіснавання архаікі і сучаснага ў мясцовых рэаліях, зазначым, што рабіць гэта з кожным годам усё цяжэй.

[3] М.В. Лескінен вылучае дзве разнавіднасці такога кшталту стэрэатыпаў. Па-першае, гэта стэрэатыпы ўласна этнаграфічнай навукі (класіфікацыі, іерархіі ўласцівасцей, уяўленні пра стадыяльнасць развіцця народаў і інш.), калі нарматыўнасць акта

Тэма стэрэатыпізаванага вобраза беларусаў, як звонку прыпісанага і ідэалагічна матываванага канструкта, што склаўся ў этнаграфічнай літаратуры XIX – пачатку XX ст., дагэтуль не знайшла свайго належнага адлюстравання ў гістарыяграфіі. Можна згадаць Э. Мазько, які спрабаваў разгледзець стэрэатып “сярмяжнага беларуса, неразвітага і адсталага” ў якасці прыкрага прыкладу каланіяльнай спадчыны [4], а таксама Н.Л. Бахановіч, якая на падставе апазіцыі *свой – чужы* асобную ўвагу надала вобразу беларуса, што склаўся ў шматмоўнай мастацкай літаратуры XIX ст. [5, с. 115–128]. Эвалюцыю вобраза палешука ў польскім нарадазнаўчым дыскурсе XIX ст. разгледзела Г. Энгелькінг [6; 7]. Для кампаратывісцкага вывучэння стэрэатыпізацыі шэрагу этнічнасцей у народаапісаннях, публіцыстыцы і іканаграфіі Расійскай імперыі вялікае значэнне маюць працы М.В. Лескінен [2; 3; 8]. Аднак сістэматычнага аналізу этнаграфічных тэкстаў з мэтай высвятлення механізмаў архаізацыі вобраза беларусаў, наколькі вядома, спецыяльна не праводзілася.

**Асноўная частка.** Старажытнасць народа яшчэ з эпохі Адраджэння лічылася важным доказам яго аўтахтоннасці, культурна-лінгвістычнай пераемнасці і “гістарычных” правоў на тэрыторыю [3, с. 112]. Знакаміты італьянскі філосаф Джамбатыста Віка заўважаў, што народы заўжды імкнуцца прыпісаць сабе гісторыю больш старажытную, чым яна была ў сапраўднасці, і перанесці яе пачатак як мага глыбей у мінулае [9, с. 41–44]. Так нібыта ім надаецца больш велічы і сталасці. Апрача таго, распачаць аповед уласнай гісторыі ад моманту з’яўлення першых людзей азначае ўключыць сябе ў шырокі кантэкст чалавецтва, дзе праз параўнанне і супастаўленне з’яўляецца магчымасць ацэньваць і іерархізаваць асобныя народы.

Працы французскіх энцыклапедыстаў (Ш. Мантэск’ё, Ж.-Ж. Русо, К. Гельвецыя, Вальтэра), нямецкіх і англійскіх філосафаў (найперш І. Канта, Д. Юма, Ё.Г. Гердэра) заклалі падмурак новых уяўленняў аб вытоках этнічнай разнастайнасці, прынцыпах апісання, метадах даследавання плямёнаў і народаў. Успрыманне Асветніцтвам гісторыі ўвасобілася ў ідэі прагрэсу, вызначанага розумам і законам, што дазваляла выбудаваць выразную эвалюцыю і, як следства, іерархію дзяржаў і грамадстваў. Падзел народаў на цывілізаваных і нецывілізаваных (дзікіх) у некаторым сэнсе замяніў ранейшае супрацьпастаўленне хрысціян і нехрысціян, уключыўшы дадатковыя крытэрыі ідэнтыфікацыі, такія як наяўнасць грамадскай арганізацыі (вышэйшай формай якой аб’яўлялася дзяржава) і права. Гэтая агульная класіфікацыя стала ўніверсальнай, паколькі магла быць ужыта як у дачыненні да еўрапейскіх народаў, што ў той або іншай ступені ўваходзілі ў арбіту хрысціянскага свету, так і ў дачыненні да тых, прыналежнасць якіх да чалавечага роду выклікала сумневы. Такім чынам, уся разнастайнасць чалавечых супольнасцей магла быць размеркавана па стадыях. Увасабленнем гэтай стадыяльнасці стала атаясамленне жыцця чалавека з гісторыяй грамадства, метафарай – этапы жыццёвага цыклу [3, с. 38].

У XVIII – першай палове XIX ст. распачаўся працэс “вынаходніцтва нацый” і іх гісторый, у які актыўна ўключаліся ўяўленні пра “народныя традыцыі” і “гістарычныя карані”. У кантэксце Цэнтральна-Усходняй Еўропы ён меў сваю спецыфіку для “гістарычных” (якія мелі некалі сваю дзяржаву, але згубілі яе) і “негістарычных” (якія ніколі не мелі ўласнай дзяржавы) народаў. Згодна з Э. Гелнэрам, актывісты-абуджальнікі першых адпаведна патрабавалі “адраджэння” палітычнай адзінкі, якая некалі знікла ў выніку палітычных ці рэлігійных канфліктаў. Другія – стварэння новай адзінкі, неабходнасць якой абгрунтоўвалася толькі культурнай своеасаблівасцю дадзенай тэрыторыі, але не гістарычным прэцэдэнтам. Пры гэтым, як адзначае тэарэтык нацыяналізму, адрозненне паміж гэтымі выпадкамі не настолькі прынцыповае, як гэта прынята часам лічыць. І для тых, і для тых у Цэнтральна-Усходняй Еўропе была характэрна “этнаграфічная” фаза развіцця, калі нацыянальныя культуры ствараліся не ў апазіцыі да мясцовай народнай культуры (як на захадзе Еўропы), а на яе падставе. Як піша Э. Гелнэр: “Вядомае адрозненне гістарычных і негістарычных нацый не мае пры гэтым асаблівай ролі, бо не так ужо і важна, ці была дадзеная дыялектная група ў мінулым звязана з палітычнай адзінкай і з культурай сваёй арыстакратыі ці такой сувязі не існавала. Гэта можа паўплываць толькі на характар ствараемай нацыянальнай міфалогіі. Так, чэхі ці літоўцы могуць аддавацца ўспамінам пра сваё слаўнае сярэднявечнае мінулае, а эстонцы, беларусы або славакі не маюць такой магчымасці. У іх распараджэнні – толькі сялянскі фальклор ды апавяданні пра высакародных разбойнікаў, але няма жыццеапісанняў манархаў і пераможных заваёўных эпапей. Зрэшты, гэта не мае вялікага значэння” [10, с. 191–192].

Трэба адзначыць, што “этнаграфічная” фаза нацыянальнага развіцця беларусаў знаходзілася пад моцным уплывам расійскага імперскага этнаграфічнага наратыву, калі асноўныя стэрэатыпы ўсходнеславянскіх народаў упісваліся ў навукова абгрунтаваную ідэалагічную канцэпцыю адрознівання іерархічных статусаў “малодшых” галін “рускага народа” (гэта значыць “маларусаў” і “беларусаў”) і іх “культурнага”, “цывілізаванага” “старэйшага брата” (гэта значыць “велікарусаў”), які быў адукаваны і знаходзіўся на іншай ступені гістарычнага развіцця[4]. Адпаведна гэтай канцэпцыі, “малодшы” застаўся ў мінулым, быў паглыблены выключна ў сялянскі і правінцыйны побыт, захоўваючы такім чынам вернасць старадаўняму ладу і нормам жыцця. У гэтым, на думку М.В. Лескінен, выяўляліся і перавагі “малодшых братоў”: яны захоўвалі ўласцівасці дзіцячай несапсаванай натуры,

апісання скажае ўспрыманне яго аб’екта і вызначае формы гэтага скажэння. Па-другое, гэта сацыяльныя стэрэатыпы і ўяўленні саміх назіральнікаў, якія экстрапалююць уласнае бачанне і “свайго”, і “чужога” на ўсю этнічную супольнасць [3, с. 326]. Пры гэтым ні першыя, ні другія не ёсць кангруэнтныя народным уяўленням пра “чужое”.

[4] Менавіта ў гэты час, як адзначае А.Я. Леўкіеўская, канчаткова сфарміраваўся пункт гледжання на ўкраінца з боку рускага як погляд зверху ўніз (гэта значыць, як “старшага”, “цывілізаванага”, “культурнага” на “малодшага”, “нецывілізаванага”, “некультурнага”) [11, с. 158].

прастадушнасць і цнатлівасць. Іх "чысціня" суадносілася з прыроднай патрыярхальнай натуральнасцю і архаічна-ідэалізаванымі сацыяльнымі дачыненнямі [8, с. 17–18]. Адпаведна землі "малодшых братоў" разглядаліся як менш "цывілізаваныя" або ўвогуле дзікія, заселеныя хоць і блізкароднаснымі, але прымітыўнымі сялянамі, а ўвесь "Заходні край" – як перыферыя, што мела цьмяную мінуўшчыну і паспяховае будучае якой цалкам залежала ад культуртрэгерскай дзейнасці імперскага цэнтра [4, с. 401].

Ад самага пачатку беларусы ў этнаграфічнай літаратуры XIX – пачатку XX ст. апісваліся як народ, што захаваў у сваёй народнай культуры вялікую колькасць **"перажыткаў язычніцтва"**. Асаблівы ўклад у такое іх уяўленне зрабілі прыхільнікі міфалагічнай школы[5], якая сфарміравалася пад уплывам ідэй рамантызму і кірунак якой у этнаграфіі і фалькларыстыцы ў першай палове і 60 – 70-я гг. XIX ст. быў пануючым. Яе прадстаўнікі (П.М. Шпілеўскі, А. Кіркор, П.А. Бяссонаў, П.В. Шэйн і інш.) адыгралі важную ролю ў актывізацыі збірання і вывучэння фальклору, этнаграфічных матэрыялаў, росце цікавасці да народнай культуры.

Адным з першых папулярызатараў і даследчыкаў беларускай народнай культуры, які ў сваёй творчасці стварыў багата стэрэатыпаў пра яе, быў П.М. Шпілеўскі. Ужо ў першай публікацыі "Белорусские народные предания" (1846) у духу міфалагічнай школы ён выказаў ідэю пра выключную архаічнасць беларускага фальклору, які бярэ свае пачаткі наўпрост "ад часоў язычніцтва": *"В простом народе Белорусских Губерний можно находить много обычаев, игрищ, обрядов, поговорок, которые ведут свое начало от времен язычества. Нельзя не удивляться, как могли сохраниться самые песни (многие) без всякого изменения: трудно найти в них какую-нибудь перемену не только в мыслях, но даже в словах"* [13, с. 5–6]. Патрыятычна настроены ўраджэнец Беларусі актыўна прасоўваў думку, што вераванні ў старажытнарускіх язычніцкіх багоў з "асаблівай дакладнасцю" захаваліся "па рэках Прыпяці, Сожы і, часткова, па Заходняй Дзвіне, гэта значыць у губернях Мінскай, Магілёўскай, часткова – у Кіеўскай, Віцебскай і часткова – у Чарнігаўскай" [13, с. 5–6], бо нібыта *"нынешняя Белоруссия некогда была главным сердцем славяно-русских языческих верований"* [14, с. 72]. Гэтых багоў, маўляў, уяўлялі ў наглядных вобразах; у іх пераапраналіся ў час свят і абрадаў, да іх звярталіся ў песнях, іх імёны згадвалі ў прыказках і прымаўках. Многія палажэнні і выказванні аўтара, якія з навуковых пазіцый былі крытычна разабраны і развянчаны толькі ў пачатку XXI ст. [15, с. 246–250; 16, с. 311–312], шматразова пераказваліся і дапаўняліся ў наступных сачыненнях па славянскай міфалогіі.

На думку А.Я. Леўкіеўскай, галоўнай задачай П.М. Шпілеўскага, які, як і многія іншыя тагачасныя аўтары, арыентаваўся ў сваіх даследаваннях на антычную мадэль свету, было зацвердзіць "паўнавартаснасць" уласнага народа шляхам стварэння і вынаходніцтва "паўнавартаснага" беларускага міфалагічнага пантэона, які нічым бы не саступаў старажытнагрэчаскаму эталону[6] [16, с. 313]. Гэта азначае, што пабудаваныя ім гістарычныя сувязі, даследчыцкія гіпотэзы арыентаваліся не столькі на спасціжэнне ісціны, колькі на міфалагізаваныя версіі мінулага, у якіх глыбіня старажытнасці народа з'яўляецца сувымернай самабытнасці яго народнай культуры [18, с. 102].

Не будзе перабольшваннем сцвярджаць, што менавіта П.М. Шпілеўскі, творы якога актыўна чыталіся і цытаваліся як прафесійнымі даследчыкамі, так і папулярызатарамі беларускай народнай культуры і міфалогіі, паўплываў на стварэнне ўстойлівага стэрэатыпа, што *"ни одна полоса громадной России не может похвалиться таким обилием народных чар, заговариваний, суеверий и предрассудков, каким славилась Белоруссия"* [19, с. 59–60]. Напрыклад, шырока паведамленнямі П.М. Шпілеўскага карыстаўся А. Кіркор, які ў нарысе пра перажыткі язычніцтва ў Беларусі працягнуў развіваць яе вобраз як краіны *"богаче всех других славянских земель мифологическими преданиями и песнями, которые поются тысячи лет, хотя некоторые уже с христианским оттенком, но коих главное содержание и, большею частью, даже самые выражения несомненно относятся ко временам язычества"* [20, с. 251].

Яшчэ адзін аўтар этнаграфічных нарысаў пра беларусаў, што ў тым ліку ўвайшлі ў багата ілюстраванае навукова-папулярнае выданне "Живописная Россия", С.В. Максімаў[7] з імперскіх пазіцый катэгарычна адмаўляў

---

[5] Асноўныя палажэнні міфалагічнай школы распрацавалі браты Я. і В. Грым, А. Кун (Германія), М. Мюлер (Англія). Яны разглядалі вераванні, паданні, песні, казкі, легенды і інш. як рэшткі старажытнага, т. зв. міфалагічнага светапогляду, які нібыта быў заснаваны на ўвасабленні нябесных з'яў – сонца, месяца, хмар, грому і інш. Гэтыя ўвасабленні, на іх погляд, былі багамі, якім пакланяліся. Меркавалі, што з цягам часу такая рэлігійна-міфалагічная сістэма пачала разбурацца і ранейшыя багі ператварыліся ў казачных персанажаў (жывёл, людзей і інш.). На думку тагачасных вучоных, рэшткі першабытнага міфалагічнага светапогляду захаваліся ў народных звычаях і абрадах, сутнасць якіх часта тлумачылі памылкова. Пад уплывам міфалагічнай школы ў расійскім нарадазнаўстве другой паловы XIX ст. адбыўся рэзкі часовы зрух, калі, па словах А.Л. Тапаркова, "фальклорныя тэксты, што запісваліся ў Расіі таго часу, праецыраваліся ў дагістарычную старажытнасць, паэтычная вобразнасць фальклору атаясамлівалася са зместам архаічнай міфалогіі, а мысленне рускіх сялян збліжалася з мысленнем першабытнага чалавека" [12, с. 39].

[6] Дадамо, што яшчэ адным эталонным увасабленнем народнай міфалогіі для мясцовых (асабліва польскамоўных) даследчыкаў успрымалася старажытная міфалогія суседніх літоўцаў, распрацаваная і рэканструяваная на падставе разнастайных (у тым ліку даволі сумніўных) гістарычных крыніц у працах Т. Нарбута. Наяўнасць пісьмова зафіксаванай міфалогіі ў літоўцаў, апісанай і легітымізаванай прызнаным аўтарытэтам, стварала ўражанне, што суседнія беларусы, як адзначаў А. Кіркор, *"гораздо беднее литовцев преданиями историческими и даже мифологическими"* [17, с. 160].

[7] Максімаў Сяргей Васільевіч (1831–1901) – рускі пісьменнік і этнограф, адзін з удзельнікаў (што адказваў за вывучэнне беларусаў) статыстычна-этнаграфічнай экспедыцыі ў заходнія губерні Расійскай імперыі, арганізаванай Рускім геаграфічным таварыствам у 1867 – 1871 гг., аўтар шматлікіх этнаграфічных нарысаў пра беларусаў.

беларусам у цывілізаванасці, апісваючы іх выключна ў духу энвайраментальнай тэорыі як "першабытных" насельнікаў "дзікай" ускраіны, што засталіся жыць у "язычніцкай эпосе": *"Белоруссы в крайней уединенности своей являются тем в высшей степени интересным и поучительным племенем, в котором почти все первобытно: пища, жилище, одежда и миросозерцание. По одним бытовым признакам для них как бы еще не наступил железный век и они живут в каменном периоде, по другим – они несомненно принадлежат языческой эпохе"* [21, с. 212]. Пры гэтым беларусы, нягледзячы на свой статус хоць і "няўдачлівага, але спрадвечнага і выключнага" земляробчага народа[8], выносіліся ім на перыферыю хрысціянства, дзе вялі сваю барацьбу за ўплыў праваслаўная і каталіцкая канфесіі, што і дало магчымасць, на думку этнографа, лепш захаваць старажытныя вераванні, на падставе якіх фактычна можна было рэканструяваць "старажытную язычніцкую славянскую веру":

> *В белоруссе находим яркие и цельные черты до-христианского культа разлитыми в таком изобилии, что по народным поверьям, суевериям и предрассудкам, можно рассчитывать приблизительно восстановить древнюю языческую славянскую веру. Обилие цельных образов древних божеств с их определенными и раздельными чертами, с собственными племенами и очевидными пунктами и временами их деятельности; избыток в значительном большинстве обрядовых приемов, основанных на опыте, изучении и наблюдениях над вещественною природою, – все это выделяет белорусса из ряда вон. Что полузабыто или совсем утрачено в Великой России, – в Белоруссии сохраняется в цельном и нетронутом виде.*
>
> *Эта цельность племени, под шумок борьбы двух христианских исповеданий, разрешившихся обезличенною унией, всего богаче отразилась в сохранении им самого главного достояния народа – его древней веры* [23, с. 310; гл. таксама 24, с. 454].

Стэрэатып беларусаў як народа, у культуры якога захоўваюцца шматлікія "рэшткі язычніцтва", працягвалі развіваць і трансляваць іншыя даследчыкі (у тым ліку тыя, аўтарытэт якіх у тагачаснай навуцы быў небеспадстаўна высокі)[9]. Цікава, напрыклад, адзначыць, што ў сярэдзіне 1860-х гг. П.В. Бабpоўскі, палемізуючы з Р.Ф. Эркертам наконт этнічных прыкмет беларусаў, прапанаваў разглядаць у якасці адной з такіх народную міфалогію (sic!), якая разам з мовай суправаджала беларусаў "ад калыскі да магілы":

> *У белоруссов, независимо от веры во Христа и притом безразлично по греческому или латинскому обряду, остаются еще глубокие верования в некоторые естественные явления, как в нечто необыкновенное, предубеждения, вера в колдовство и чародейство; – в этом независимо от Евангелия заключается их книга судеб, их мораль, загадка и разгадка их существования.*
>
> *Исполняя все христианские обряды как бы бессознательно, белорус, я говорю о большинстве – о крестьянах, будь он православный или католик, имеет свои убеждения, свою нравственную философию и передает все это вместе с языком своим детям и внукам. Это суеверие, упругое, неподатливое для просветительских начала церкви, перенося белоруса в особый мир чар и злых духов, сопутствует ему от колыбели до могилы и всегда неразлучно с его языком; в этом то и надобно искать племеннаго разграничения здешних славян* [26, с. 16–17].

У пачатку ХХ ст. пальма першынства па захаванні "слядоў язычніцкіх культаў і вераванняў" сярод іншых народаў Расійскай імперыі, па словах М. Доўнар-Запольскага, усё яшчэ належала беларусам (*"Повсеместно в России еще сохраняются в большей или меньшей степени следы языческих культов и верований. Но белоруссу в этом отношении бесспорно принадлежит первенство"* [27, с. 158]). Нядзіўна, што беларусы з цягам часу таксама сталі разглядацца ў нарадазнаўчай літаратуры ХІХ – пачатку ХХ ст. як прасякнуты *"простотою"* народ, што найлепей захаваў не толькі "рэшткі язычніцтва", але і ўвогуле "побыт старажытных славян":

> *Так в современном быте белоруссов отличающемся совершенною простотою, можно видеть быт древних славян. Века прошли с тех пор как белоруссы образовали отдельный народ, а между тем и в ведении домашняго хозяйства, и в постройке изб, и в языке все у них обстоит так, как обстояло во времена древние, до христианские. Тою же простотою и стародавностию проникнуты их нравы и обычаи* [28, с. 35].

Такой думкі прытрымліваўся ўжо П.М. Шпілеўскі, калі пісаў, што беларусы дагэтуль жывуць *"жизнью древнерусскою, простою, необразованною; говорят тем же языком славяно-русским, на котором некогда говорили первобытные русские-славяне, жившие отдельными племенами, составлявшими одну и единую Русь!.."* [14, с. 71–72]. Гэты наратыў пра закансерваваных па-за часам беларусаў, якія зберагаюць "чысціню" старажытнаславянскага тыпу, без асаблівых змен паўтараўся ў іх этнаграфічных апісаннях аж да пачатку ХХ ст. Так, апісваючы паўночна-заходнюю частку Слуцкага павета Мінскай губерні, С.А. Малевіч у 1907 г. пісаў, што *"<...> белорусская деревня описываемого района в наши дни очень немного, в сущности, переросла эпоху деревянного (sic!) века, сохранившись до сих пор почти при таких условиях в таком виде, как и во времена Владимира Святого"* [29, с. 1].

Пры гэтым найбольш архаічнай галіной беларусаў маляваліся палешукі. Рамантычная канцэпцыя народнасці трактавала палешука як носьбіта "старажытнай", "чыстай", "роднай" славянскай культуры [6, с. 158]. Як пісаў выдатны знаўца Палесся І. Эрэміч, дапытлівага даследчыка славян проста не магла не ўразіць сапраўдная *"цвіль старажытнасці"*[10] побыту палешукоў:

---

[8] Напрыклад, С.В. Максімаў, у нейкай ступені супярэчачы сам сабе, сцвярджаў, што *"в первобытные леса свои славяне белорусского племени и имени несомненно пришли не дикарями, а земледельцами, с готовым знанием, уменьем, сноровкою, – словом, с тем, что мы привыкли называть по-иностранному индустрией"* [22, с. 138].

[9] Рэдкае выключэнне – І.І. Насовіч, які з пазіцый праваслаўнага верніка даволі крытычна ацэньваў наяўнасць *"у белорусских простолюдинов признаков остатка древняго славянскаго язычества"* [25, с. 51].

[10] Такое азначэнне (як і тэрміны "перажыткі", "рэшткі") добра адлюстроўвае тое, што катэгорыя "старажытнасці" / "даўніны" ў працах этнографаў ужывалася найперш у дачыненні да старых форм і з'яў сялянскай культуры, што, як лічылася, амаль у нязменным выглядзе захаваліся з глыбокага мінулага.

*Прежде всего внимание наблюдателя поражает та, так сказать, плесень древности, которою окаймлен весь бытовой склад полешуков-белорусов. Века пролетели над ними, почти не задев их своим разрушительным крылом. И в ведении домашнего хозяйства, и в постройке изб, и в языке, и даже в нравах и обычаях – все обстоит так, как обстояло во времена дохристианские, – прибавилось несколько верований христианства, не совсем вытеснившего остатки язычества, – несколько слов и акцента в говоре, заимствованных из севера России, или от Литвы и Польши, несколько прилипших к греко-русскому православию от унии наростов, – вот и все, что пристало к старине полешука-белоруса; все прочее, словно в окаменелом виде, сбережено доселе неприкосновенно, в течении тысячелетия. <...> Словом: кто хочет изучать тип древнеславянский, во всем его доисторическом характере, тот пусть отправится для этой цели в села и деревни полеские, затерянные, можно сказать, для человечества между лесами и болотами* [30, с. 130][11].

Як адзначае Г. Энгелькінг, палеская культура паўстае ва ўяўленні нарадазнаўцаў XIX ст. як скамянелая архаіка; больш за тое, камунікацыйная недаступнасць і геаграфічная ізаляванасць трактуецца як апраўданне "старажытнасці" гэтага краю, якая яму прыпісваецца [6, с. 158].

*Вялікі палескі край <...> быў калі не арганічным, дык прынамсі геаграфічным цэнтрам Славяншчыны. У глухіх пушчах і багнах менш давалася ў знакі панаванне чужынцаў; рэдка і нядоўга яны там гасцявалі. Славянскасць, з усіх бакоў акружаная пагрозамі, знайшла прытулак у месцах, дзе дасюль яшчэ хаваецца старажытны зубр* [32, s. 4].

*На Палессі <...> народ захаваў першасны тып славянскага племені і ў фізічнай знешнасці, і ў адвечных сваіх звычаях, традыцыях і нацыянальных песнях. Тут меней чым дзе бачныя сляды ўплыву чужой пляменнасці, якая ў іншых месцах сказіла першаўзор славяніна. <...> Захаваліся ў іх разнастайныя чары і звычаі, што выконваюцца ў хатніх і іншых умовах сялянскага жыцця* [32, s. 62, 66–67].

Асаблівы ўплыў на фарміраванне ўяўлення пра палешукоў (і беларусаў у цэлым)[12] як "першабытных" насельнікаў "дзікага" краю зрабіла энвайраментальная тэорыя, якая звязвала культурныя, фізічныя і псіхічныя рысы народаў з прасторай іх пражывання. Уласцівая эпосе парадыгма геаграфічна-прыроднага дэтэрмінізму, вядомая з старажытнасці[13], у XIX ст. замацавалася ў навуцы з падачы нямецкага географа Карла Рытэра. Паводле яго, там, дзе маем справу з ізаляванай, "дзікай", непадуладнай спробам чалавека цывілізаваць яе, прыродай, там функцыянуе падобная, "неасвечаная", "прымітыўная" культура, там захоўваецца найболей архаікі ў нескажоным стане [6, с. 155]. Таму нядзіўна, што фізічныя і духоўныя якасці беларусаў у працах па этнаграфіі, якая ў XIX ст. з'ўлялася арганічнай часткай геаграфіі, а не гісторыі, усяляк прыпадабняюцца кліматычным і прыродным асаблівасцям прасторы іх пражывання. Так, адзін з найбольш яскравых прадстаўнікоў ідэй геаграфічнага дэтэрмінізму ў расійскай этнаграфіі XIX ст. С.В. Максімаў у кнізе "Дремучие леса, или Рассказ о диких народах, населяющих русские леса" з паказальным эпіграфам *"Якая прырода – такія і людзі"* наўпрост праектаваў "нездаровыя, балоцістыя лясы Заходняй Расіі" на вонкавы выгляд і здароўе мясцовага насельніцтва[14] [35, с. 74]. Гэтаксама ў польскім нарадазнаўстве таго часу, як паказала Г. Энгелькінг, пазбаўлены чалавечай годнасці паляшук разглядаецца ў апазіцыі да энергічнага "самавітага" і "кемлівага" польскага, літоўскага і валынскага вяскоўца, жыве разам з быдлам, дзікі, як і яго край, поўны непралазных багнаў, глухіх пушчаў і неўрадлівай зямлі, "залічаны ў інвентар", бо дзікасць прыроды вызначае пэўную "жывёльнасць" чалавека; у апазіцыях *прырода – культура, дзікунства – цывілізацыя, нечалавек – чалавек* паляшук знаходзіцца на іх левым, негатыўным полюсе [6, с. 156].

Яшчэ адным сведчаннем архаічнай першабытнасці і патрыярхальнай чысціні беларусаў разглядалася іх выключная прывязанасць да радзімы, якая, між іншым, дала падставу С.В. Максімаву вызначыць беларусаў як выключна **"дамаседлівае племя"** [23, с. 299]. На яго думку, існавала простая заканамернасць, калі ў Беларусі *"старинная народная жизнь сохранилась цельнее и языческие верования мало поколебались и отлично сберeглись благодаря изумительному домоседству жителей и уединяющему географическому положению"* [37, с. 262]. Калі ж С.В. Максімаў лічыў, што беларус, які *"упорно уселся на месте и не двигался"*, стаў дамаседам, бо павінен быў моцна трымацца за зямлю, *"как за последнюю свою надежду и защиту"* [23, с. 299], то А.Я. Багдановіч сцвярджаў, што дамаседства ў беларусаў развілася ў выніку застою: *"Белорус так долго предавался застою, что в нем развилось домоседство, неподвижность (даже отхожих промыслов не развил, хотя потребность в них, конечно, чувствовалась), а отсутствие ознакомления с чужим мешало улучшению своего"* [36, с. 1].

Метафарычна цывілізацыйная адсталасць беларусаў у расійскім этнаграфічным наратыве XIX – пачатку XX ст. у катэгорыях узросту маркіравалася паняццем *"младенческого народа"* (з прыпісваннем яму адпаведных

[11] Гл. таксама падобнае выказванне Дз.Г. Булгакоўскга пра *пінчукоў* [31, с. V–VI].

[12] Акцэнт на неспрыяльных прыродных умовах культурнай айкумены беларусы, што абумовілі асаблівасці іх "вонкавага" (матэрыяльнага) і "ўнутранага" (духоўнага) жыцця, характэрны бадай для ўсіх этнаграфічных апісанняў XIX – пачатку XX ст.

[13] У сярэднявечнай Еўропе з дапамогай энвайраментальнай і гумаральнай тэорый звычайна растлумачваліся культурныя, фізічныя і псіхічныя асаблівасці насельніцтва краін па восі *поўнач – поўдзень* (жыхароў, адпаведна, суровага і спрыяльнага для чалавека клімата). Як паказала К. Віда, ідэі эсэнцыялізацыі народаў у залежнасці ад навакольнага асяроддзя давалі зручныя палітыка-рытарычныя аргументы на карысць іх праваой і тэрытарыяльнай каланізацыі і падначаленасці [33, с. 96–147].

[14] Не менш паказальны ў гэтым плане адваротны прыём параўнання "прыроднага" і "культурнага", якім скарыстаўся Ю. Крашэўскі пры апісанні палескай прыроды: "Уявіце сабе лес трыснягу, сплеценага і звязанага, як валасы ў пінскім каўтуне, і гэты лес бязмежны, як мора, перасечаны толькі дзе-нідзе рэчышчам ракі, якая вузенька, нібы з вялікага дазволу, працякае праз гушчары чароту" [34, s. 143].

уласцівасцей і якасцей, напрыклад, *“младенческого воображения”*), што вынікала з агульнай пазіцыі імперскага цэнтра разглядаць падначаленыя народы, як ужо было адзначана, зверху ўніз – як “старшага” / “цывілізаванага” / “культурнага” на “малодшага” / “нецывілізаванага” / “некультурнага”. У межах гэтай каланіяльнай класіфікацыі апісваў беларусаў ужо П.М. Шпілеўскі, калі сцвярджаў, што яны ў сваім развіцці *“отстали во всем от своих великорусских братьев”* [14, с. 71]. Гэты тэзіс без належнага крытычнага асэнсавання транслявалі амаль усе рускамоўныя этнографы і публіцысты, якія апісвалі беларусаў, аж да XX ст. Напрыклад, навязаны звонку негатыўны вобраз беларусаў як “неразвітага” народа падхапіў А.Я. Багдановіч, які пісаў, што *“жизнь белоруса, и его творческая деятельность резко отмечены печатью неразвитости, отсталости, забитости”*, пра што нібыта сведчылі і народныя абрадавыя песні (у якіх няма *“того могучего лиризма, свидетельствующего о силе и свежести чувства, который так выгодно отличает великорусскую песню”* ды й увогуле – *“почти все они бледны, отрывочны, невыдержанны, отзываются какой-то пришибленностью творчества, духовной бедностью”*, а *“мелодии их, по-видимому, еще беднее содержания”*), і беларускія казкі (*“опять таки, хотя и многочисленны, но, как и песни, бедны по содержанию”*), і абрады, якія суправаджаюць жыццё беларуса “ад калыскі да смерці” (*“эти окаменелости прошлой действительности, – или крайне дики с точки зрения цивилизованного человека, или грубо фетишистичны, <...> они свидетельствуют о сравнительно невысоком уровне умственного развития”*), і нават беларуская мова, якая *“гораздо беднее словами для обозначения отвлеченных понятий, чем великорусский народный язык, и даже уступает в этом отношении малорусскому”* і г.д. [36, с. 1–12].

У гэтым выпадку стадыяльнае адставанне беларусаў абгрунтоўвалася ўжо не столькі іх пражываннем у неспрыяльных прыродна-кліматычных умовах, колькі працяглай культурнай ізаляцыяй і гістарычнай адарванасцю ад рускіх, а таксама іх няшчаднай эксплуатацыяй іншаканфесійнымі “элементамі” (гэта значыць палякамі і яўрэямі) [8, с. 18]. Уладай апошніх у краі растлумачвалася скрайняя беднасць і агульная занядбанасць побыту беларусаў, сімвалічнай адзнакай чаго ў этнаграфічных працах стала *курная хата*[15]. Беларусы маляваліся “цёмнай” сялянскай масай, якая, трапіўшы пад польска-каталіцкі ўплыў, фактычна цалкам спыніла сваё самастойнае развіццё. Пры гэтым пасіўнасць і нерашучасць беларуса, вынесенага па-за межы “сапраўднай”, гэта значыць імперскай гісторыі, супрацьпастаўляліся актыўнасці і жыццяздольнасці рускага:

> *Не призванный силою исторических обстоятельств, подобно великоруссу, к более живой и активной деятельности, от природы неглупый и смышленый, но нерешительный и довольно апатичный, белорус очень мало ушел вперед в сравнении со своим великорусским собратом. Проводя всю свою тяжелую безпросветную жизнь на своей полоске, в закоптелой хате, вдали от действительной, более широкой и сознательной жизни, он и в наше время всецело проникнут косными взглядами своих дедов, полон различных грубых суеверий, нелепых предрассудков и младенческой веры в роковую неизбежность* [29, с. 3].

Паводле С.В. Максімава, хоць беларус і меў некалісьці свае гарады, але ўсе яны *“стоят в том же недоразвитом состоянии, как и самыя деревни, и что всего знаменательнее и печальнее: с ними утрачена всякая связь деревни”*. Тым не менш, яны ўказваюць на тое, што *“страна с ее коренным населением некогда двигалась вперед по пути цивилизации, но была остановлена. Если не пошла она обратным путем, во всяком случае осталась со множеством первобытных недоразвитых форм”* [23, с. 309].

У канцы XIX – пачатку XX ст. некаторыя этнографы сталі звяртаць крытычную ўвагу на ганебную “пячатку тэндэнцыйнасці”, якая “ляжыць на амаль усіх працах, што тычацца вывучэння Беларусі” [1, с. 3–4]. Такі стан рэчаў яны па-пазітывісцку тлумачылі палітычнай спадчынай 1860-х гг., калі *“русские публицисты изо всех сил старались представить белоруссов самым несчастным, самым угнетенным народом в мире для того, чтобы показать, как тяжело отразилось в крае господство польских помещиков и евреев”* [27, с. 157–158]. Аднак працягваючы па інэрцыі апісваць беларусаў як “малодшага брата”, пераасэнсаваць стэрэатып іх прыроднай архаічнасці і першабытнасці так і не змаглі.

**Заключэнне.** Такім чынам, сцвярджэнне аб архаічнасці беларусаў у этнаграфічнай літаратуры XIX – пачатку XX ст. было заснавана найперш на выяўленні “старажытных” элементаў у іх сялянскай культуры, што класіфікаваліся як “перажыткі язычніцтва”. Пры гэтым прыналежнасць беларусаў, вынесеных на перыферыю хрысціянства, да “язычніцкай эпохі” ў расійскім нарадазнаўстве канцэптуалізавалася не толькі ў ідэі іх выключнай старажытнасці і першабытнасці, але і найлепшай захаванасці ў іх культуры дахрысціянскіх “старажытнаславянскіх рыс”. Энвайраментальная тэорыя, пад моцным уплывам якой знаходзілася этнаграфічная навука на працягу ўсяго XIX ст., надавала яшчэ большую вагу гэтаму наратыву, калі прыродна-кліматычныя ўмовы і геаграфічная ізаляванасць рэгіёна ўсяляк накладваліся на фізічныя і духоўныя якасці беларусаў (і асабліва палешукоў). Параўнальна нізкая мабільнасць жыхароў Беларусі ў гэты час таксама разглядалася ў якасці доказу іх выключнай кансерватыўнасці і патрыярхальнасці. Пры гэтым агульнае цывілізацыйнае адставанне беларусаў і знаходжанне іх на “дзіцячай” стадыі развіцця тлумачылася не столькі пражываннем у неспрыяльных прыродна-кліматычных умовах, колькі працяглай культурнай ізаляцыяй і гістарычнай адарванасцю ад рускіх, а таксама прыгнётам з боку палякаў і яўрэяў.

Сканструяваны прадстаўнікамі расійскай этнаграфіі вобраз старажытнасці беларусаў, які рэзка вылучаў іх на фоне “цывілізаваных” суседзяў, з аднаго боку, садзейнічаў іх далейшай эсэнцыялізацыі, як “самага забітага” народа ў Расійскай імперыі; з другога, непрадбачанага боку – дазваляў інтэрналізаваць і інструменталізаваць гэты наратыў у беларускім нацыянальным міфатворчым дыскурсе як сведчанне ўласнай архаічнасці і спрадвечнасці.

---

[15] Квінтэсэнцыяй такога ўспрымання курной хаты з’яўляецца апісанне жылля беларусаў, зробленае С.В. Максімавым, дзе ён разглядае яе ў якасці *“третьей степени первобытных форм после землянки и наземнаго шалаша”* [23, с. 308–309].

## ЛІТАРАТУРА


1. Янчук Н. По Минской губернии (заметки из поездки в 1886 году). – М.: Тип. А. Левенсон и Ко, 1889. – 130 с.
2. Лескинен М.В. Великоросс / великорус. Из истории конструирования этничности. Век XIX. – М.: Индрик, 2016. – 680 с.
3. Лескинен М.В. Поляки и финны в российской науке второй половины XIX в.: «другой» сквозь призму идентичности. – М.: Индрик, 2010. – 368 с.
4. Мазько Э.А. Стэрэатыпы беларуса і Беларусі ва ўяўленні рускіх і «западно-руссов» у пачатку XX стагоддзя // Культура, наука, образование в современном мире: материалы V Междунар. науч. конф.; редкол.: Л.Л. Мельникова [и др.]. – Гродно, 2011. – С. 400–405.
5. Бахановіч Н.Л. Абліччы іншага ў шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX стагоддзя / навук. рэд. І.М. Запрудскі. – Мінск: Белар. навука, 2022. – 305 с.
6. Энгелькінг Г. «Паляшук» у нарадазнаўчым дыскурсе. Эскіз да партрэта паводле Ludu Кольберга // Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні. – Мінск, 2017. – Вып. 4. – С. 150–163.
7. Энгелькінг Г. Паляшук дэгуманізаваны. Польскае стаўленне да Палесся ў святле міфа // Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні. – Мінск, 2018. – Вып. 5. – С. 176–190.
8. Лескинен М.В. Этнокультурные стереотипы малорусов и белорусов в визуальных текстах российской культуры второй половины XIX века: проблемы интерпретации // Studia Slavica et Balcanica Petropolitana. – 2022. – № 2. – С. 15–34. DOI: https://doi.org/10.21638/spbu19.2022.202.
9. Вико Дж. Основания Новой науки: пер. с итал. – М.–К.: «REFL-book»–«ИСА», 1994. – 656 с.
10. Геллнер Э. Пришествие национализма. Мифы нации и классы // Нации и национализм. – М.: Праксис, 2002. – С. 146–200.
11. Левкиевская Е.Е. Этнокультурныя и языковой стереотип украинца в русском сознании // Украина и украинцы: Образы, представления, стереотипы. Русские и украинцы во взаимном общении и восприятии / Под. ред. Е.Ю. Борисенок, С.С. Лукашовой. – М., 2008. – С. 154–176.
12. Топорков А.Л. Теория мифа в русской филологической науке XIX века. – М.: «Индрик», 1997. – 456 с.
13. Древлянский. Белорусские народные предания // Прибавления к Журналу Министерства народного просвещения. – 1846. – Кн. 1. – С. 3–25.
14. Шпилевский П.М. Белоруссия в характеристических описаниях и фантастических поверьях // Пантеон. – 1853. – Т. VIII, кн. 4. – С. 71–96.
15. Топорков А.Л. О «Белорусских народных преданиях» и их авторе // Рукописи, которых не было: Подделки в области славянского фольклора. – М.: Ладомир, 2002. – С. 245–254.
16. Левкиевская Е.Е. Механизмы создания мифологических фантомов в «Белорусских народных преданиях» П. Древлянского // Рукописи, которых не было: Подделки в области славянского фольклора. – М.: Ладомир, 2002. – С. 311–351.
17. Киркор А. Этнографический взгляд на Виленскую губернию // Этнограф. сб. – СПб., 1858. – Вып. 3. – С. 115–276.
18. Кошман П.Р. Традыцыя літаратурнай міфатворчасці як аснова канструявання вобраза Беларусі ў навукова-папулярных нарысах П. Шпілеўскага // Веснік МДПУ імя І.П. Шамякіна. – 2014. – № 2. – С. 101–105.
19. Шпилевский П.М. Белоруссия в характеристических описаниях и фантастических поверьях // Пантеон. – 1854. – Т. XV, кн. 6. – С. 47–68.
20. Киркор А. Следы язычества в празднествах, обрядах и песнях // Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении / Под общ. ред. П.П. Семенова. – СПб., М., 1882. – Т. 3: Ч. 1. Литовское полесье; Ч. 2. Белорусское полесье. – С. 249–276.
21. Максимов С. Обитель и житель (Из очерков Белоруссии) // Древняя и новая Россия. – 1876. – Т. 2. – № 7. – С. 201–212.
22. Максимов С. Обитель и житель (Из очерков Белоруссии) // Древняя и новая Россия. – 1876. – Т. 2. – № 6. – С. 127–143.
23. Максимов С. Обитель и житель (Из очерков Белоруссии) // Древняя и новая Россия. – 1876. – Т. 2. – № 8. – С. 297–310.
24. Максимов С. Белорусская Смоленщина с соседями // Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении / Под общ. ред. П.П. Семенова. – СПб., М., 1882. – Т. 3: Ч. 1. Литовское полесье; Ч. 2. Белорусское полесье. – С. 430–472.
25. Носович И.И. Белорусские песни. – СПб.: Тип. Майкова, 1874. – 236 с.
26. Бобровский П. Можно-ли одно вероисповедание принять в основание племенного разграничения славян Западной России: (По поводу этнографического атласа западно-русских губерний и соседних областей Р.Ф. Эркерта). – СПб.: В Военной Тип., 1864. – 51 с.
27. Россия. Полное географическое описание нашего отечества. Настольная и дорожная книга для русских людей: т. 1–19 / под ред. В.П. Семенова; Под рук. П.П. Семенова и В.И. Ламанского. – СПб., 1899–1914. – Т. IX: Верхнее Поднепровье и Белоруссия: [Смоленская, Могилевская, Витебская и Минская губернии] / сост. В.П. Семенов, М.В. Довнар-Запольский, Д.З. Шендрик, А.К. Кабанов, А.И. Сапунов. – 1905. – 619 с.
28. Очерки Белоруссии. Историческое прошлое Белоруссии; настоящий быт белоруссов; нравы и обычаи белоруссов. – СПб.: Изд-е реда. народного журн. «Мирской вестник», 1876. – 40 с.
29. Малевич С. Белорусские народные песни // Сб. отд. русского языка и словесности Императорской Академии Наук. – 1907. – Т. LXXXII, № 5. – С. 1–194.
30. Эремич И. Очерки Белорусскаго Полесья // Вестник Западной России. – Вильна, 1867. – Т. 3, кн. VIII. – С. 107–133.
31. Булгаковский Д.Г. Пинчуки. Этнографический сборник. Песни, загадки, пословицы, обряды, приметы, предрассудки, поверья, суеверья и местный словарь. – СПб.: В Тип. В. Безобразова и Комп., 1890. – 200 с.
32. Kolberg O. Białoruś – Polesie. – Wrocław; Poznań: Polskie Towarzystwo Ludoznawcze, 1968 («Dzieła wszystkie»; t. 52). – 572 s.
33. Вида К. Этнические стереотипы в средневековой Европе, 950–1250 гг.; [пер. с англ. А. Инопиной]. – СПб.: Academic Studies Press / Библиороссика, 2024. – 396 с.
34. Kraszewski J. Wspomnienia Wołynia, Polesia i Litwy. – Wilno: Nakład i druk Glücksberga, 1840. – T. I. – 231 s.
35. Максимов С. Дремучие леса, или Рассказ о диких народах, населяющих русские леса. – СПб.: т-во «Обществ. польза», 1866. – 75 с.

36. Богданович А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белоруссов. Этнографический очерк. – Гродна: Губерн. Тип., 1895. – 186 с.
37. Максимов С.В. Очерки о белорусской земле. – М.: Индрик, 2018. – 576 с.

*Паступіў 01.12.2025*

# АРХАИЗАЦИЯ ОБРАЗА БЕЛОРУСОВ В ЭТНОГРАФИЧЕСКОЙ ЛИТЕРАТУРЕ XIX – НАЧАЛА XX ВЕКА

***канд. ист. наук, доц. Ю.И. ВНУКОВИЧ***
***(Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы Национальной академии наук Беларуси, Минск)***

*В статье рассматривается создание и конструирование образа древности белорусов в этнографической литературе XIX – начала XX века. Особое внимание уделяется формированию стереотипа о наличии «пережитков язычества» в народной культуре белорусов, на основании чего делались заключения не только об их исключительной архаичности и первобытности, но и сохранении ими дохристианских «древнеславянских черт». Научный вес этому нарративу придавала популярная энвайроментальная теория, когда природно-климатические условия всячески накладывались на физические и духовные характеристики белорусов (и в особенности полешуков). Относительно низкая мобильность населения Беларуси в этот исторический период также рассматривалась как свидетельство их прирожденного консерватизма и патриархальности. В свою очередь цивилизационная отсталость белорусов и их нахождение на «младенческой» стадии развития объяснялись не столько проживанием в неблагоприятных природно-климатических условиях, сколько длительной культурной изоляцией и исторической оторванностью от русских, а также угнетением со стороны поляков и евреев.*

***Ключевые слова:*** *белорусы, этнический образ, стереотипизация, архаизация, имагология, этнография, Российская империя.*

# ARCHAIZATION OF THE IMAGE OF BELARUSIANS IN THE ETHNOGRAPHIC LITERATURE OF THE 19TH – EARLY 20TH CENTURIES

***Yu. VNUKOVICH***
***(Center for Research of Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk)***

*The article examines the creation and construction of the image of Belarusian antiquity in the ethnographic literature of the 19th and early 20th centuries. Particular attention is paid to the formation of the stereotype regarding "remnants of paganism" in Belarusian folk culture, which served as a basis for conclusions not only about their exceptional archaism and primitivism but also about the preservation of pre-Christian "Old Slavic features." This narrative was reinforced by the popular environmental theory, according to which natural and climatic conditions were superimposed on the physical and spiritual characteristics of Belarusians (especially the Polesians). The relatively low mobility of the Belarusian population during this historical period was also viewed as evidence of their innate conservatism and patriarchy. In turn, the civilizational backwardness of Belarusians and their perceived "infantile" stage of development were attributed not only to unfavorable environmental conditions but also to prolonged cultural isolation, historical detachment from Russians, and oppression by Poles and Jews.*

***Keywords:*** *Belarusians, ethnic image, stereotyping, archaization, imagology, ethnography, Russian Empire.*

УДК 398(=161.3) DOI 10.52928/2070-1608-2026-77-1-79-87

# ЗЮЗЯ: ГІСТОРЫЯ СТВАРЭННЯ, РАЗВІЦЦЯ І ПЕРАВЫНАХОДНІЦТВА МІФАЛАГІЧНАГА ПЕРСАНАЖА

*К.Л. КОЗІЧАВА*
*(Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск)*
*ORCID: https://orcid.org/0009-0009-5000-2550*

*У артыкуле разглядаецца стварэнне і развіццё вобраза Зюзі – міфалагічнага персанажа, сканструяванага П. Шпілеўскім, – у межах "кабінетнай" міфалогіі XIX – пачатку XX ст., яго перапрацоўка і "легалізацыя" ў беларускай навуцы канца XX – пачатку XXI ст; аналізуецца працэс перавынаходніцтва гэтага міфалагічнага персанажа ў першай чвэрці XXI ст.: з'яўленне шматлікіх і разнастайных візуальных адлюстраванняў Зюзі, а таксама выкарыстанне вобразаў Зюзі ў сферах турызму і культурнага брэндзінгу асобных рэгіёнаў Беларусі.*

**Ключавыя словы:** *Зюзя, міфалогія, міфалагічны вобраз, перавынаходніцтва традыцыі, культурны брэндзінг.*

**Уводзіны.** Зюзя на сённяшні момант з'яўляецца адным з найбольш вядомых беларускіх міфалагічных персанажаў у медыяпрасторы, выступаючы ў якасці аўтэнтычнай версіі Дзеда Мароза, аднак гісторыя і сучаснасць яго вобраза застаюцца па-за належнай увагай беларускіх фалькларыстаў і этнографаў. Тым часам вобраз Зюзі ўяўляе сабой выдатны прыклад вынаходніцтва і перавынаходніцтва традыцыі: ён быў створаны нашмат раней за Дзеда Мароза і выконваў зусім іншыя функцыі, пакуль не быў прыстасаваны да забаўляння публікі.

Айчынныя даследчыкі міфалогіі звычайна абмяжоўваліся ўскоснымі згадкамі пра Зюзю (А. Гулак [1]), агульнай характарыстыкай яго вобраза (У. Васілевіч [2], Э. Зайкоўскі, С. Санько [3]), спробамі вызначыць этымалогію яго імя (Э. Зайкоўскі, С. Санько [3]). Асобна можна вылучыць аўтараў, якія прыводзілі выпадак Зюзі Паазерскага ў якасці аднаго з прыкладаў беларускіх культурных брэндаў (Т. Валодзіна [4], І. Алюніна [5]). Расійскія і ўкраінскія навукоўцы таксама задавольваліся пераважна згадкамі Зюзі (А. Грушко, Ю. Мядзведзеў [6]), В. Вайтовіч [7], Л. Вінаградава [8]), і толькі расійская даследчыца А. Леўкіеўская [9] упершыню крытычна і дэталёва разгледзела гэтага персанажа беларускай міфалогіі і выкрыла яго штучнасць, а расійскія ж навукоўцы А. Беразовіч і А. Сурыкава [10] перагледзелі этымалогію яго наймення.

Аднак, нягледзячы на вялікі аб'ём разрозненай інфармацыі пра гэтага персанажа, ніхто дагэтуль не рабіў спробаў прасачыць змены ў вобразе Зюзі на ўсім працягу яго існавання. Такім чынам, мэта гэтага артыкула – ахарактарызаваць развіццё вобраза Зюзі ад яго фармальнага стварэння да сучаснасці. Аб'ектам даследавання з'яўляецца Зюзя як вынайдзены міфалагічны персанаж, прадметам – асаблівасці развіцця яго вобраза.

**Вынаходніцтва Зюзі. Складнікі яго вобраза.** Упершыню вобраз Зюзі з'явіўся ў артыкуле[1] П. Шпілеўскага (псеўданім – П. Драўлянскі) у 1846 г. разам з вобразамі іншых міфалагічных персанажаў, якія аўтар нібыта зафіксаваў падчас сваіх падарожжаў па Беларусі. Непрыхаванай мэтай працы П. Шпілеўскага было паказаць адукаванаму грамадству Расійскай імперыі, што менавіта ў Беларусі старажытная вера славян захавалася найлепш [11, с. 256]. Каб даказаць сваю гіпотэзу, П. Шпілеўскі, робячы выгляд, што ён толькі крыху ўпарадкаваў існуючыя "предания Белорусцев", упрыгожаныя "поэтическими рассказами", сканструяваў у сваёй працы паўнавартасны пантэон, часткай якога ў якасці боства зімовага сезону і стаў Зюзя.

Аўтар зрабіў наступнае яго апісанне: "*Зюзя* – бог зимы. *Зюзя* происходит от глагола *зюзець*, мерзнуть, колеть от мороза; отсюда, *Зюзя* значит собственно – *мерзнущий* и *морозящий*. Вот каким представляют Зюзю Белорусцы: он, говорят, старичок с *седыми*[2] волосами на голове и такою же предлинною бородою; низенького роста, толстый; весь в белой теплой одежде; ноги у него босы; голова ничем не покрыта; в руке носит железную булаву. Зюзя, говорят Белорусцы, большую часть зимы проводит в лесе в разных местах. Иногда он заходит в деревню по разным причинам: или для того, чтобы предуведомить поселян о жестокой, суровой зиме на будущий год, или для того, чтоб оказать какую-нибудь помощь кому-либо; например, освободить от холода несчастное бедное семейство или (как выражаются Белорусцы) просто для того, чтобы *кутьи паесьци* (кутьи покушать). Вот что значит это выражение. В Белоруссии есть поверье, будто самый сильный, жестокий мороз бывает накануне Нового Года; но от Зюзи зависит, причинить или не причинить вред этим морозом. Чтоб как-нибудь умилостивить Зюзю, Белорусцы накануне Нового Года, приготовляя, по принятому обыкновению[3], *кутью*, откладывают часть ее в особую тарелку (или, лучше, – миску) и оставляют ее на ночь на особом столе: кутья остается цела, но общее поверье говорит, что ее съедает Зюзя. Довольно любопытно Белорусцы объясняют, для чего Зюзя носит булаву в руке. Говорят, будто Зюзя, рассердившись на людей, обыкновенно ударяет своею

[1] Далей праца П. Шпілеўскага, якая выйшла ў трох артыкулах пад рознымі назвамі, будзе падавацца як "Беларускія народныя паданні".
[2] "Белорусцы говорят – просто с *белыми* волосами, как снег" (заўвага П. Шпілеўскага).
[3] "*Кутья* в это время ставится на столе, устланном сеном" (заўвага П. Шпілеўскага).

булавою в какой-нибудь пень, и этим сильным ударом производит такой переворот, такую ломку по всей земле, что земля, а иногда и дома, трескаются… [11, с. 274–275].

Штучнасць некаторых персанажаў “Беларускіх народных паданняў”, у тым ліку Зюзі, на дадзены момант лічыцца даказанай. Расійская даследчыца А. Леўкіеўская прааналізавала ўсіх персанажаў з азначанай працы П. Шпілеўскага і размеркавала па групах у залежнасці ад ступені іх фантомнасці. Зюзя быў аднесены да тых персанажаў, што ўяўляюць “мифологические фантомы, названиями для которых служат имена нарицательные, действительно имеющиеся в белорусском языке и его говорах, но не несущие в себе никакого мифологического смысла”, якіх збіральнік надзяліў “образами, скомпилированными из реальных и вымышленных мотивов и функций” [9, с. 318–319]. Да рэальнаых матываў у вобразе Зюзі можна аднесці запрашэнне на куццю і сталы ўзрост, уласцівыя аўтэнтычнай персаніфікацыі мароза. У беларусаў, як і ў іншых еўрапейскіх народаў, існаваў абрад запрашэння на куццю міфалагічных персанажаў, продкаў і прыродных стыхій. На большай частцы тэрыторыі Беларусі клікалі менавіта мароз [12, с. 466], пры гэтым у некаторых варыянтах абрада пераапрануты чалавек ад імя мароза адклікаўся на запрашэнне [12, с. 471]. У народных казках мароз мог ці мець асобныя прыкметы персаніфікацыі – хадзіць, лятаць, размаўляць, штосьці дараваць [13, с. 427], мець косці [14, с. 69], – ці наўпрост выглядаць, як стары чалавек [15, с. 591]. Да выдуманага ў вобразе Зюзі можна аднесці падрабязнае апісанне яго знешняга выгляду і дзейнасці, што з’явілася, дзякуючы тагачасным уяўленням пра тое, якім міфалагічны персанаж павінен быць – суб’ектам, надзеленым усімі атрыбутамі суб’ектнасці: знешнасцю, вопраткай, асаблівасцямі характару, адпаведнымі паводзінамі [9, с. 314].

З імем новаўтворанага персанажа сітуацыя больш складаная. Лексема *зюзя* (“мароз, холад”) сапраўды існуе і нават утрымлівае некаторыя тэндэнцыі да персаніфікацыі, але выкарыстоўваецца толькі пры размове дарослых з дзецьмі [9, с. 341]. Разабрацца ў паходжанні гэтага слова спрабавалі Э. Зайкоўскі і С. Санько, якія звязвалі лексему *зюзя* з дзеясловамі *зюзець*, *азызнуць* (“мерзнуць”) і лічылі яе блізкай да лексемы *жыжа* (“агонь”). У аснове семантыкі абедзвюх лексем, на думку аўтараў, ляжыць сема “быць пякучым” [3, с. 198]. Пазней расійскія даследчыкі А. Беразовіч і А. Сурыкава прыйшлі да высновы, што лексема *зюзя* ўтварылася ад гукапераймальнага *з-з-з*, якое імітуе дрыжыкі ад холаду [10, с. 254].

Гледзячы на далейшы шлях развіцця вобраза Зюзі, можна сцвярджаць, што ён атрымаўся адным з найбольш удалых стварэнняў П. Шпілеўскага: Зюзя пазбег крытыкі, якая абрынулася на самога аўтара і некаторых іншых яго персанажаў і пачаў вандраваць па працах “кабінетных” даследчыкаў, набываючы і губляючы асобныя рысы. Яго вобраз непарыўна развіваўся аж да пачатку XX ст., калі ён быў фактычна забыты з прычыны агульнай страты грамадскай цікавасці да міфалогіі, але пазней – у канцы XX ст. – з’явіўся зноў: спачатку ў літаратуры, а пасля і ў іншых сферах дзейнасці.

**Развіццё вобраза Зюзі ў перыяд з 1846 года да пачатку XX ст.** Праца П. Шпілеўскага стала даволі ўплывовай шмат у чым дзякуючы А. Афанасьеву, які яе заўважыў. Ён шырока цытаваў “Беларускія народныя паданні” пры напісанні "Поэтических воззрений славян на природу” (1865–1869 гг.), дзе ілюстраваў свае тэарэтычныя разважанні шматлікімі прыкладамі з міфалогій розных народаў. Сярод іншага, А. Афанасьеў разважаў пра тое, што славяне бачылі ў працэсе перамены сезонаў года барацьбу персаніфікаваных света і цемры, цяпла і холада. Зюзю ён выкарыстаў у якасці “наглядного олицетворения” зімы ў беларусаў. Яго апісанне А. Афанасьеў запазычыў з “Беларускіх народных паданняў” з некаторымі недакладнасцямі: Зюзя ў яго перастаў быць тоўстым і страціў звычку папярэджваць сялян пра суровыя зімы і ратаваць бедныя сем’і ад маразоў [16, с. 681]. Невядома, ці наўмысна аўтар пазбавіў Зюзю дабрадзейнасці, але больш злосны Зюзя лепш пасаваў да яго разважанняў наконт адвечнай барацьбы прыродных сіл. Хоць непасрэдна Зюзя ў А. Афанасьева ні з кім не змагаўся, кантэкст, у якім ён быў згаданы, прадвырашыў далейшы крок у развіцці і разуменні яго вобраза.

Тэарэтычныя выкладкі А. Афанасьева і пантэон П. Шпілеўскага былі творча перапрацаваныя і па-мастацку аб’яднаныя ў адзіны міф А. Кіркорам у маштабным навукова-папулярным выданні “Живописная Россия” (1882 г.). Мэтай аўтара, як раней П. Шпілеўскага, было пераканаць чытачоў у выключнай старажытнасці беларускай міфалогіі, прадэманстраваўшы насычанасць каляндарнага цыклу беларусаў святамі і абрадамі з глыбінным сэнсам [17, с. 251]. Пры апісанні Калядаў і тлумачэнні сэнсу гэтага свята А. Кіркор зрабіў акцэнт на матыве барацьбы ўвасобленых святла і цемры. Святлом (як і ў А. Афанасьева) выступіў Пярун, а цемрай, зімой і смерцю аўтар зрабіў Зюзю. А. Кіркор наўпрост назваў Зюзю Сіцівратам, або Карачуном, падземным царом і валадаром марозаў [17, с. 252], фігурай, якая замясціла для беларусаў Чарнабога [17, с. 252, с. 273], то бок галоўным злым боствам. Зюзя, які ў П. Шпілеўскага і А. Афанасьева быў персанажам адасобленым, у А. Кіркора займеў брата-ворага Перуна [17, с. 251] і жонку Марану (смерць) [18, с. 354]. У дзень зімовага сонцавароту Зюзя, згодна з тлумачэннямі аўтара, ператвараўся ў мядзведзя, ачаляў зграю ваўкоў (ваўкі = завеі) і ганяўся за цяжарнай жонкай Перуна Грамаўніцай (Калядой), каб не даць ёй нарадзіць сонейка-Дажбога [17, с. 252].

Побач з сюжэтам барацьбы Зюзі і Перуна А. Кіркор размясціў апісанне Зюзі, пераказанае ўласнымі словамі і ўзятае, хутчэй за ўсё, з А. Афанасьева, бо ў А. Кіркора Зюзя таксама не тоўсты і не ратуе сем’і ад маразоў. Да таго ж Зюзя ў А. Кіркора “страціў” свой маленькі рост. Аднак аўтар убудаваў у апісанне гэтага персанажа новы спосаб частавання: “Чтобы его задобрить… ему оставляютъ кутьи, а еще чаще хозяинъ первую ложку кутьи бросаетъ за окно, приговаривая: “морозъ, ходзи куцью ѣсци”. Особенно наканунѣ Новаго года ему откладываютъ кутьи въ особую миску и оставляютъ ее на ночь на столѣ, увѣряя, что Зюзя придетъ «куцьи поѣсць»” [17, с. 253]. Далей пры апісанні першай куцці А. Кіркор дадаў яшчэ адзін спосаб кармлення Зюзі: “… какъ уже упомянуто,

бросаетъ ложку кутьи въ уголъ (кутъ) Зюзѣ, или оставляетъ для него въ мисѣ" [17, с. 254]. З абодвух згаданых урыўкаў вынікае, што Зюзю запрашаюць і на першую куццю, і на Новы год, і ёсць тры спосабы яго пачаставаць. Паколькі ў папярэднікаў А. Кіркора гаворка йшла толькі пра Новы год і пакіданне Зюзе куцці ў місе, існуе верагоднасць, што адзначаная варыятыўнасць з'яўляецца адлюстраваннем аўтэнтычных абрадаў запрашэння мароза.

Пазней Зюзя згадваўся яшчэ ў А. Шыманоўскага ў працы "Минская губерния и её народное творчество в связи с описанием народных праздников и обрядов" (1898 г.). Гэтая праца не была апублікавана і доўгі час яе ведалі толькі па кароткім пераказе ў Дз. Зяленіна (1915 г.) [19, с. 687–694]. А. Шыманоўскі быў апошнім, хто развіваў вобраз Зюзі перад яго часовым адыходам у небыццё. Ён пісаў, абапіраючыся на тэкст А. Кіркора, што бачна нават па асобных сказах, але пры гэтым унёс у вобраз Зюзі значныя змены. Зюзя ў А. Шыманоўскага, як і ў А. Кіркора, бог зімы, падземны цар, валадар марозаў[4] і вораг Перуна ў сюжэце адвечнай барацьбы зла і дабра, святла і цемры, цяпла і холада. Але ў А. Шыманоўскага няма згадкі пра сваяцкія сувязі Зюзі з Перуном і Маранай, да таго ж ягоны Зюзя можа ператварацца не толькі ў мядзведзя: "… оборачивается, переряживается въ цѣлую стаю волковъ (мятели), въ козу – существо оплодотворяющее, въ медвѣдя, который в день солноворота (на Каляду) переворачивается съ одного бока на другой, въ дятла и проч…"[5]. Імаверна, апошні пасаж з'яўляецца вынікам перапрацоўкі ўласных назіранняў аўтара (пра Каляды ён пісаў, што "… другіе дѣлаютъ приготовленія для ряженія козой, дятломъ, медвѣдемъ и пр."[6]) і разважанняў А. Кіркора пра адлюстраванне вобразаў старажытнага міфа ў масках калядоўшчыкаў (мядзведзь – Зюзя, каза – Грамаўніца) і Зюзю на чале ваўчынай зграі. А. Шыманоўскі вырашыў адмовіцца ад варыятыўнасці А. Кіркора адносна часу запрашэння бога зімы на куццю і спосабаў яго частавання і ўзяў для сваёй працы толькі апісанне першай куцці з кіданнем Зюзе куцці ў кут ці пакіданнем у місе[7]. Апісанне самога Зюзі, куды А. Кіркор убудаваў кіданне куцці за акно і дзе ўсе папярэднікі А. Шыманоўскага згадвалі частаванне Зюзі на Новы год, аўтар выкарыстоўваць не стаў і, такім чынам, наўмысна ці не, пазбавіў гэтага персанажа чалавечай знешнасці.

Адрэзак часу ад 1846 г. да пачатку XX ст. можна ахарактаразаваць як перыяд развіцця вобраза Зюзі выключна на старонках нешматлікай навукова-папулярнай літаратуры. Асноўным напрамкам яго развіцця была паступовая страта Зюзям чалавечых рыс. Па-першае, у плане знешнасці: А. Афанасьеў пазбавіў Зюзю тлустасці, А. Кіркор пазбавіў яго маленькага росту і надзяліў здольнасцю ператварацца ў мядзведзя, А. Шыманоўскі цалкам адмовіў Зюзе ў чалавечай знешнасці, але надаў яму больш варыянтных жывёльных форм для ператварэнняў. Па-другое, у плане маральных характарыстык: у А. Афанасьева Зюзя проста перастаў ратаваць сем'і ад маразоў, а ўжо ў А. Кіркора ён стаў галоўным міфалагічным злом, і А. Шыманоўскі зацвердзіў яго ў гэтай іпастасі. Сталай рысай заставалася толькі дамоваздольнасць Зюзі, хоць час, калі трэба было залагоджваць яго ежай, змясціўся з Новага года на першую куццю, а спосабаў частавання стала больш. Калі падсумаваць, Зюзя з даволі чалавечнага бога зімы, якім яго стварыў П. Шпілеўскі, ператварыўся ў злую сілу, якая можа прымаць розны выгляд.

**Вобраз Зюзі ў беларускай навуцы канца XX – пачатку XXI ст.** Падчас адраджэння цікавасці да беларускай міфалогіі ў канцы XX – пачатку XXI ст. Зюзя зноў з'явіўся на старонках навуковай і навукова-папулярнай літаратуры дзякуючы даследчыкам-фалькларыстам, якія сістэматызавалі і выдавалі назапашаныя крыніцы па беларускай міфалогіі, звяртаючыся, у тым ліку, і да класічных этнаграфічных прац XIX ст.

У фундаментальнай энцыклапедыі "Этнаграфія Беларусі" (1989 г.) адзначалася: "**ЗЮЗЯ**, персанаж беларускай міфалогіі, увасабленне холаду. Зюзю ўяўлялі ў выглядзе лысага барадатага дзеда, які ў расхрыстаным кажусе, босым хадзіў па снезе. Паводле павер'яў Зюзя ўзнімаў завіруху, мяцеліцу, выклікаў сцюжу. Калі быў моцны мароз, лічылі, што Зюзя біў доўбняй па дрэвах і бярвенні, якія быццам бы па гэтай прычыне трашчалі. Прымхлівыя людзі верылі, што калі пералічыць імёны ўсіх лысых дзядоў у вёсцы, мароз памякчэе. У размовах з дзецьмі дарослыя часам называюць холад «зюзя»" [20, с. 216].

Зюзя ніколі раней не лічыўся лысым і расхрыстаным; павер'е пра пералік лысых для суцішэння маразоў слушнае з пункту гледжання аўтэнтычнасці [21, с. 268], але менавіта з Зюзям ніколі не звязвалася. У той жа час тут не згаданы абрад запрашэння на куццю, які нязменна пераходзіў з аднаго апісання Зюзі ў іншае. Невядомыя ні аўтар артыкула, ні крыніцы, на падставе якіх ён быў напісаны.

У 1994 г. выйшла літаратурна-мастацкая праца фалькларыста У. Васілевіча "Міфы бацькаўшчыны". Гэтае выданне было першай у незалежнай Беларусі спробай стварыць збор персанажаў беларускай міфалогіі. У ім У. Васілевіч не склаў свайго тэксту, а абмежаваўся вытрымкамі з "цяжкадаступных сённяшняму чытачу зборнікаў, артыкулаў, нарысаў, архіўных запісаў" [2, с. 4] даследчыкаў, якія раней пісалі пра беларускіх міфалагічных персанажаў. Фактычна, ён стварыў уласны беларускі пантэон, абапіраючыся на аўтарытэт папярэднікаў. Зюзя тут прадстаўлены выключна вытрымкай з "Беларускіх народных паданняў", перакладзенай на беларускую мову і нязначна скарочанай.

У 2004 г. выйшаў энцыклапедычны слоўнік "Беларуская міфалогія", дзе быў прысвечаны Зюзе артыкул аўтарства Э. Зайкоўскага і С. Санько. Ён змяшчаў зборны вобраз гэтага міфалагічнага персанажа: поўнае апісанне знешнасці Зюзі, згадку пра пакіданне ці кіданне яму за акно каляднай куцці, сюжэт пра яго змаганне з Перуном,

---

[4] Архіў Рускага геаграфічнага таварыства (АРГТ). – Ф. 20. Воп. 1. Спр. 8. Арк. 169.
[5] АРГТ. – Ф. 20. Воп. 1. Спр. 8. Арк. 169-170.
[6] АРГТ. – Ф. 20. Воп. 1. Спр. 8. Арк. 147
[7] АРГТ. – Ф. 20. Воп. 1. Спр. 8. Арк. 148-149.

павер’е пра пералік лысых для суцішэння маразоў. Аўтары ўключылі і тое, чаго не было раней: атаясамленне Зюзі са Святым Мікалаем і, праз яго вобраз, з Вялесам; чырвоны нос Зюзі, да якога, быццам, падобныя насы п’яніц; тлумачэнне семантыкі яго імя (пры гэтым згадкі пра лексему “зюзя” як слова з “дзіцячай” мовы не было). Дабрадзейнасць у “слоўнікавага” Зюзі адсутнічала, бо пасаж пра ратаванне сем’яў ад маразоў тут быў апушчаны, але і з падземным царом Карачуном яго размежавалі – гэтыя персанажы выглядаюць як узаемазамяняльныя ў сюжэце барацьбы з Перуном [3, с. 198].

У такім выглядзе артыкул пра Зюзю перажыў яшчэ два перавыданні слоўніка ў 2006 і 2011 гг. Нягледзячы на тое, што праца А. Леўкіеўскай з крытычным разборам персанажаў “Беларускіх народных паданняў” выйшла яшчэ ў 2002 г., яна была ўлічана толькі ў трэцім выданні слоўніка. У прадмове да выдання 2011 г. былі зроблены некаторыя тлумачэнні [22, с. 9], але ўсе спрэчныя персанажы захавалі свае месцы на слоўнікавых старонках, у шэрагу выпадкаў з агаворкамі. Далей спецыяльных навуковых публікацый, прысвечаных Зюзе, у беларускай фалькларыстыцы больш не было.

У выданнях канца XX – пачатку XXI ст. заўважна не столькі развіццё вобраза Зюзі, колькі яго “дапрацоўка”; выкарыстанне рознымі даследчыкамі несупадаючых колаў крыніц; агульнае ігнараванне сумнеўнай аўтэнтычнасці гэтага міфалагічнага персанажа. Галоўным вынікам разгледжанага перыяда стала фармальная “легалізацыя” Зюзі ў якасці беларускага міфалагічнага персанажа намаганнямі розных аўтараў. У гэтым сэнсе даследчыкі канца XX – пачатку XXI ст. былі ўдзячнымі нашчадкамі аўтараў XIX ст., якія развівалі вобраз Зюзі, працуючы на стыку тагачаснай навукі і міфатворчасці. Аднак пасля “легалізацыі” Зюзі вучоныя страцілі да яго цікавасць і далейшая рэканструкцыя яго вобраза ў навуковай і навукова-папулярнай літаратуры прыпынілася.

**Перавынаходніцтва вобраза Зюзі ў першай чвэрці XXI ст.** На пачатку XXI стагоддзя з ростам запыту на міфалогію і развіццём медыя для Зюзі наступіў паваротны момант: ён стаў вядомы шырокаму колу прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці, кожны з якіх атрымаў магчымасць узяць з вобраза тое, што патрэбна менавіта яму, і скарыстаць гэта ў сваіх мэтах. Так Зюзя перастаў быць выключна літаратурным персанажам, займеў шмат новых кропак для далейшага развіцця і разнастайныя візуальныя адлюстраванні (малюнак 1). Яны не заўсёды суадносяцца з апісаннямі Зюзі ў літаратурных крыніцах ці нават утрымліваюць антрапаморфную фігуру, але нязменна, хоць і не абавязкова відавочна, звязаныя з зімовым сезонам: нішто на лагатыпе брэнда світараў (гл. малюнак 1) не нагадвае пра зіму, але самі світары – цёплае адзенне, якое носяць зімой.




**лагатып кірмаша “Зюзя”**[8]




**лагатып брэнда світараў**[9]



**кніжная ілюстрацыя, В. Славук** [23, с. 17]

**Малюнак 1. – Візуальныя адлюстраванні Зюзі**

[8] URL: https://www.instagram.com/zuzya.by/
[9] URL: https://www.instagram.com/zuza.wear/

Наасобку стаяць тэатралізаваныя ўвасабленні Зюзі, якія пачалі ўзнікаць падчас калядных і навагодніх святаў[10]. Першае з іх, Зюзя Паазерскі, пачало сваю дзейнасць узімку 2004–2005 гг.[11] недалёка ад вёскі Пруднікі Пастаўскага раёна. У 2007 г. ён пераехаў пад вёску Азяркі таго ж раёна. Турыстычная праграма з удзелам Зюзі адразу набыла папулярнасць[12], якая ў наступныя гады толькі ўзрастала[13].

Следам за Зюзям Паазерскім у розных мясцінах Беларусі сталі з'яўляцца іншыя тэатралізаваныя ўвасабленні Зюзі. Прыкладная храналогія і геаграфія іх з'яўлення паводле знойдзеных у Інтэрнэт-крыніцах згадак наступная:

студзень 2007 г. – Зюзя ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту[14];

снежань 2016 г. – Зюзя ў АТК "Каробчыцы"[15] (спыніў дзейнасць);

канец 2018 г. – Бераст-Зюзя ў Бераставіцкім раёне[16];

снежань 2022 г. – Зюзя Палескі ў Нацыянальным парку "Прыпяцкі"[17];

снежань 2024 г. – Зюзя ў парку "Сула"[18]; Зюзя ў ГЗЦ "Galleria" у Мінску[19]; Зюзя ў коннай сядзібе "Буцэвічы" пад Мінскам[20].

Большасць з гэтых увасабленняў Зюзі былі распрацаваны ў межах турыстычна-забаўляльных і святочна-тэатралізаваных праграм для таго, каб заняць месца Дзеда Мароза, то бок, стаць галоўнымі станоўчымі фігурамі святкавання[21]. Нават не ўдаючыся ў асобныя дэталі анімацыйных праграм, якія змяняюцца год ад году, можна зрабіць выснову, што тэатралізаваныя ўвасабленні Зюзі маюць няшмат агульнага з яго "кніжнымі" вобразамі: у разгледжанай вышэй навуковай і навукова-папулярнай літаратуры Зюзя часцей апісваўся як у той ці іншай ступені адмоўны персанаж, асноўная мадэль камунікацыі з якім – залагоджванне яго куццёй.

Тут варта ўзгадаць, што арыгінальны Зюзя, створаны П. Шпілеўскім, не быў адназначна адмоўным персанажам: ён мог змарозіць, а мог выйсці да людзей, каб папярэдзіць іх пра халады ці ўратаваць ад маразоў. У працах паслядоўнікаў П. Шпілеўскага гэтая добразычлівасць не атрымала развіцця, наадварот, ад аўтара да аўтара Зюзя выглядаў усё больш пагрозлівым, але яго сучасныя тэатралізаваныя ўвасабленні, адказваючы на зацікаўленасць грамадства ў беларускім адпаведніку "добрага" Дзеда Мароза, з'яўляюцца вынікам развіцця тых пазітыўных рысаў, што былі закладзены у вобраз Зюзі ад самага пачатку.

Аднак вырашальнай для фарміравання пазітыўных вобразаў Зюзі падаецца сама традыцыя святкавання Новага года, якая вымагае наяўнасці менавіта добрага чараўніка ў якасці галоўнай фігуры: поўная замена станоўчай фігуры на адмоўную ў межах традыцыйнага святкавання Новага года была б немагчымай без змены самой сутнасці свята. Адзіны злодзей сярод згаданых вышэй увасабленняў Зюзі, Зюзя з Каробчыцаў, не замяняў Дзеда Мароза; Дзед Мароз у дадзенай анімацыйнай праграме выступаў у сваёй традыцыйнай ролі.

Уплыў Дзеда Мароза праглядаецца і ў знешнім выглядзе некаторых увасабленняў Зюзі, аднак адзінства тут няма: знешнасць Зюзяў шырока вар'іруе ад зробленых на падставе літаратурных апісанняў гэтага персанажа да пераймання пазнавальнага выгляду Дзеда Мароза (малюнкі 2–5).

Менавіта тэатралізаваныя ўвасабленні Зюзі паклалі пачатак выкарыстанню гэтага персанажа ў яшчэ адной, новай для яго, сферы: Зюзя Паазерскі, Бераст-Зюзя і Зюзя Палескі зрабілі крокі ў бок станаўлення тэрытарыяльнымі брэндамі, што адлюстроўваецца ў іх імёнах. Так, стваральнікі Зюзі Палескага з Нацыянальнага парка "Прыпяцкі" заявілі, што ў Зюзю верылі пераважна на Палессі[22]. У Бераставіцкім раёне пасля спынення дзейнасці Зюзі з Каробчыцаў вырашылі "сам персонаж сделать традиционным для своего региона. ... Дедов Морозов и так хватает, а вот Берест-Зюзя – один такой на всю Гродненскую область"[23]. Найбольш паспяховым падаецца праект Зюзі Паазерскага: Я. Шушкевіч, яго стваральнік, запэўніваў, што Зюзя як міфалагічны персанаж невядомы больш нідзе, акрамя некалькіх раёнаў Паўночнай Беларусі[24], а СМІ неаднаразова называлі яго брэндам Пастаўшчыны[25].

---

[10] Выпадкі дзейнасці ўвасабленняў Зюзі па-за навагоднімі і калstriднымі святамі, гл. URL: https://www.holiday.by/blog/502; URL: https://people.onliner.by/2015/01/17/turizm-5.

[11] URL: https://vitvesti.by/person/iak-zhykharu-pasta-skaga-raena-zhylosia-u-rol-ziuz-paazerskaga.html; URL: https://kraj.by/news/sobitiya/zyuzya-poozerskiy-prosipaetsya.

[12] URL: https://www.tio.by/info/newspaper/7815/

[13] URL: https://kraj.by/news/sobitiya/zyuzya-poozerskiy-prosipaetsya; URL: https://www.tio.by/info/newspaper/7815/

[14] URL: https://www.sb.by/articles/romashki-pod-solomennoy-kryshey.html

[15] URL: https://belta.by/regions/view/bog-zimy-zjuzja-poselitsja-v-agroturisticheskom-komplekse-pod-grodno-16-dekabrja-220457-2016/

[16] URL: https://zviazda.by/ru/news/20191227/1577431167-v-berestovickom-rayone-vtoroy-god-rabotaet-rezidenciya-belorusskogo

[17] URL: https://www.npp.by/news/2022/v-gostyakh-u-polesskogo-zyuzi/

[18] URL: https://www.instagram.com/p/DDEY0djO2s4/

[19] URL: https://www.instagram.com/p/DDuUwWvM7ag/

[20] URL: https://www.instagram.com/p/DDmO7emu5uF/

[21] Існавалі выключэнні: Зюзя з парка "Сула" быў толькі адным з шэрагу калядных персанажаў, а галоўнай фігурай быў Святы Мікалай ці Дзед Мароз. Зюзя з Каробчыцаў увогуле выступаў галоўным злодзеем, якога дзеці павінны былі перамагчы перад тым, як атрымаць падарункі ад Дзеда Мароза, гл. URL: https://vgr.by/2017/01/08/pobedili-zyuzyu-spasli-kolyadu-i-poluchili-podarki-detskie-zhelaniya-sbyvalis-v-majontke-korobchitsy/

[22] URL: https://www.npp.by/news/2022/v-gostyakh-u-polesskogo-zyuzi/

[23] URL: https://zviazda.by/ru/news/20191227/1577431167-v-berestovickom-rayone-vtoroy-god-rabotaet-rezidenciya-belorusskogo

[24] URL: https://www.tio.by/info/newspaper/7815/

[25] URL: https://people.onliner.by/2015/01/17/turizm-5; URL: https://www.postawy.by/2022/04/spustya-10-let-proslavlennyj-postavskij-personazh-zjuzya-poozerskij-snova-primet-gostej-v-ozerkah/




**Малюнак 2. – Зюзя Паазерскі**[26]



**Малюнак 3. – Зюзя Палескі і яго Унучка**[27]

[26] URL: https://www.sb.by/articles/rabotat-volshebnikom.html
[27] URL: https://berezino.by/ru/novosti/kultura/item/33977-polesskij-zyuzya-otkroet-novogodnij-sezon-v-safari-parke-natsparka-pripyatskij-14-dekabrya



**Малюнак 4. – Зюзя з Каробчыцаў, фотаздымак С. Людкевіча**[28]



**Малюнак 5. – Бераст-Зюзя і Спадарыня Завея, фотаздымак С. Ганчаровай**[29]

Прывязка Зюзі да пэўнага рэгіёна Беларусі – цалкам сучасная з'ява: ніхто з вышэйзгаданых аўтараў-апісальнікаў Зюзі не прымяркоўваў гэтага персанажа да асобнай мясцовасці, нават А. Шыманоўскі, які прысвяціў сваю працу Мінскай губерні, не сцвярджаў, што Зюзю ведалі толькі тут. Выпадак Зюзі ў гэтым сэнсе не ўнікальны: ён у поўнай меры адпавядае сусветнай тэндэнцыі звяртання да фальклярызму і народнай спадчыны пры распрацоўцы стратэгіі развіцця тэрыторый. Але цікавай падаецца адсутнасць выразнай канкурэнцыі паміж рознымі рэгіёнамі краіны за выключнае права прысвоіць Зюзю сабе. Можна дапусціць, што на такую сітуацыю

[28] URL: https://vgr.by/2017/01/08/pobedili-zyuzyu-spasli-kolyadu-i-poluchili-podarki-detskie-zhelaniya-sbyvalis-v-majontke-korobchitsy/
[29] URL: https://www.beresta.by/wp-content/uploads/2019/12/IMG_2071.jpg

паўплывалі разам адсутнасць адпаведных падстаў у крыніцах і каляндарная прывязка Зюзі да калядных і навагодніх святаў, якія шырока адзначаюцца па ўсёй Беларусі.

Разгледжаныя ў гэтым раздзеле вобразы Зюзі, не зважаючы на цеснасць іх сувязі з літаратурнымі крыніцамі, функцыянуюць у абставінах і выконваюць ролі, якія не былі прадугледжаны для Зюзі стваральнікам і яго паслядоўнікамі, і з гэтай прычыны з’яўляюцца выразнымі прыкладамі перавынаходніцтва традыцыі. Больш за тое, менавіта ў сучаснасці, дзякуючы павелічэнню папулярнасці Зюзі сярод значнай колькасці людзей, ён пачынае станавіцца сапраўды вядомым персанажам для беларусаў. Не будзе перабольшваннем сцвярджаць, што пры пэўных абставінах Зюзя мае ўсе шанцы стаць адным з найбольш пазнавальных агульнанацыянальных міфалагічных брэндаў.

**Заключэнне.** Зюзя быў створаны як бог зімы ў штучным пантэоне П. Шпілеўскага, прызваным зацвердзіць беларускія землі ў якасці цэнтра тэрыторыі старажытных славян. Яго вобраз, сканструяваны на аснове аўтэнтычнай персаніфікацыі мароза з дадаткам выдуманых дэталяў знешнасці і асаблівасцей паводзін, быў ад пачатку даволі чалавечным – ва ўсіх сэнсах, – але, развіваючыся ў межах беларускай “кабінетнай” міфалогіі, паступова губляў і асаблівасці знешнасці, і станоўчыя рысы характару, пакуль не ператварыўся ў злую сілу, якая можа прымаць розныя формы. У пачатку XX ст. развіццё вобраза Зюзі прыпынілася з-за сацыяльна-палітычных змен у грамадстве, якія пацягнулі агульную страту цікавасці да міфалогіі.

У канцы XX – пачатку XXI ст., падчас абуджэння інтарэса да міфалогіі, вобраз Зюзі быў вернуты з небыцця і легалізаваны навукоўцамі ў якасці беларускага міфалагічнага персанажа, а прадстаўнікі іншых сфер грамадства атрымалі магчымасць пазнаёміцца з ім і скарыстаць у перапрацаваным пад свае патрэбы выглядзе. Адбылося перавынаходніцтва Зюзі: у яго з’явілася шмат візуальных адлюстраванняў, а таксама тэатралізаваных ўвасабленняў, якія дзейнічаюць ў межах калядных і навагодніх анімацыйных праграм, замяшчаючы Дзеда Мароза. Яны з’яўляюцца пераважна пазітыўнымі персанажамі згодна з традыцыямі свята, у якое былі ўбудаваныя. Некаторыя з тэатралізаваных увасабленняў Зюзі зрабілі крок да станаўлення культурнымі брэндамі асобных рэгіёнаў Беларусі, але больш верагоднай падаецца перспектыва прыняцця Зюзі ў якасці агульнанацыянальнага брэнда.

ЛІТАРАТУРА


1. Гулак А.А. Міфалагічны кірунак у беларускай фалькларыстыцы другой палавіны XIX ст.: дыс. … канд. філал. навук: 10.01.09 / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мінск, 2011. – 124 арк.
2. Зюзя // Міфы Бацькаўшчыны / Беларус. Энцыкл.; уклад. У.А. Васілевіч. – Мінск: БелЭн, 1994. – С. 38.
3. Зайкоўскі Э., Санько С. Зюзя // Беларуская міфалогія: энцыкл. сл. / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. – Мінск: Беларусь, 2004. – С. 198.
4. Валодзіна Т.В. Канструяванне традыцыі. У пошуках цмока // Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні: зб. навук. пр. – Мінск: Белар. навука, 2021. – Вып. 8. – С. 61–93.
5. Олюнина И.В. Этнокультурное наследие Беларуси как платформа туристического брендинга // Вестник Российского университета дружбы народов. Сер.: Всеобщая история. – 2024. – Т. 16. № 4. – С. 528–541. DOI: https://doi.org/10.22363/2312-8127-2024-16-4-528-541.
6. Грушко Е.А., Медведев Ю.М. Словарь славянской мифологии. – Н. Новгород: “Русский купец”, “Братья славяне”, 1995. – 368 с.
7. Войтович В.М. Мороз // Українська міфологія / В.М. Войтович. – Київ: Либідь, 2002. – С. 321–322.
8. Виноградова Л.Н. Мороз // Славянские древности: Этнолингв. сл. / под общ. ред. Н.И. Толстого. – М.: «Международные отношения», 2004. – Т. 3. – С. 302–303.
9. Левкиевская Е.Е. Механизмы создания мифологических фантомов в «Белорусских народных преданиях» П. Древлянского // Рукописи, которых не было: Подделки в области славянского фольклора / Изд. подг. А.Л. Топорков, Т.Г. Иванова, Л.П. Лаптева, Е.Е. Левкиевская. – М.: Ладомир, 2002. – С. 311–351.
10. Березович Е.Л., Сурикова О.Д. Deus ex nomine: еще раз о языковом мифе и наивной религии // Шаги/Steps. Т. 10. № 3. – 2024. – С. 230–265. DOI: https://doi.org/10.22394/2412-9410-2024-10-2-230-265.
11. Древлянский П. Белорусские народные предания // Рукописи, которых не было: Подделки в области славянского фольклора / Изд. подг. А.Л. Топорков, Т.Г. Иванова, Л.П. Лаптева, Е.Е. Левкиевская. – М.: Ладомир, 2002. – С. 255–310.
12. Толстая С.М., Виноградова Л.Н. Приглашение мифологических персонажей на рождественский ужин // Полесский народный календарь. – М.: Индрик, 2005. – С. 443–500.
13. Як Мароз бабу змарозіў // Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі / Склад. К.П. Кабашнікаў; рэд. В.К. Бандарчык. – Мінск: Навука і тэхніка, 1971. – С. 427.
14. Як мужык Мароза зваяваў // Беларускія народныя казкі / Склад. Г.А. Барташэвіч, К.П. Кабашнікаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – С. 69.
15. Як мароз чалавеку нagradзіў за пшаніцу // Чарадзейныя казкі. – Ч. 1. / Рэд. В.К. Бандарчык. – Мінск: Навука і тэхніка, 1973. – С. 591–593.
16. Аѳанасьевъ А. Поэтическія воззрѣнія славянъ на природу. Опытъ сравнительнаго изученія славянскихъ преданій и вѣрованій въ связи съ миѳическими сказаніями другихъ родственныхъ народовъ. Т. 3 / Тип. Грачева и комп. Изд. Солдатенкова К. – М.: 1869 г. – 840 с.
17. Киркор А.К. Слѣды язычества в празднествахъ, обрядахъ и пѣсняхъ // Живописная Россія: Отечество наше в его земельномъ, историческомъ, племенномъ, экономическомъ и бытовомъ значеніи / Под общ. ред. П.П. Семенова. – СПб., М., 1882. – Т. 3. Ч. 1. Литовское Полѣсье; Ч. 2 Бѣлорусское Полѣсье. – С. 249–276.
18. Киркор А.К. Долина Припети // Живописная Россія: Отечество наше в его земельномъ, историческомъ, племенномъ, экономическомъ и бытовомъ значеніи / Под общ. ред. П.П. Семенова. – СПб., М., 1882. – Т. 3. Ч. 1. Литовское Полѣсье; Ч. 2 Бѣлорусское Полѣсье. – С. 339–356.

19. Зеленинъ Д.К. Минская губернія // Описаніе рукописей Ученаго архива Императорскаго Русскаго географическаго общества. Вып. 2. – Петроградъ, 1915. – С. 678–699.
20. Зюзя // Этнаграфія Беларусі: энцыкл. / Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелСЭ, 1989. – С. 216.
21. Сержпутоўскі А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / Прадм. У. К. Касько. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – 301 с.
22. Міфалогія беларусаў: Энцыкл. сл. / Склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – 607 с.
23. Чароўны свет: з беларускіх міфаў, паданняў і казак / рэд. Г.П. Пашкоў. – Мінск: Белар. энцыкл. імя П. Броўкі, 2008. – 215 с.

*Паступіў 18.04.2025*

## ЗЮЗЯ: ИСТОРИЯ СОЗДАНИЯ, РАЗВИТИЯ И ПЕРЕИЗОБРЕТЕНИЯ МИФОЛОГИЧЕСКОГО ПЕРСОНАЖА

***К.Л. КОЗИЧЕВА***
***(Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы Национальной академии наук Беларуси, Минск)***

*В статье рассматривается создание и развитие образа Зюзи – мифологического персонажа, сконструированного П. Шпилевским, – в рамках “кабинетной” мифологии XIX – начала XX в., его переработка и “легализация” в белорусской науке конца XX – начала XXI в.; анализируется процесс переизобретения этого мифологического персонажа в первой четверти XXI в.: появление многочисленных и разнообразных визуальных отображений Зюзи, а также использование образа Зюзи в сфере туризма и культурного брендинга отдельных территорий Беларуси.*

***Ключавыя словы:*** *Зюзя, мифология, мифологический образ, переизобретение традиции, культурный брендинг.*

## ZYUZYA: THE HISTORY OF THE CREATION, DEVELOPMENT AND REINVENTION OF A MYTHOLOGICAL CHARACTER

***K. KOZICHAVA***
***(Center for Research of Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk)***

*The article examines the creation and evolution of the image of Zyuzya, a Belarusian mythological character constructed in the mid-19th century, within the framework of cabinet mythology of the 19th to early 20th centuries, as well as its reworking and "legalization" in Belarusian science at the end of the 20th to the beginning of the 21st centuries. It analyzes the reinvention of this mythological character in the early 21st century: the emergence of numerous and diverse visual representations of Zyuzya, as well as the use of Zyuzya's imagery in the fields of tourism and cultural branding of several regions in Belarus.*

***Keywords:*** *Zyuzya, mythology, mythological image, the reinvention of tradition, cultural branding.*

**УДК 398.3** **DOI 10.52928/2070-1608-2026-77-1-88-93**

# РЭЦЭПЦЫЯ АБРАДАЎ СЯМЕЙНАГА ЦЫКЛА Ў СЯЛЯНСКІХ НАРАТЫВАХ ПРА НЯМЕЦКУЮ НАЦЫСЦКУЮ АКУПАЦЫЮ (НА МАТЭРЫЯЛЕ БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ)

***д-р філал. навук І.А. ШВЕД***
***(Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна)***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0002-9225-2031***

*У артыкуле разглядаюцца рэцэпцыя і рэпрэзентацыя эпізодаў, звязаных з абраднасцю жыццёвага / сямейнага цыкла, у кантэксце рэтраспектыўнай наратывізацыі “дзецьмі вайны” вопыту выжывання сялян Брэсцкай вобласці ў сітуацыі нацысцкай акупацыі. З эмічна-этычнай пазіцыі канцэптуалізуецца праблема “вайна і нарматыўнасць задавальнення знакавых патрэб”. Высветлена, што ў перманентным стане небяспекі і крытычнай нявызначанасці вайны, якая стала адмысловым увасабленнем лёсу індывіда і ўсяго калектыву, традыцыйна рытуалізаваныя памежныя сітуацыі жыццёвых пераходаў чалавека маюць адметнае асэнсаванне – з акцэнтам на дэвіяцыі.*

***Ключавыя словы:*** *нараджэнне-хрышчэнне, шлюб-вяселле, смерць-пахаванне, сялянскі вусны наратыў, Беларусь, Другая сусветная вайна, акупацыя.*

**Уводзіны.** Даследаванню беларускіх сямейных абрадаў, іх функцый, семантыкі, сімволікі, сінтагматычнай і парадыгматычнай структуры прысвечана значная колькасць прац фалькларыстаў і этнолагаў – агляд і бібліяграфію, прыкладам, гл. [1; 2]. У кантэкце “антрапалагічнага павароту” ў народазнаўчых навуках даследчая ўвага акцэнтуецца на тых значэннях, якія ўкладаюць самі носьбіты традыцыі ў паняцці, блізкія да навуковага тэрміна рытуалу. Паводле М. Штаўсберга, які зрабіў грунтоўны агляд эмічных эквівалентаў слова “рытуал” у разнастайных лінгвакультурах, вядомая ўсім грамадствам ідэя рытуалу аб’ядноўвае сукупнасць узаемазвязаных дзеянняў, вераванняў і каштоўнасцей: парадак, прадпісанні, законы; абрады, мараль, звычаі; дзеянні, выкананне, праца; шанаванне, пакланенне, сход; тайныя веды, запамінанне, намер; вылучэнне, раздяленне, узвышэнне [цыт. па: 3, с. 71]. Адпаведна можна меркаваць, што гэтыя катэгорыі ў той ці іншай ступені будуць задзейнічаны ў інтэрпрэтацыі і ацэнцы рытуальных практык самімі носьбітамі традыцыі.

У сувязі з рэалізацыяй (мікра)лакальных антрапалагічна арыентаваных даследаванняў актуальным прадметам фалькларыстычнага даследавання становяцца схемы канцэптуалізацыі і наратыўнага выкладу носьбітамі традыцыі такіх этнаграфічных фактаў, як метафізічныя практыкі, што не цэнзураваліся афіцыёзам і ўвасаблялі сацыяльныя стратэгіі адаптацыйнага характару (у прыватнасці, “рытуалы бедства”, варожбы), а таксама эпізодаў, звязаных з каляндарнай і сямейнай абраднасцю і іх аксіялогіяй, спраецыраванай на ўмовы трансфармацыі жыццёвага ладу і нарматыўнай этыкі ва ўмовах сацыяльных катаклізмаў, у прыватнасці ў час Другой сусветнай вайны. Аднак у беларускай фалькларыстыцы адчуваецца нястача прац, прысвечаных даследаванням такіх аповедаў у лакальна-сінхранічным вымярэнні. Мэта гэтага артыкула – вызначыць адметнасці вернакулярнай рэцэпцыі і рэпрэзентацыі абрадаў жыццёвага / сямейнага цыкла ў вусных успамінах пра нямецкую нацысцкую акупацыю. Аб’ект гэтага даследавання – сучасныя сялянскія вусныя аповеды Брэсцкай вобласці. Задачы: ахарактарызаваць “этнаграфічны фальклор” (тэрмін С.Ю. Няклюдава), які датычыць 1) нараджэння-хрышчэння, 2) шлюбу-вяселля, 3) смерці-пахавання; вызначыць адметнасці канцэптуалізацыі базавых ідэй, звязаных з “жыццёвым / сямейным” цыклам.

**Асноўная частка**. Чыннікі сямейнай абраднасці, як і шэраг іншых рытуальных практык, да сёння працягваюць выконваць такую “традыцыйную” для іх “сацыяльную працу”, як фарміраванне і развіццё сеткі сацыяльных сувязей, сацыялізацыя асобы праз засваенне неабходных для набыцця пэўнага статусу агульных каштоўнасцей ды катэгорый ведаў і вопыту, зняцце міжасабовай напружанасці і сацыяльных канфліктаў, а таксама перыядычнае абнаўленне ці транфармацыя сацыяльных і канцэптуальных структур, на якіх засноўваецца жыццё супольнасці – падрабязней гл.: [4, с. 60]. Гіпатэтычна можна меркаваць, што канкрэтнае напаўненне, “змест” і вынікі гэтай “працы” адрозніваюцца ў дачыненні нават да той самай лакальнай супольнасці, у залежнасці ад таго, існуе яна ў звычайным – мірным – стане ці ва ўмовах сацыяльнага катаклізму, як вайна і акупацыя. Для фалькларыстаў, этнолагаў, даследчыкаў гісторыі паўсядзённасці ў сялянскіх аповедах пра вайну, акрамя іншага, навуковую цікавасць уяўляюць сведчанні і ацэнкі бытавання разнастайных формаў традыцыйнай (фальклорнай) культуры ў акупаваных нямецка-фашысцкімі захопнікамі вёсках [5].

Звяртае на сябе ўвагу цікавасць да пэўных абрадавых практык з боку саміх носьбітаў традыцыі, што відавочна з іх успамінаў (у тым ліку спантанных) пра розныя перыяды жыцця іх супольнасці. Асаблівае месца згадкі пра сацыяльныя аспекты такіх практык і іх ацэнка займаюць у аповедах “дзяцей вайны” пра жыццё ў акупаваных нацыстамі вёсках. Адпаведна новую аналітычную перспектыву адкрываюць дапаўненне этык-падыходу ў вывучэнні традыцыйных абрадаў эмічным даследаваннем рэцэпцыі абрадавых практык “дзецьмі вайны” (са сваімі жыццёвым вопытам, перажываннем мінулага, сацыяльнай пазіцыяй і перакананнямі) і ўвядзенне ў навуковы ўжытак так званага “этнаграфічнага фальклору” – вусных апісанняў “звычаяў і абрадаў, якія належаць носьбітам традыцыі” і “не з’яўляюцца прамой праекцыяй практыкі, якая апісваецца” [6, с. 46]. Выкарыстанне герменеўтычна-

інтэрпрэтацыйнага метаду забяспечвае ўлік канкрэтнага сацыякультурнага кантэксту (у тым ліку вернакулярных анталогій) пэўных абрадавых практык і разуменне эмнага пункту гледжання на гэтыя практыкі. У сувязі з адзначаным актуальнасць набывае (мікра)лакальнае сінхроннае даследаванне эксплікацыі абрадаў і звязаных з імі ўяўленняў самімі носьбітамі традыцыі, з выкарыстаннем эмічна-этычнага падыходу.

Адпаведна асноўныя *метады* гэтага даследавання: функцыянальна-семантычны, герменеўтычна-інтэрпрэтацыйны, сінхроннае лакальнае апісанне. Матэрыял для артыкула (інтэрв'ю і ўключанае назіранне) сабраны ў 2007–2025 гады, захоўваецца ў архіве студэнцкай Фальклорна-краязнаўчай лабараторыі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна і асабістым архіве аўтара. Большасць апавядальнікаў (з колькаснай перавагай жанчын) – "дзеці вайны", што жылі ў акупаваных нацыстамі вёсках Брэсцкай вобласці, беларусы, праваслаўныя, з пачатковай, радзей – сярэдняй адукацыяй, працавалі ў калгасе і ўласнай гаспадарцы. Гэты артыкул хутчэй не пра абрады, а пра "падзелены са сваімі" і абмеркаваны з "прывілеяванымі іншымі" (у тэрміналогіі П. Рыкера) вопыт наратараў, якія ў сваіх рэтраспектыўных меркаваннях з пазіцыі сучаснасці імплікуюць ці эксплікуюць маральна-этычныя ацэнкі падзей мінулага, пра псіхалагізаванае бачанне і наратывізацыю імі колішніх абрадавых практык, што рэзаніруе з прынятымі іх сацыяльнай групай "канцэпцыяй праўды вайны", нарматыўнай этыкай, а таксама аксіялогіяй нараджэння-хрышчэння, шлюбу-вяселля, смерці-пахавання.

Разглядаючы вусныя апавяданні Заходняй Беларусі пра абыдзёны рытуал, В.А. Лабачэўская падкрэсліла, што яны, акрамя таго, што ўключаюць "хрэстаматыйны пералік сакральных актаў", "паказваюць на іх гендэрную спецыялізацыю", і гэта тлумачыцца тым, што "ў Заходняй Беларусі, якая з 1920 па 1939 г. уваходзіла ў склад Польшчы, у нямецкай акупацыі заставалася як жаночае, так і мужчынскае насельніцтва" [5, с. 48–49]. Гэтымі ж абставінамі шмат у чым вызначаліся асаблівасці бытавання і іншых традыцыйных абрадаў і звычаяў (у прыватнасці, вясельных) у акупаваных нацыстамі вёсках Брэсцкай вобласці. Вайна ў "сістэме традыцыйнага светапогляду і светаўспрымання ўяўляла сабой квінтэсенцыю небяспекі" [Лобачевская, 2009: 49], парушала "норму" і "меру", г.зн. гармонію і стабільнасць, "узрушвала" асновы існавання, і таму набывала гранічны сэнс. У кантэксце рэтраспектыўнай наратывізацыі такога экстрэмальнага досведу могуць спецыфічна ўспрымацца і асэнсоўвацца кардынальныя вехі жыццёвага шляху чалавека, памежныя сітуацыі жыццёвых пераходаў. Ваенная штодзённасць, якой спадарожнічаюць смерць, гвалт, хваробы, голад і адпаведныя няпэўнасць, адчай, пакута, становіцца "памежнай", "ненармальнай" (а таму можа называцца паўсядзённасцю толькі ўмоўна) ды патрабуе ад людзей пастаяннага прыкладання намаганняў, каб "проста быць". Сентэнцыю тыпу "Думалі, што паміраць будзем / што нас адразу паб'юць" можна назваць скразной для разгляданых успамінаў.

У шэрагу аповедаў з пазіцыі этык-падыходу можна вызначыць праблему ***"вайна і нарматыўнасць задавальнення знакавых патрэб"***. Унутры сямейнага падання, міжпакаленнай перадачы досведу калясмяротнага вопыту родных і блізкіх, у апавяданнях як саміх удзельнікаў і відавочцаў драматычных падзей, так і з іх слоў, устойлівую пазіцыю займае матыў "дарослыя члены сям'і пераапранаюць дзяцей, рыхтуючыся да смерці". Так, паводле аднаго з наратываў удзельніцы падзеі, бацька, у адрозненне ад іншых чальцоў сям'і, распазнае ў начным грукаце 22 чэрвеня 1941 г. не навальнічныя грымоты над Бугам, а пачатак вайны, і бабулінай рэакцыяй на гэта з'яўляецца імкненне хутчэй апрануць дзяцей у чыстае: "Бабушка моя кричит: *«Надо детей в чистые рубашки надеть!» Мы думали, что нас сразу побьют…"* (Зап. 2014 г. Ніконька Ю., Гронская В. у в. Вельямовічы Брэсцкага р-на ад Дарашук Марыі Аляксандраўны (1932 г.н., адукав., правасл., бел., мясц.)). Гэты ж матыў лагічна ўведзены ў сюжэтную схему і апавядання жыхаркі аг. Мухавец Брэсцкага раёна, якая на той час была маленькім дзіцём і таму не можа не абапірацца на "чужую памяць" – успаміны старэйшых удзельнікаў: «Уже в конце еще были немцы здесь, уже отступали тогда, то пришли к нам, сожгли наш дом. *Посадили нас расстреливать* (мама, бабушка и я, брат). *Мама нарядила меня (маленькая ещё), плацице такое беленькое, которое только сшили на день рождения* – годик. И два немца вошли с автоматами <…> И вот она [бабушка] стала на колени и стала просить: "Не расстреливай, расстреляйте меня, оставьте ее и детей. В чем же они виноваты? В чём они виноваты?" И нас помиловали» (Зап. 2015 г. Чарнавокая В. ад Гуль Галіны Маісееўны (1941 г.н., адук., мясц.)). У такіх аповедах звяртае на сябе ўвагу імкненне носьбіта традыцыі (мамы ці бабулі) у экстрэмальных умовах, якія задаюць і маніфестуюць гранічныя сэнсы, задаволіць знакавыя патрэбы – у "памежнай удвая" сітуацыі хоць неяк забяспечыць "рытуальную легітымнасць" пераходу ў замагільны свет. Што да "інтраспектыўнага вопыту" бабуль – персанажаў цытаваных аповедаў, то ён нам даступны толькі ў рэпрэзентаваных "слядах"-дзеяннях: у першым выпадку вербальна выяўленая інтэнцыя – апрануць дзяцей у чыстыя кашулі – мае выключна рытуальна-сімвалічны сэнс, а ў другім – учынак бабулі, гатовай на самаахвяраванне (у адрозненне ад сімвалічнага дзеяння "пасіўнай ахвяры" – маці, апрануўшай дачушку ў белую сукенку), прыводзіць да рэальнага выратавання сям'і. Актуалізаваныя ў абедзвюх сітуацыях ідэнтычныя элементы міфарытуальнай сістэмы, звязаныя з пераходам "жыццё – смерць" (пераапрананне / абражэнне і адпаведныя ўяўленні), у пэўным сэнсе "пераварочваюцца". Як вядома, традыцыйна пераапрананнем памерлага ў чыстую (новую ці надзяваную ў сакральна вылучаныя перыяды календара або на вяселле) адзежу замацоўваецца яго новы стан – памерлага. У прыведзеных кантэкстах няздзейсненай на біялагічным узроўні смерці поўных вітальных сіл дзяцей папярэднічаюць узведзеныя да пахавальнага рытуалу акты пераўтварэння жывых у мёртвых, мінуючы этап памірання. Акрамя гэтага, разгляданы матыў адсылае да метанімічнага згортвання рытуальнага праходжання пункта, які звычайна завяршае сцэнар жыцця, – па неабходнасці ў экстрэмальных умовах рытуал кадуецца толькі адным яго семіятычна важным актам, у дадзеным выпадку – ражэннем дзяцей.

Ненарматыўнасць пахавання (выкопванне саміх на сябе пахавальных ям, закопванне жывымі, недахоп зямлі для пакрыцця целаў у велізарнай расстрэльнай яме), парушэнні базавых прадпісанняў абраду (пахаванне ў адной магіле, без акуратнага апускання трун на палотнах ці хаця б вяроўках, закопванне цел зусім без трун, без адпявання-развітання, рытуальнага надзялення нябожчыка доляй) часта эксплікаваны ў апавяданнях "дзяцей вайны" (і іх нашчадкаў) пры абмалёўцы адпаведных карцін, траўмаваўшых псіхіку відавочцаў. Прыкладам: «[Бацькава брата] *заставілі выкопаты гроба на полэ*, завелі за сарай, заставілі выкопаты могілу самы, і поставілі: от дзедзьку, і там ша аднаго, і хлопац шышнацаць літ буў, і кажа, той просіўся: "Дзедзько, завяжыты мне вочы". І усе, расстрэлялі ўсіх» (Зап. 2025 г. Сакадын К. у в. Лелікава Кобрынскага р-на ад Сакадын Марыі Карпаўны (1948 г.н., бел., 8 кл., правасл., мясц.)). Нярэдка мясцовае насельніцтва згадвае і паваенныя перапахаванні.

Пасля многіх дзесяцігоддзяў да ўдзельнікаў і відавочцаў падзей у снах могуць прыходзіць салдаты, якія загінулі і былі паспешліва – без правядзення належных рытуалаў, пахаваны далёка ад сваіх дамоў. Так, ураджэнка Азарычаў апавядае аб тым, як у сне ўбачыла свайго нябожчыка мужа з чырвонаармейцам, забітым і пахаваным у іх мясцовасці, – на тым свеце мужчыны апынуліся ў адной хаце. Гэта значыць, пасмяротныя шляхі тубыльца, памершага "сваёй смерцю", і загінулага зблізку яго хаты маладога салдата з Грузіі перакрыжаваліся-зыйшліся ў адной кропцы, пры гэтым падкрэсліваецца агульнасць іх прыналежнасці да адной веры – праваслаўнай (Зап. 2016 г. Барысевіч М.Ю. у в. Азарычы Пінскага р-на ад Уласік (Чуйко) Алены Рыгораўны (1925 г.н., сярэдняя адук., правасл., мясц.)). Зразумела, загінуўшыя на фронце мужчыны прыходзяць у снах да сваіх блізкіх. Прыкладам, аўдавеўшая жанчына шмат гадоў жыла ў страху, што яе дачушка памрэ, бо ў сне яе забраў загінуўшы на вайне бацька (Зап. студэнты БрДзУ у в. Збураж Маларыцкага р-на ад Алесік Надзеі Пятроўны (1922 г.н., 3 кл. "польскай школы").

Вяртаючыся да наратываў пра смерць "сваіх", неабходна адзначыць, што для перадачы дэталяў трагедыі, пачуццяў і эмоцый тых, хто выжыў, сведак ды ўдзельнікаў пахавання ахвяр нацысцкіх зверстваў нярэдка выкарыстоўваюцца ўстойлівыя тропы і клішэ (уміг пасівелыя ахвяра і/ці відавочца, цякучая па зямлі кроў (асабліва кантрастная са снегам), карычневая зямля ці пачырванеўшая ад крыві вада (у вадаёме), стогны ахвяр, варушэнне зямлі ў расстрэльнай яме і выцягванне рук з яе), адпаведныя канцэпты страху, гора, безвыходнасці і г.д. Звяртае на сябе ўвагу і канцэптуалізацыя поруч са стыхіямі зямлі і вады (балота) стыхіі агню, якія разам адмыслова апрадмечваюць калектыўнае ўяўнае пра вайну як стыхійнае бедства. Пералічаныя сродкі рэпрэзентацыі драмы смерці і пахавання характэрныя як стэрэатыпізаваным унутрыгрупавым фабулатам, так і публічнаму дыскурсу («А коренное население, к сожалению… Пришли немцы… у нас здесь гетто недалеко, они всех их [местное население] за проволоку, потом вывели напротив школы прямо болото в Шилово, и там на склон, и просто расстреляли. *Кровь текла ручьями в болото*, просто расстреляли всех вот, коренное население» (Зап. 2012 г. Кудзіч І. у г.п. Дамачава Брэсцкага р-на ад Тарасевіча Леаніда Фёдаравіча – дырэктара Дамачаўскага сельскага выканаўчага камітэта). Інтэрпрэтацыя такіх наратываў магчымая праз оптыку вызначаных А. Энгелькінг у "палескім вернакулярным сказе" "ліній пратаганістаў", якія прадстаўляюць абагульненага героя (яўрэяў і сялян) і падзяляюць агульны лёс бязвінных ахвяр "касмічнай катастрофы, якая адбылася па дапушчэнні вышэйшага парадку". "Падобна да таго, як у смерці яўрэяў удзельнічае найперш стыхія зямлі і вады, у расправу над сялянамі аказваецца ўлучанай стыхія агню" [7, с. 34–35]. Згадваюцца "дзецьмі вайны" і "звычайныя" пахаванні, якія ў акупаваных вёсках Брэсцкай вобласці былі ўскладнены неспрыяльнымі ўмовамі, у прыватнасці тым, што царква, дзе магчыма было адпець нябожчыка, і могілкі аказаліся за нейкай незразумелай мясцоваму насельніцтву новай мяжой, і *"покойніка надо ў коменданта просіть, чтоб разрешіл на кладбішчах похороніть, бо вжэ за граніцой…»* (Зап. 2020 г. Андрасюк А. у Жабінцы ад Козіч Валенціны Мікалаеўны (1929 г.н., Пружанскае педвучылішча, правасл., бел., пераехала з в. Харкі Пружанскага р-на)).

З шэрагу апавяданняў больш ці менш выразна высвечваюць пэўныя каштоўнасныя супярэчнасці, якія не зняў час. У індывідуальных інтэрпрэтацыях наратараў вайна можа ўспрымацца як нейкая "навязаная звонку дадзенасць", а жыццё – як такое, што патрабуе свайго працягу, і героі апавяданняў змушаныя існаваць як бы ў трох жыццёвых светах – паўсядзённа-звычайным, рытуальна-абрадавым і экстрэмальным. У адпаведнасці з тым ці іншым модусам нашыя суразмоўцы могуць казаць пра тое, што ў акупаваных вёсках Брэстчыны хлопцы сустракаліся з дзяўчатамі, гуляліся вяселлі (у шэрагу выпадкаў, каб пазбегнуць вывазу ў Германію), нараджаліся і хрысціліся дзеці, адзначаліся каляндарныя святы, ладзіліся маладзёжныя вечоркі – "музыка", удзельнікамі якой у адных апавяданнях (з партызанскіх зон) з'яўляліся партызаны, у другіх – "немцы", у трэціх – "уласаўцы" ці "бульбоўцы" (ад мянушкі арганізатара Украінскай нацыянальна-рэвалюцыйнай арміі Тараса Бараўца – Бульба). У такіх апавяданнях можна "вычытаць" ідэю таго, што традыцыйна спарадкаваныя сэнсы супольнасці ў экстрэмальны час у пэўнай ступені страцілі сваю стабільнасць і суб'ектывізаваліся. Вайна дэструктурызавала ўвесь існуючы парадак, у тым ліку ўстойлівыя формы адносін у вясковым соцыуме, міжасабовыя ўзаеміны (адна з апавядальніц "падмацавала" гэта прыпеўкай: "Ой вайна-вайна, / Ты мяне абідзела / І заставіла любіць, / Каго я ненавідзела" (Зап. 2009 г. Валасар М. у в. Тальмінавічы Ляхавіцкага р-на ад Абрамчык Вацлавы Станіславаўны (1928 г.н., адук., каталіч., бел., мясц.)). Мяркуючы па аповедах, драма вайны раскрыла і актывавала звычайна ўтоеныя ўчасткі лакальнай сацыяльнай сеткі, разбурыла ці, наадварот, умацавала сямейна-родасныя і суседскія сувязі. Выводзячы на першы план свой пункт гледжання, апавядальнікі могуць па-рознаму ацэньваць вышэйадзначаныя культурныя практыкі і паводзіны іх удзельнікаў, якія адначасова як бы прытрымліваліся традыцыйнага культурнага ўзору, задавальнялі знакавыя патрэбы (у прыватнасці, гулялі вяселлі) і здзяйснялі "гыдкую" трансгрэсію выпрацаваных супольнасцю маральных нарматываў, прыкладам: "А ў войну, знаетэ, як було гыдко… Гуляюць, васілля робять, гуляють, танцюють,

бульбашi спiваюць. Я там у той вэлыкой хатi жыла (кiлька мнэ було… трынаццяць лiт), бацько ўмэр. Бульбашi iдуць, спiваюць, выбiгла баба – за буханку хлеба i пошла. [Баба тая, што з бульбашамi iшла?] Да-а-а! О-о-й, нi дай Божэ! Зара добрэ, а тоды нi дай Божэ!» (Зап. 2018 г. Вецiк Я.В., Сенькавец У.А., Швед I.А. у в. Лелiкава Кобрынскага р-на ад Рэбрэй Наталлi Сцяпанаўны (1930 г.н., правасл., бел.)). Разам з тым зафiксавана i наступнае сведчанне: “Тогды булы й дывкы взрослы там, воны включать патiфона <…> То назбыраюцця i дывкы, тыi нiмцi, i качають тых дывок, i бушують, гэтак бы i нашы хлопцы. О, ныкого ны затронулы тыi, i гытляровцы… Вжэ воны прыйiхалы гэто палыты i быты гэты деревня́. Ны палылы i ны былы ныкого” (Зап. 2021 г. Галах М. у в. Застаўе Драгiчынскага р-на ад Кочык Марыi Клiменцьеўны (1933 г.н., 4 кл., правасл., бел.)). Мяркуючы па наяўных у нас запiсах, жыхары партызанскiх зон становiча адзываюцца аб практыках баўлення вольнага часу мясцовай халастой моладзэю – дзяўчат i сваiх хлопцаў “з деревень этых о суседнiх” – партызан (Зап. 2011 г. Федарава К. у в. Спорава Бярозаўскага р-на ад Лютыч Вольгi Аляксееўны (1935 г.н., адук., правасл., бел., мясц.)).

З шэрагу наратываў вiдавочна, што прыхiльнасць носьбiтаў традыцыi да яе “законаў” (i патрыярхальнага ўкладу ў цэлым) у пэўным сэнсе не страчвала сваёй значнасцi ва ўмовах нацысцкай акупацыi. Так, звычайныя для сялянскiх супольнасцей матрыманiяльныя стратэгii хоць i не маглi не трансфармавацца ў працяглай экстрэмальнай сiтуацыi вайны (i адпаведнай пераацэнкi каштоўнасцей), але захоўвалi шэраг сваiх пазiцый. Мяркуючы па аповедах, у ваеннае лiхалецце атмасфера традыцыйнага “гуляння” ***вяселля*** аказвалася зусiм нетрадыцыйнай i ўключала разнастайныя эксцэсы. У аповедах пра “акупацыйныя вяселлi” частотны матыў незвычайнасцi як самiх гасцей i iх паводзiн (у тым лiку маўленчых), так i вясельных атрыбутаў – падкрэслiваецца, што ўдзельнiкi вясельнага застолля былi з вiнтоўкамi i пад прыцэлам вiнтовак (“А яны панапiвалiся… павылазiлi, ды давай бiцца. Парассякалi адзiн аднаму вiнтоўкамi о тут во лоб. После дасталi бiнты, пазавязвалi этыя галовы. А парцiзаны ў жыцi ляжаць…” (Зап. 2009 г. Валасар М. у аг. Тальмiнавiчы Ляхавiцкага р-на ад Абрамчык Вацлавы Станiславаўны (1928 г.н., адук., катал., мясц.)). У сувязi з адзначанай “нетрадыцыйнасцю атмасферы” вяселля характэрныя i мемараты з партызанскiх зон, у прыватнасцi з Бярозаўскага раёна: “О, такэе було вэселле – партiзаны, немцэ, маджары. А мэнэ як замкнулi ў комору, сказалi, шо нэма молодое i парцiзаны пойшлi, а вжэ прыехалi з вэнца, то прыйшлi немцэ, маджары” (Зап. 2009 г. Кавалевiч А. у в. Сакалова Бярозаўскага р-на ад Кавалевiч Ульяны Iванаўны (1922 г.н., адук., правасл., бел., мясц.)). Абрады, як вядома, не проста адлюстроўваюць узаемаадносiны памiж iх удзельнiкамi, а ствараюць гэтыя адносiны (у прыватнасцi, улады i падпарадкавання цi iерархiчнай камплiментарнасцi), сiмвалiчна ўвасабляючы пэўную супольнасць i яе здатнасць да трансфармацый, у тым лiку пад уплывам знешнiх абставiн i сацыяльных катаклiзмаў, якiм з’яўляецца вайна. Пра тое, якiя “адносiны” стваралiся падчас вяселля, удзельнiкамi якога былi “партiзаны, немцэ, маджары”, што адчувалi маладыя i iх родныя, i канкрэтна нявеста, схаваная ў каморы (але не “традыцыйна” – ад дружыны маладога), а таксама партызаны, што схавалiся ў жыце i разважалi, цi напасцi на падпiўшых фашыстаў i iх паслугачаў, застаецца толькi здагадвацца.

Спецыфiка выказвання пра вясельнае гулянне (якое магло супадаць са святкаваннем каляндарных свят, у прыватнасцi, Сёмухi) можа тлумачыцца глыбiннай карэляцыяй феноменаў вайны i свята, само “ўзаеманакладанне” якiх успрымаецца як дэвiяцыя. Як слушна адзначае У. Лобач, “вайна, як i смерць, выступае каштоўнасцю анталагiчнага плану, ёсць супрацьлеглым полюсам свята. Бо калi ў апошнiм выпадку рух па жыццёвай шкале адбываецца ад сiтуацыi няпэўнасцi, хаосу, дэструкцыi да новага роўню светаладу, то вайна мадэлюе адваротны выпадак: ад парадку, стабiльнасцi – да суцэльнай дэвiяцыi жыццёвага ладу” [8, с. 450], i, дададзiм, сама “цыклiчна” знiкае ў максiмальна бруднай субстанцыi распаду. У дзiцячых вусна-паэтычных творах з ланцуговай структурай гэта – кал, якi, акрамя ўсяго, традыцыйна фiгураваў у кантэкстах зневажання некага цi нечага i разам з тым ахоўваў чалавека i яго маёмасць ад уздзеяння нячыстай сiлы; параўн.: “…А дэ тые дэвочкы? / – Жэнiшкы побралi / – А дэ тые жэнiшкы? / – Пошлi на войну. /– А дэ тая война? / – Дэ копiца го.на. / –А дэ тэе го.но? / – Свiннi поелi. / – А дэ тые свiннi? / – Люды побылi. / – А дэ тые люды? / – Умэрлi да й ручкi задэрлi” (Зап. 2025 г. Ярмольчык Л. у аг. Багданаўка Лунiнецкага р-на ад Ярмольчык Еўдакii Уладзiмiраўны (1950 г.н., бел., мясц.)).

На фоне частотнасцi згадак немаўлят (i iх гiбелi) у аповедах пра акупацыю наратары, нават жанчыны (не кажучы ўжо пра мужчын), вельмi рэдка нешта кажуць пра ***перадродавы перыяд, роды цi хрысцiны*** ў час вайны. Толькi часам яны акцэнтуюць тое, што ва ўмовах партызанскiх лагераў i падчас разгортвання франтавых дзеянняў “трапляла людзям”, г.зн. жанчыны маглi нараджаць дзяцей. Гэты факт не толькi станавiўся аб’ектам абмеркавання (i нават абсмейвання – “рагаталi”) у малой (найперш, жаночай) групе, але i спецыяльна маркiраваўся калектыўнай свядомасцю сялянскай супольнасцi (такiх дзяцей называлi адметна – “франтавiкi”) i доўга помнiўся (Зап. 2009 г. Валасар М. у в. Гайнiн Ляхавiцкага р-на ад Валасар Юзэфы Iосiфаўны (1928 г.н., адук., каталiч., мясц.)). Нетыповай падчас нацысцкай акупацыi магла быць матывiроўка хрышчэння дзiцяцi, напрыклад, каб маркiраваць яго i ўсю сям’ю як “не-бальшавiкоў” (Зап. 2015 г. Валковiч А. у в. Люта Брэсцкага р-на ад Якавук Нiны Iванаўны (1936 г.н., 4 кл., правасл., бел.)). Зафiксавана наратывiзацыя трагiчных эпiзодаў, у якiх iмператыў “***дзецi – галоўная каштоўнасць i сэнс жыцця***” як бы здымаўся ва ўмовах татальнай дэструкцыi свету (дарослыя кiдалi немаўлят падчас бегства ад фашыстаў, або “гура” настойвала, каб мацяркi *«душылi дзецей, або одгонялi од гуры. “Iдзi з своiм дзiцяцем, куда хоч!” Коб не почулi, не прыйшлi, да не поўбiвалi ўсех»* (Зап. 2013 г. Аксёнава А. у в. Выганашчы Iвацэвiцкага р-на ад Кармановiч Надзеi Рыгораўны (1940 г.н., бел., 10 кл., правасл., мясц.)) i тым самым “ад адваротнага” пацвярджаўся апавядальнiкамi.

**Заключэнне.** Мяркуючы па запiсах з Брэсцкай вобласцi, у кантэксце рэтраспектыўнай наратывiзацыi вопыту жыцця ў працяглай экстрэмальнай сiтуацыi нацысцкай акупацыi рэцэпцыя i рэпрэзэнтацыя абраднасцi

жыццёвага / сямейнага цыкла і звязаных з ёю ідэй істотна адрозніваюцца ад такіх у аповедах пра мірны час, галоўным чынам – акцэнтацыяй тых ці іншых парушэнняў, дэвіяцыі. Пазначаная адметнаць, сярод іншага, можа быць інспіраваная цеснай сувяззю складаных рытуальных сістэм (і іх сімвалічнай мовы, якая не можа быць нейтральнай) з сацыяльнымі структурамі і каштоўнасна-нарматыўнымі ўстаноўкамі, адпаведна кардынальная змена адных (у прыватнасці, пад ціскам драматычных абставін вайны і акупацыі) можа / павінна матываваць трансфармацыю іншых. З вышэйпрыведзеных эмічных чыннікаў рытуалу, вызначаных М. Штаўсбергам, беларускія наратары – "дзеці вайны" – акцэнтуюць узаемазвязаныя дзеянні і каштоўнасці, найперш маральна-этычныя, і менавіта ў іх оптыцы разглядаюць паводзіны членаў сваёй супольнасці. Мяркуючы па аповедах, аднаўленне такіх складнікаў ранейшага парадку, як пэўныя культурныя практыкі, паўсядзённая руціна, мадэлі паводзінаў, патэрны ўзаемаадносін, па-першае, далёка не заўсёды было магчымым ва ўмовах падвышанай напружанасці і страты адчування стабільнасці і прадказальнасці, а, па-другое, нават калі такое аднаўленне "з карэктывамі на глабальную памежнасць" вайны і акупацыі ўдавалася, то гэта магло не адпавядаць каштоўнасным (пера)арыентацыям шэрагу членаў лакальнай супольнасці, а таксама апавядальніка, які рэтраспектыўна ацэньвае апісаныя ім практыкі, падзеі, калізіі. Як і шматлікія іншыя аповеды з топікай разгледжанага сацыяльнага катаклізму, аповеды пра "(не)задавальненне знакавых патрэб ва ўмовах агульнага парушэння нармальнасці" ў сваіх аксіялагічных і рэферэнцыйных вымярэннях грунтуюцца на даволі лёгка апазнавальных культурных і маральных імператывах, калектыўных уяўленнях пра (не)належнае, і звычайна імплікуюць ці эксплікуюць ацэнкі ў залежнасці ад індывідуальнага вопыту, сэнсавай пазіцыі, ідэалагічнага пункту гледжання наратара. Імаверна, закранаючы тэматыку жыццёвых пераходаў чалавека, якія традыцыйна забяспечваліся-афармляліся адпаведнымі рытуаламі, апавядальнікі (як і героі іх наратываў) вымушаны вырашаць нялёгкія задачы ўпісвання "індывідуальнай памежнасці" лімінала (і пазіцый удзельнікаў падзеі) у "глабальную памежнасць" катастрофы вайны і акупацыі, суаднясення феноменаў вайны і свята (параўн. этымалогію "вяселля"), зыходзячы пры гэтым з уласных аксіялагічных установак.

ЛІТАРАТУРА


1. Нарысы гісторыі культуры Беларусі. У 4 т. – Т. 3. Культура сяла XIV – пачатку XX ст. У 2 кн. – Кн. 2: Духоўная культура / А.І. Лакотка і інш.; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск: Белар. навука, 2016. – 751 с.
2. Варфаламеева Т.Б. Сямейныя абрады і звычаі. – Мінск: Выш. шк., 2017. – 719 с.
3. Stephenson B. Ritual. A very short introduction. – Oxford, New York: Oxford University Press, 2015. – 126 p. – DOI: https://doi.org/10.1093/actrade/9780199943524.003.0001.
4. Bell C. Ritual: Perspectives and Dimensions. – New York: Oxford. University Press, 1997, xii + 351 p. – DOI: https://doi.org/10.1093/oso/9780195110517.001.0001.
5. Лобачевская О.А. Ритуал в повседневности войны (об архаической ритуальной практике в годы Второй мировой войны в Беларуси) // Homo historicus 2009. – Гадавік антрапалагічнай гісторыі. – Вільня, 2010. – С. 38–53.
6. Неклюдов С.Ю. «Этнографический факт» и его фольклорные экспликации // Фольклор и этнография. К 90-летию со дня рождения К.В. Чистова / Отв. ред. А.К. Байбурин, Т.Б. Щепанская. – СПб.: МАЭ РАН, 2011. – С. 40–47.
7. Энгелькинг А. Сказ полесского села, или О фольклоризации памяти о Второй мировой войне // Славяноведение. – 2018. – № 6. – С. 27–46. – DOI: https://doi.org/10.31857/S0869544X0001763-2.
8. Лобач У.А. Міф. Прастора. Чалавек : традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве. – Мінск: Тэхналогія, 2013. – 510 с.


*Паступіў 30.11.2025*

## РЕЦЕПЦИЯ ОБРЯДОВ СЕМЕЙНОГО ЦИКЛА В КРЕСТЬЯНСКИХ РАССКАЗАХ О НЕМЕЦКОЙ НАЦИСТСКОЙ ОККУПАЦИИ (НА МАТЕРИАЛЕ БРЕСТСКОЙ ОБЛАСТИ)

***д-р филол. наук И.А. ШВЕД***
***(Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина)***

*В статье рассматриваются рецепция и репрезентация эпизодов, связанных с обрядностью жизненного/ семейного цикла, в контексте ретроспективной нарративизации «детьми войны» опыта выживания крестьян Брестской области в ситуации нацистской оккупации. С эмически-этической позиции концептуализируется проблема «война и нормативность удовлетворения символических потребностей». Установлено, что в условиях перманентной опасности и критической неопределенности войны, ставшей особым олицетворением судьбы личности и всего коллектива, традиционно ритуализированные пограничные ситуации жизненных переходов человека получают своеобразную интерпретацию – с акцентом на девиации.*

***Ключевые слова:*** *рождение-крещение, брак-свадьба, смерть-погребение, крестьянский устный рассказ, Беларусь, Вторая мировая война, оккупация.*

**RECEPTION OF FAMILY CYCLE RITUALS IN PEASANT STORIES ABOUT GERMAN-NASCIP OCCUPATION (BASED ON MATERIALS FROM THE BREST REGION)**

***I. SHVED***
***(Brest State A.S. Pushkin University)***

*The article examines the reception and representation of episodes related to the rituals of the life/family cycle in the context of the retrospective narrativization by "children of war" of the survival experiences of peasants in the Brest region during the Nazi occupation. From an ethical perspective, the issue of "war and the normativity of satisfying symbolic needs" is conceptualized. It has been established that in conditions of permanent danger and critical uncertainty of war, which has become a peculiar embodiment of the fate of both the individual and the collective, traditionally ritualized boundary situations of human life transitions receive a distinctive interpretation – emphasizing deviations.*

***Keywords:*** *birth-baptism, marriage-wedding, death-burial, peasant oral narrative, Belarus, World War II, occupation.*

**УДК 392.1(476)** **DOI 10.52928/2070-1608-2026-77-1-94-104**

# ТРАДЫЦЫЙНАЯ ПАХАВАЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ СТАРАВЕРАЎ ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (НА АСНОВЕ МАТЭРЫЯЛАЎ ПАЛЯВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ ПАЧАТКУ XXI СТ.)

***канд. гіст. навук, дац. У.Я. АЎСЕЙЧЫК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай)***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0002-6433-0039***

*Артыкул прысвечаны характарыстыцы традыцыйнай пахавальнай абраднасці стараверaў Паўночна-Заходняй Беларусі. Асновай для працы сталі матэрыялы сучасных палявых фальклорна-этнаграфічных даследаванняў, праведзеных у асяроддзі стараверaў рэгіёна. Для даследавання таксама прыцягнуты і больш раннія матэрыялы і архіўныя крыніцы. У артыкуле выяўлена традыцыйная структура пахавальнага абраду, ахарактарызаваны яго асноўныя этапы і рытуальныя дзеянні, прасочана эвалюцыя пахавальнага абраду на працягу другой паловы XX – пачатку XXI ст. Прыходзім да высновы, што нават да сучаснага перыяду гэта частка народнай культуры стараверaў захавала нямала архаічных рысаў. Як вынікае з аналізу матэрыялаў, на пахавальны абрад значны ўплыў аказвалі рэлігійныя прадпісанні і нормы стараверaў, што прадвызначыла яго струткру і паўплывала на комплекс уяўленняў і рытуальных дзеянняў. Гэта асаблівасць характэрна і для сучаснага перыяда. Аналіз матэрыялаў таксама паказаў, што ў структуры пахавальнага абраду стараверaў відавочна прасочваюцца ўласна рускія этнічныя традыцыі.*

***Ключавыя словы:*** *пахавальная абраднасць, стараверы, Паўночна-Заходняя Беларусь, рытуал, пахаванне, традыцыя, эвалюцыя.*

**Уводзіны.** У комплексе абрадаў сямейнага цыкла асаблівае месца займаюць рытуалы, якія суправаджаюць пахаванне чалавека. Пахавальная абраднасць адносіцца да найбольш устойлівых элементаў этнічнай культуры. Па гэтай прычыне яна з'яўляюцца надзвычай інфарматыўнай (а таму вельмі важнай і каштоўнай) крыніцай для даследавання этнічных і этнакультурных працэсаў. З іншага боку, пахавальная абраднасць дазваляе выявіць узаемасувязі абрадавых комплексаў сямейнага і каляндарнага цыклаў, яе даследаванне садзейнічае лепшаму разуменню іншых праяў самабытнай духоўнай і матэрыяльнай культуры этнічных супольнасцей. У комплекс пахавальна-памінальнай абраднасці ўваходзіць абрад пахавання, індывідуальныя памінанні (памінальныя ўрачыстасці, якія здзяйсняліся ў адпаведныя дні пасля смерці чалавека) і памінальныя ўрачыстасці, уключаныя ў каляндарныя святы. Мэта дадзенага артыкула – выявіць асаблівасці традыцыйнай пахавальнай абраднасці стараверaў-беспапоўцаў Паўночна-Заходняй Беларусі.

Геаграфічныя межы даследавання абумоўлены арэаламі рассялення стараверaў у межах рэгіёна. Асноўны масіў іх пасяленняў сканцэнтраваны на тэрыторыі сучасных Браслаўскага, Мёрскага, Шаркаўшчынскага, Пастаўскага і Глыбоцкага раёнаў Віцебскай вобласці і пераходзіў на літоўскія і латвійскія землі; на поўдні да яго прымыкаюць невялікія арэалы на тэрыторыі Астравецкага і Ашмянскага раёнаў Гродзенскай вобласці, Мядзелскага і Валожынскага раёнаў Мінскай вобласці. Асновай для працы сталі матэрыялы палявых фальклорна-этнаграфічных даследаванняў, праведзеных у рэгіёне ў пачатку XXI ст. Да выяўлення асаблівасцей пахавальнай абраднасці стараверaў паўночна-заходняга рэгіёна былі прыцягнуты таксама і больш раннія матэрыялы і архіўныя крыніцы. Варта адзначыць, што дадзеная праблематыка не знайшла належнага адлюстравання ў навуковых публікацыях. Яна толькі закранaлася ў артыкуле А.А. Гарбацкага і Т.В. Дабжынскай [5], а таксама ў навукова-папулярным выданні Т.І. Хурсан [14].

**Асноўная частка.** Структура пахавальнага абраду стараверaў, як і мясцовага беларускага насельніцтва, уключае рытуальныя дзеянні да пахавання, а таксама непасрэдна пахаванне з абавязковым памінальным застоллем пасля яго. Да сферы пахавальнай абраднасці належыць таксама комплекс уяўленняў і павер'яў, звязаных са смерцю і "іншым" светам. Падобныя ўяўленні адрозніваюцца высокай ступенню захаванасці і кансерватыўнасці. Такім чынам, непасрэдна да пахавальнага абраду прымыкае комплекс прымет, якія, як лічылася, прадказваюць смерць чалавека. Матэрыялы сучасных палявых даследаванняў паказваюць, што вясковае старавeрскае насельніцтва рэгіёна (пераважна старэйшага пакалення) па-ранейшаму ў якасці прымет "на смерць" указвае незвычайныя паводзіны жывёл, птушак, насякомых (выццё сабакі, спяванне курыцы і інш.). У якасці такіх прыкмет могуць разглядацца і "прадказанні", убачаныя ў сне: "Ну, собака выець ілі землю роет, то на покойніка, еслі выець і вверх глядзіць – на пажар. … Ну, там [у сне – *А.У.*] пастройкі так гэта это самое новые так ещё ж говорят на пахарон"[1]. Трэба заўважыць, што падобны набор прыкмет уласцівы і мясцоваму беларускаму насельніцтву [8, с. 56].

Як і ў мясцовага беларускага насельніцтва, інварыянтам традыцыйнага пахавальнага абраду ў стараверaў рэгіёна было пахаванне людзей сталага ўзросту, якія памерлі "сваёй" смерцю. Паводле традыцыйных уяўленняў натуральнай ("правільнай") смерцю чалавека лічылася "свая" смерць (г.зн. смерць "ад старасці"). У такім разе

[1] Запісана ў 2022 г. аўтарам ад Васільевай У.П., 1943 г.н. у в. Мілейкі Мёрскага р-на.

смерць чалавека настае ў выніку таго, што той пражыў свай "век". Такая абумоўленасць тлумачыцца сувяззю ў традыцыйнай свядомасці паняцця "век" (працягласць жыцця чалавека) з яго "доляй", якая яму даецца пры нараджэнні. Варыянт "памерці сваёй смерцю", паводле традыцыйных уяўленняў, з'яўляецца ідэальным. Да такіх нябожчыкаў адносіліся з глыбокай пашанай і іх рэгулярна памінalі. Іншыя варыянты смерці ("не сваёй", заўчаснай) ва ўмовах традыцыйнага грамадства разглядаліся як непажаданыя [9, с. 143–144; 13, с. 131; 12, с. 40; 3, с. 102].



**Малюнак 1. – Пахаванне ў старавераў Шаркашчынскага р-на.**
**З сямейнага архіва В. Гудковай, г. Наваполацк**

Сярод усіх катэгорый нябожчыкаў, што памерлі "не сваёй" смерцю, асобна вылучаліся самагубцы, стаўленне да якіх было абсалютна адмоўным. Згодна з народнай традыцыяй, такіх памерлых не памінalі і не адпявалі, іх не хавалі на агульных могілках. Такі іх статус "нячыстых" нябожчыкаў падмацоўвалася і пазіцыяй стараверскай царквы. Гэта характарыстыка пастаянна адзначаецца рэспандэнтамі: "Вот если павешается человек, батюшка хоронить не будет. Так, где-нибудь водаль его хоронят, не на кладбище, не молются по ем, и батюшка не приезжает. Если человек памёр, то явоная звезда падает" (в. Залессе Глыбоцкага р-на) [4, с. 90].

Але архіўныя крыніцы ўсё ж фіксуюць выпадкі пахавання самагубцаў на агульных могілках. Такі выпадак здарыўся ў 1937 г. у Відзаўскай абшчыне (Браслаўскі раён). Разам з тым, пахаванне адбылося з выканнем многіх рэлігійных частак, нягледзячы нават на тое, што памерлы не быў у споведзі, не хадзіў у храм, а таксама характарызаваўся як "отчаянный табакою и брадобрия". Мясцовы святар (духоўны настаўнік) адмовіўся яго хаваць і настойваў на тым, што не трэба па ім "служить погребение а также и хоронить на кладбище". Пра гэта святар заявіў старшыні абшчыны, аднак той не паслухаўся і арганізаваў пахаванне на могілках. Як сведчаць крыніцы, пахаванне прайшло з выкананнем многіх рэлігійных частак (наяўнасць пахавальнай працэсіі з крыжам, прысутнасць групы пеўчых і інш.). Гэта пахаванне ўзбудзіла ўсю абшчыну, у выніку чаго яна накіравала прашэнне ў Вышэйшы стараверскі савет у Вільні (далей – ВСС) каб перапахаваць самагубцу за межамі могілак. У ім адзначалася, што пахаванне самагубцы на агульных могілках "нарушает канон наш <…> в нашем законе нельзя класть на кладбище висельника". Таму абшчына прасіла "выбрать висельника из нашего кладбища" каб "висельник не лежал бы там, где лежат христиане наши". У сувязі з гэтым ВСС даў распараджэнне агарадзіць ўчастак могілак, дзе пахаваны самагубца, і зрабіць у яго асобны ўваход з боку дарогі. Гэтае адгароджанае месца ў наступным павінна стаць месцам пахавання самагубцаў. Аднак такое рашэнне не задаволіла абшчыну і яны ізноў накіравалі прашэнне у ВСС каб выкапаць вісельніка і перапахаваць яго ў іншым месцы[2].

[2] Lietuvos centrinis valstybės archyvas (LCVA). – F. 1681. Ap. 1. B. 174. – L. 65–66, 67–68г, 73–73г, 79.

Трэба заўважыць, што ў стараверскага насельніцтва рэгіёна не толькі самагубства разглядалася як непажаданы варыянт смерці. Гэта датычылася таксама і нехрышчоных дзяцей. Як і самагубцаў, іх забаранялася хаваць на агульных могілках. Іншы раз такіх нябожчыкаў усё ж хавалі на агульных могілках, але не ў цэнтральнай частцы, а дзе-небудзь з краю. Так, крыніцы паведамляюць пра выпадак, які здарыўся ў 1937 г. у Лаўнікаўскай абшчыне (Браслаўскі раён, у сучасны перыяд не існуе). Адна жанчына-староверка нарадзіла нежывое дзіця. Згодна з інфармацыяй духоўнага настаўніка, гэтае дзіця пахавалі з краю могілак без выканання абраду: «Родители младенца похоронили в берегу кладбища на указанном им месте без погребения»[3]. Падобныя асаблівасці фіксаваліся і ў старавераў Літвы: “Если уже некрещеный ребёнок, полагается токо так захоронить, как вот, например, и все эти утопленники, висельники. Его отдельно хоронят и всё [за кладбищенской оградой]. И обязательно его токо вворачивали в чёрную одежду. Он нехрещёный уже” [11, с. 69]. Аднак у позніх апісаннях абраду стаўленне да гэтай катэгорыі памерлых становіцца больш пазітыўным. Нехрышчоныя дзеці перастаюць разглядацца як “нячыстыя”, а іх пахаванне адбываецца на агульных могілках. Такая рыса характэрна і для мясцовага беларускага насельніцтва рэгіёна [9, с. 148].

Згодна з матэрыяламі першай паловы XX ст., у стараверскага насельніцтва рэгіёна і некаторыя іншыя варыянты смерці, адрозныя ад “сваёй” смерці, расцэньваліся непажаданымі і нават “нячыстымі”. Да іх адносілася смерць ад маланкі, а таксама смерць “ад гарэлкі”. Так, архіўныя крыніцы паведамляюць, што ў жніўні 1929 г. у Ракаўскай абшчыне (у суч. перыяд уваходзіць у г.п. Шаркаўшчына) маланкай забіла чалавека. Але ён да гэтага не быў на споведзі некалькі гадоў. Духоўны настаўнік не рашыўся праводзіць па ім богаслужэнне і перапытваў у ВСС, як быць у такой сітуацыі. На што з ВСС быў адказ, што нельга адпяваць толькі самагубцаў: “запрещается хоронить и отпевать по христианскому обряду лишь самоубийц, умерших же христиан насильственной смертью, хотя перед смертью некоторое время не бывших на покаянии, надлежит хоронить и отпевать безпрекословно”[4]. Такім чынам, у дадзенай сітуацыі бачна суіснаванне народнай традыцыі і кананічных правілаў. Трэба адзначыць, што вызначэнне смерці ад маланкі як “нячыстай” з’яўляецца даволі архаічным і фіксавалася ў многіх славянскіх народаў [12, с. 40, 41, 267]. Такі ж яе характар адзначаўся і мясцовым беларускім насельніцтвам Падзвіння [9, с. 145]. Між тым кананічныя правілы старавераў-беспапоўцаў, як бачна з вышэйпрыведзеных матэрыялаў, такі статус ёй не надавалі. У Кублішчанскай абшчыне ў 1935 г. здарыўся наступны выпадак: старавер памёр, выпіўшы віна ў Новым Пагосце. Урач пастанавіў, што той памёр ад “падучай”, на якую пакутваў з дзяцінства, але ўсё адно яго пахавалі без выканання “духоўнага абраду”[5].

Як сведчаць матэрыялы, да катэгорыі «нячыстых» іншы раз адносіліся і жанчыны, якія памерлі да сарака дзён пасля родаў. Так, у 1930 г. у Свірскай абшчыне здарыўся такі выпадак: «Померла роженица, и поисповедовшись на третий день умерла»[6]. Духоўны настаўнік не стаў яе хаваць і адпяваць, спасылаючыся на кананічныя правілы. Ён са скрухай адзначаў, што адзін з прыхажан усё ж здзейсніў яе адпяванне ў храме: «… человек, знающий священное писание, отпевал погребение над роженицей в молитвенном храме»[7].

Варта адзначыць, што ў сучасны перыяд ужо не дзейнічаюць былыя забароны, і пахаванне самагубцы адбываецца на агульных могілках. У сучасных палявых матэрыялах адзначаецца таксама паляпшэнне стаўлення да некаторых катэгорый заўчасна загінуўшых (ад маланкі, тапельцаў). Такіх памерлых ужо не разглядаюць як “нячыстых”: “Ну, [самагубцаў – *А.У.*] отвозили на кладбище, даже раньше. А его на кладбище не положено было хоронить, а за кладбищем, в сторонке хоронили... А теперь ни в кого не спрашивают. <...> А если гроза или втопился он нечайно – это вже ничего...” (в. Каралева Шаркаўшчынскі р-н) [1, с. 159].

Згодна з кананічнымі правіламі, у старавераў-беспапоўцаў забаранялася здзяйсняць пахаванне па царкоўнаму чыну тых, хто памёр без пакаяння (хаця яно магло іншы раз і не ўлічвацца; гл. вышэй адказ ВСС у 1929 г. Ракаўскай абшчыне). Таму сярод стараверскага насельніцтва Паўночна-Заходняй Беларусі існавала строгае патрабаванне паспавядацца перад смерцю. Споведзь перад смерцю – вельмі важны акт для мясцовых старавераў, на які пастаянна звярталі ўвагу. Нават у скаргах на сваіх духоўных настаўнікаў у міжваенны перыяд мясцовыя староверы ў якасці страшнага парушэння ўказвалі менавіта іх нежаданне ехаць да паміраючага на споведзь. Так, у 1930-х гг. прыхажане Апідамскай абшчыны (Пастаўскі раён) скардзіліся ў ВСС на тое, што іх духоўны настаўнік шмат разоў не прыязджаў да прыхажанаў пры смерці[8]. Адна прыхажанка з Грыгараўшчынскай абшчыны (Браслаўскі раён, у сучасны перыяд не існуе) перад смерцю казала так: “…если не приедет Видзкий поп и в случае помру, захороните так без погребения и пусть он сам отвечает перед судом небесным”[9]. У сувязі з гэтай асаблівасцю ў матэрыялах справаводства стараверскіх абшчын рэгіёна міжваеннага перыяду даволі часта сустракаюцца выпадкі пахаванняў, якія здзяйсняліся без святара і адпявання. Як сведчаць крыніцы, такая асаблівасць была абумоўлена якраз тым, што памерлы не быў на працягу года на споведзі. Нават сустракаліся такія выпадкі, калі прыхажанін пераязджаў у іншую абшчыну і раптоўна паміраў, а інфармацыя пра яго споведзь адсутнічала, то яго хавалі без святара і адпявання.

[3] LCVA. – F. 1681. Ap. 1. B. 186. – L. 36.
[4] LCVA. – F. 1681. Ap. 1. B. 9. – L. 49-50.
[5] LCVA. – F. 1681. Ap. 1. B. 8. – L. 267.
[6] LCVA. – F. 1681. Ap. 1. B. 471. – L. 92.
[7] LCVA. – F. 1681. Ap. 1. B. 471. – L. 92-92r.
[8] LCVA. – F. 1681. Ap. 1. B. 171. – L. 75-76r, 85.
[9] LCVA. – F. 1681. Ap. 1. B. 174. – L. 8.

Традыцыйны пахавальны абрад уключаў рытуальныя дзеянні, якія пачыналіся яшчэ да смерці чалавека. У старавераў усходняй Літвы зафіксаваны даволі архаічная традыцыя, згодна якой нельга, каб чалавек паміраў на ложку. Адчуўшы набліжэнне смерці, старыкі прасілі родных палажыць іх на лаву ці на падлогу, галавой да абразоў, а пасля смерці памерлага паварочвалі нагамі да абразоў – “каб Бог бачыў” [11, с. 63–64]. Такая ж традыцыя зафіксавана і сярод стараверскага насельніцтва Шаркаўшчыны. У гэты час трэба было запальваць свечкі каля абразоў і чытаць “адхадную” малітву: “У староверов обычно если уже видят, что ён умирает, тады ж нясут (раньше ж у хате лаўка была большая такая, широкие лаўки), нясут его на эту лаўку ложут и зовут это которые читать умеют, ну, царкоўную эту молитву и бягут тады за этым чалавеком отходную читать. Запальвают свечки перед иконой и становится читает отходную эту, вот. Ну и умирает” (в. Германавічы Шаркаўшчынскага р-на) [1, с. 221]. Такая традыцыя фіксавалася яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. і сярод беларускага насельніцтва Падзвіння [2, с. 209]. Праўда, большасць сучасных апісанняў пахавальнага абраду старавераў не згадваюць такіх рытуальных дзеянняў. У асноўным, як сведчаць рэспандэнты, на гэтым этапе абраду трэба чытаць малітву і даць памерламу ў рукі свечку: “Свечку в руки давали, «Отче Наш» говорили. Мама у меня умирала, я дома была. Тогда я свечку давала ей. И «Отче Наш» читала. Это первоначальная молитва такая есть, «Отче Наш»” [10].



**Малюнак 2. – “Чытанне” па памерламу ў час пахавання, другая палова XX ст.**
**З сямейнага архіва У.П. Васільевай, в. Мілейкі Мёрскага р-на**

У асяроддзі старавераў-беспапоўцаў рэгіёна да нашага часу яшчэ захаваліся ўяўленні, што асабліва цяжка паміраюць чараўнікі. Таму для аблягчэння перадсмяротнай агоніі (для “выхаду душы”) чараўнікоў у даху хаты лічылася неабходным рабіць дадатковыя адтуліны (разбіраць страху, столь): “Ну вот у нас у Дзянісах была такая жэншчына, яна очень была чараўніца. І вот яна не магла ўмерець. Вот ужо гаварят умрет, всё. Апяць гаварыт дыхает усё. А нада разбіраць паталок і крышу, где яна ляжыць, напроціў яе і ўсё. Тагда гаваріт яна могіт толька памерець. Было такіх многа тут. А цепер, раней так многа было чараўніц. Кароў чаравалі, скока мне была самой…”[11].“Я знаю, с паталку даску адрываюць, чтоб умярець, ну, мне не прыходзілась с такім в роду не было, не знаю”[12].

Наступнымі абрадавымі дзеяннямі былі абмыванне і апрананне памерлага. Яшчэ і ў наш час захоўваюцца строгія прадпісанні адносна тых, хто мусіў выконваць гэтыя аперацыі. Катэгарычна забаранялася абмываць і апранаць памерлага родным. У адпаведнасці з традыцыяй, цела памерлага мужчыны павінны абмываць і апранаць мужчыны, а жанчыны – жанчыны. Але ў сучасны перыяд, як сведчаць матэрыялы палявых даследаванняў,

[10] Запісана ў 2019 г. аўтарам ад Ядрэўскай Л.П., 1936 г.нар. у г. Дзісна Мёрскага р-на.
[11] Запісана ў 2022 г. аўтарам ад Цімафеевай А.А., 1940 г.н. у в. Фралоўшчына Мёрскага р-на.
[12] Запісана ў 2022 г. аўтарам ад Васільевай У.П., 1943 г.н. у в. Мілейкі Мёрскага р-на.

гендэрны фактар у гэтай частцы абраду іншы раз не ўлічваецца. Забарона ж родным абмываць і апранаць нябожчыка яшчэ фіксуецца: "Из своей родни нельзя было кому-либо умывать. Тому, кто стол готовит, особенно. Не обмывают те люди. Чужих приглашали – соседей там. Соседи набивались и сами. У нас, например, в Белянах, были две бабки, которые ходили сами. Если им кто накажет, или кто позвонит, кто скажет, чтоб пришли, – придут. Помоют, уложат, оденут" [13]. Але, як сведчаць крыніцы, у сучасны перыяд у шэрагу выпадкаў і гэта забарона не ўлічвалася, таму абмываць і апранаць памерлага маглі іншы раз і родныя нябожчыка [5, с. 53]. У ходзе сучасных палявых даследаванняў яшчэ фіксуюцца і прадпісанні адносна вады, якой мылі памерлага. Згодна з уяўленнямі, такая вада набывае негатыўныя якасці і нават лічыцца "мёртвай вадой". З-за веры ў тое, што такая вада можа нашкодзіць жывым, захоўваецца патрабаванне выліваць яе туды, дзе ніхто не ходзіць [1, с. 91; 5, с. 53].

Пасля абмывання памерлага апраналі. Яшчэ пры жыцці пажылыя людзі клапаціліся аб падрыхтоўцы адзення "на смерць". У пахавальным адзенні захаваліся яшчэ да нашага часу некаторыя рысы традыцыйнага касцюму старавераў рэгіёна. Так, яшчэ і ў наш час фіксуецца патрабаванне хаваць памерлага мужчыну-старавера ў халаце (азяме) і кашулі-касаваротцы, якую падпярэзвалі поясам. У той жа час пахавальнае адзенне жанчыны-староверкі мусіла ўключаць кашулю, сарафан, "кофту", хустку, канцы якой не завязвалі, а "закладалі" і прымацоўвалі з дапамогай шпількі. Іншы раз хустку замацоўвалі не шпількай, а "прыцягвалі" ніткай. Адзначалася таксама, што ў мінулым на нагі не абувалі скураны абутак, а толькі "тапочки": "И покойников одевают. Женщин должен быть сарафан, ну длинный. И шьется блузка. Блузка. Платок не завязывают. Как вот во всех религиях так на узелок. У нас даже в церкви не завязывают. А вот так вот, сюда, чтобы волосы все были скрыты у нас. И вот тут вот приколачкай. Графкай, как мы говорили. Графачкай застегивали. Вот. А мужчин оденут… Шьют халат. Ну шерстяной там. Из тонкой-тонкой шерсти шьют халат. Вот так мы отца хоронили. Ну, рубашка… Косоворотка шьется вот"[14]. Як сведчаць этнаграфічныя крыніцы, традыцыйнае пахавальнае адзенне жанчын-стараверак рэгіёна было светлага колеру. Разам з тым, яшчэ сярод сталага старавераскага насельніцтва рэгіёна сустракаецца забарона на пахаванне ў адзенні цёмных колераў. Фіксуецца і ўяўленне аб некамфортным "знаходжанні" на "тым" свеце нябожчыцы, якую пахавалі ў цёмным ці каляровым адзенні: "Говорят, что на тым свете если цвяты [цветная ткань], слязам[и] надо будет вымыть, если будет что цветное, не белое... А нихто ж не пришёл [с того света], не сказал. Говорят, что слезам; а хто говорит, что будет стоять на солнце, покуль выпекет" (в. Смолаўцы Шаркаўшчынскага р-на) [1, с. 232–233].

Захаваліся і ўяўленні аб тым, што пасмяротнае адзенне выраблялася адмысловым чынам. У старавераў Літвы фіксавалася ўяўленне, што "смертную одежду" трэба было шыць іголкай ад сябе, "на живую нитку" [11, с. 64]. Такія ж уяўленні фіксуюцца і ў старавераў Паўночна-Заходняй Беларусі. Разам з тым, у мясцовага старавераскага насельніцтва пашыраны былі ўяўленні, што пры шыцці такога адзення трэба пазбягаць завязвання вузялкоў. Трэба адзначыць, што ў пасмяротным адзенні старавераў рэгіёна ўвогуле не павінна быць вузлоў, таму хустка ў жанчыны не завязвалася, а замацоўвалася пад падбародкам шпількай (гл. вышэй), а мужчыне не завязвалі гальштук. Па гэтай прычыне нават крыжык іншы раз не надзявалі на шыю, а толькі накладалі: "Кресцік дзеравяный, не завязываецца. На шею набрасываецца во так… Ну вот чулкі, можна і чулочкі, можна і насочкі… вот і касыначка…"[15].

Вызначальнай рысай памерлага мужчыны-старавера была барада. На гэту асаблівасць звяртаюць увагу як самі старавеpы, так і мясцовае беларускае насельніцтва: "Отец почему-то бороду брил. Вот. Но когда заболел – не брился. Потому, что у нас мужчины должны умирать с бородой"[16]. У адваротным выпадку, як лічыцца, святар нават можа не адпяваць нябожчыка: "Да, сечас дзелают замечаніе. Еслі без барады – не будут атпеваць пакойніка. Старавер должен быць абязацельна з бародкай"[17]. Так, у старавераў Анікшчайскага раёна Літвы дарослым безбародым мужчынам нават прывязвалі адмысловую бараду з ільну [11, с. 64].

Пасля апранання для нябожчыка рыхтавалі пасмяротнае ложа. Месца размяшчэння і арыентацыя памерлага ў хаце ў старавераў адрознівалася ад мясцовага беларускага насельніцтва. Як правіла, старавеpы размяшчалі нябожчыка тварам да ікон (т.ч. нагамі на покуць): "У нас токо большая разница у похоронах была. Православные и католики кладут покойника головой к иконы, <...> а ногам ко двери, от иконы. А старообрадцы кладут ногам к иконы, чтоб лицо смотрело на икону, понимаете? Чтоб он видел икону; не отворачивали его от иконы..." (в. Каралева Шаркаўшчынскі р-н) [1, с. 158]. Шырока захоўваецца і традыцыя класці памерлага не пасярэдзіне хаты, як гэта ў сучасны перыяд пашырана ў беларусаў каталіцкага і праваслаўнага веравызнанняў, а каля сцяны. На такую асаблівасць звяртаюць увагу як самі старавеpы, так і мясцовае беларускае насельніцтва: "У нас, каталікаў, кладуць сярод хаты і ў праваслаўных тожа, а ў старавераў каля сценкі кладуць. У хрысціян – галавой да іконы"[18].

Як адзначаюць рэспандэнты, абавязковая асаблівасць старавераскага пахавальнага абраду – бесперапыннае чытанне Псалтыра ў час знаходжання нябожчыка ў хаце: "Умрёт человек; умывают его, чисто оденут. Приглашают читальников, читают всю ночь. Общем, пока не закапывают, читают без отхода читают, молятся по им" (в. Смолаўцы Шаркаўшчынскага р-на) [1, с. 232]. Як адзначаецца, у адрозненне ад праваслаўнага і каталіцкага

[13] Запісана ў 2019 г. аўтарам ад Ядрэўскай Л.П., 1936 г.нар. у г. Дзісна Мёрскага р-на.
[14] Запісана ў 2021 г. аўтарам ад Чарнаморднай В.З., 1943 г.н. у аг. Друя Браслаўскага р-на.
[15] Запісана ў 2022 г. аўтарам ад Цылінскай Р.І., 1939 г.н., Паповай Ф.І., 1943 г.н. у в. Більдзюгі Шаркаўшчынскага р-на.
[16] Запісана ў 2021 г. аўтарам ад Чарнаморднай В.З., 1943 г.н. у аг. Друя Браслаўскага р-на.
[17] Запісана ў 2022 г. аўтарам ад Цылінскай Р.І., 1939 г.н., Паповай Ф.І., 1943 г.н. у в. Більдзюгі Шаркаўшчынскага р-на.
[18] Запісана ў 2008 г. Якубоўскай Г.В. ад Невяроўскай Г., 1934 г.н. у в. Сэклы Браслаўскага р-на.

насельніцтва рэгіёна, староверы чытаюць стоячы: "У іх вот, православных, чытаюць сідзя, а у нас стая каля стала чытаюць. Усю ноч і дзень, пака пампрет чытаець. А іх пачытаець троху, тады і нясуць хараніць. У нас красіва хароняць і паюць красіва"[19]. У стараверaў Шаркаўшчыны такая традыцыя атрымала назву *"стоять стойку"* [1, с. 91] (малюнак 2).

У час знаходжання ў хаце памерлага прыходзяць суседзі і знаёмыя, каб развітацца з ім. На гэтым этапе абраду фіксавалася традыцыя рытуальнага аплаквання нябожчыка, галашэння над ім. Згодна з традыцыяй, галасіць павінна была ўмець кожная жанчына. Акрамя таго, зафіксаваны нават выпадкі запрашэння адмысловых галасільшчыц [5, с. 53].

Важным этапам у сістэме пахавальнай абраднасці з'яўляецца выраб труны ("домовья"). У рэгіёне на сучасным этапе труну не вырабляюць самі, а набываюць у спецыялізаваных крамах і бюро рытуальных паслуг. Аднак сярод стараверскага насельніцтва яшчэ захоўваюцца ўспаміны аб тым, што ў мінулым труну выраблялі самі: "Моют, адзевают. І лежіт, пака сначала турну сдзелают… Самі дзелалі, папка ўмел і дзелал, памагал когда і Нікона харанілі. Есчо такіх тагда не было ў магазіне ў прадажы гробов" [20]. Як сведчаць крыніцы, труну раней староверы часта рабілі загадзя, яшчэ пры жыцці. Лічылася, што пакідаць пустой труну было нельга і яе чымсці засыпалі (як правіла, збожжам): "[А гробы заранее не делали?] Некоторые заранее делали. <...> Сделает и поставит на хату, на чердак, а не, дак у пуню поставит. [Они просто так стояли?] Так стоят. А некоторые, говорят, зерном насыпали" (в. Германавічы Шаркаўшчынскага р-на) [1, с. 222]. У стараверaў Літвы гатовую труну таксама засыпалі збожжам, якое кожны год патрэбна было мяняць на збожжа новага ўраджаю, а мінулагодняе раздаваць беднякам. Калі сям'я не магла сабе гэта дазволіць, то труна запаўнялася шчэпкамі і апілкамі ад тых дошак, з якіх была зроблена труна, ці сухім лісцем ад бярозавых венікаў. Галоўнае, каб труна не заставалася пустой, бо яна "нябожчыка да сябе цягніць"; па іншай версіі – "там нячыстая сіла тады гуляіць" [11, с. 64]. Сярод стараверaў рэгіёна яшчэ ў наш час фіксуюцца ўспаміны аб тым, што ў мінулым труну збівалі не жалезнымі цвікамі, а драўлянымі шыпамі: "И давней делали не на гвоздах, а на шипах, на деревянных" (в. Варонка Шаркаўшчынскага р-на) [1, с. 167]. Трэба адзначыць, што гэтая асаблівасць даволі архаічная па паходжанні і звязана з уяўленнямі аб тым, што жалеза "смерць не любіць", а таму ў многіх славянскіх народаў фіксавалася старадаўняя традыцыя не выкарыстоўваць жалезныя цвікі для вырабу труны [12, с. 205–206].

Да нашага часу захавалася забарона набіваць пер'ем падушку, якую лажылі пад галаву нябожчыка. Згодна з традыцыяй, яе набівалі апілкамі, якія заставаліся пасля вырабу труны, або лісцем ад бярозавых венікаў: "В гроб кладут, пуховую подушку не клали, никогда! Тольки или с опилочков, где стружки такие есть; или основное, очень хорошо было – с веников берёзовых. Давней же ж веники очень делали. И эты листья <...> и кладут туда; и под низ так настилают" (в. Варонка Шаркаўшчынскага р-на) [1, с. 168].

Труна пасля падрыхтоўкі перамяшчалася ў хату. Аднак перакладанне памерлага ў труну, згодна з традыцыяй, адбывалася толькі на трэці дзень непасрэдна перад пахаваннем. Увесь гэты час памерлы ляжаў на лаве: "Кагда молюца, пока бацюшка прыязджаіць на 3 дзень, кагда молюца уже і батюшка і пеўчые, тагда. А так он лежіт на скамейке" [21]. Як ужо было адзначана вышэй, у стараверaў захоўваецца традыцыя аб няўдзеле родных у многіх аперацыях пахавальнага абраду (забарона на абмыванне і апрананне памерлага і інш.). Але ў асяроддзі стараверaў рэгіёна зафіксавана цікавая традыцыя, калі якраз родныя (дзеці) мусілі перакладаць нябожчыка ў труну: "У нас покойника не ложут сразу в гроб. Нельзя. <…> Ложат покойника на палати. Ну на стол. Как у кого сделано. Специальные делают. В гроб ложат именно перд самой уже. Когда приходят. Когда уже погребение. В день похорон. <…> Тогда гроб. Надо покойнка ложить в гроб и должны дети именно положить его. Такой, ну обряд такой"[22].

Абавязковымі атрыбутамі снараджэння памерлага на той свет у стараверaў-беспапоўцаў былі саван і лестаўка ("лесенка"): "Саван надяют, лесенку на руку, хрест на шею вешают. Батюшка бумагу пишет, кладёт на лоб, чтоб приняли его там на тым свете" (в. Смолаўцы Шаркаўшчынскага р-на) [1, с. 232]. "Ну саван у нас абязацельны, нада саван. Ну саван же был у ва ўсіх" [23]. Калі кладуць у труну цела, яшчэ накрываюць адмысловым пахавальным пакрывалам. Фотаздымкі 1920 – 1980-х гг. яскрава ілюструюць гэту асаблівасць (малюнкі 3, 4). У стараверскіх маленных рэгіёна ў ходзе абследаванняў былі выяўлены такія пакрывалы. У шэрагу выпадкаў, як сведчаць фотаматэрыялы, яго маглі замяняць звычайным пакрывалам.

Пахаванне памерлага ў стараверaў-беспапоўцаў Паўночна-Заходняй Беларусі традыцыйна адбывалася на трэці дзень. Такая традыцыя шырока бытуе і сярод мясцовага беларускага насельніцтва. Аднак у стараверaў, як правіла, пахаванне адбываецца ў першай палове дня. У той жа час у мясцовага беларускага насельніцтва пахаванне заўсёды адбываецца ў другой палове дня.

---

[19] Запісана ў 2008 г. аўтарам ад Трафімавай Е.М., 1928 г.н. у в. Ніўнікі Мёрскага р-на.
[20] Запісана ў 2022 г. аўтарам ад Цылінскай Р.І., 1939 г.н., Паповай Ф.І., 1943 г.н. у в. Більдзюгі Шаркаўшчынскага р-на.
[21] Запісана ў 2022 г. аўтарам ад Цылінскай Р.І., 1939 г.н., Паповай Ф.І., 1943 г.н. у в. Більдзюгі Шаркаўшчынскага р-на.
[22] Запісана ў 2021 г. аўтарам ад Чарнамордай В.З., 1943 г.н. у аг. Друя Браслаўскага р-на.
[23] Запісана ў 2022 г. аўтарам ад Несцеравай М.О., 1945 г.н. у в. Кублішчына Мёрскага р-на.



**Малюнак 3. – Пахаванне ў сям'і старавераў, даваенны перыяд.
З архіва сям'і Несцеравых, в. Кублішчына Мёрскага р-на**



**Малюнак 4. – Пахаванне ў сям'і стараверaў. З сямейнага архіва
Х.Я. Пазняковай, в. Каралева Шаркаўшчынскага р-на**

У дзень пахавання для адпявання памерлага запрашаюць духоўнага настаўніка. Як сведчаць крыніцы, іншы раз пахаванне магло адбывацца без святара. Асабліва такая практыка была характэрна для савецкага перыяду. Афіцыйная статыстыка гэтага часу ўвогуле падавала мінімальную колькасць стараверскіх пахаванняў з удзелам святара. Так, за 1960 г. такія пахаванні ў Браслаўскім раёне складалі толькі 6,8% ад усёй колькасці, у Мёрскім – 5,5%, а ў Глыбоцкім – толькі 0,5%[24]. У абсалютнай колькасці такіх пахаванняў таксама налічвалася няшмат. Так, па Віцебскай вобласці за 1966 г былі праведзены 192 вочных адпяванні, а 4 – завочныя[25]. За 1968 г. было налічана 217 вочных адпяванняў і 11 завочных[26]. У 1984 г. было зафіксавана толькі 154 вочныя адпяванні, у той час як завочных было 69[27]. Такім чынам, прадстаўленыя за 1960–1980-я гг. даныя паказваюць даволі невялікую колькасць пахаванняў з адпаваяннем святаром (духоўным настаўнікам), а таксама паступовае павелічэнне долі завочных адпяванняў. У той жа час, у параўнанні з іншымі абрадамі сямейнага цыкла (хрышчэннем і вянчаннем), колькасць адпяванняў была куды большай. Канешне, афіцыйная статыстыка не ў поўнай меры адлюстроўвае рэальную карціну ў гэтай сферы. Як сведчаць матэрыялы апытання рэспандэнтаў, фотаматэрыялы, удзел святара ў пахаванні і нават адпяванне памерлага ў храме быў даволі шырока прадстаўлены ў пахавальнай культуры стараверaў рэгіёна і ў савецкі перыяд.

Важным этапам пахавальнага абраду з'яўляецца адпраўка памерлага на могілкі. Паводзіны людзей падчас руху працэсіі строга рэгламентаваліся. У першую чаргу гэта датычылася пахавальнага шэсця. Захоўваецца своеасаблівы характар пабудовы пахавальнай працэсіі (малюнак 5). Абавязкова наперадзе пахавальнага шэсця ідзе нехта з крыжам (часцей мужчына). Лічылася, што гэты крыж нельга браць голымі рукамі, а таму яго трымалі праз адмысловы ручнік (гл. малюнкі 1, 5). За ім неслі труну з нябожчыкам, а затым ішоў духоўны настаўнік з пеўчымі. За імі ішлі ўсе астатнія: "Несёт человек хрест, у полотенцу; и несёт упереду хрест. Раньше венков не было; не было венков никаких. Ни цвятов, ни венков. Хрест нясут и покойника. А за покойником идут певчие и батюшка, поют" (г.п. Шаркаўшчына) [1, с. 192].



**Малюнак 5. – Пахавальная працэсія, другая палова XX ст.**
**З сямейнага архіва У.П. Васільевай, в. Мілейкі Мёрскага р-на**

[24] Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 4029. Воп. 1. Спр. 13. – Л. 78.
[25] ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 1. – Л. 41.
[26] ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 8. – Л. 37.
[27] ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 68. – Л. 30.

Як сведчаць крыніцы, у міжваенны і пасляваенны перыяд нярэдка ў старавераў Літвы памерлага не везлі, але неслі на могілкі на руках: "В межвоенные и первые послевоенные годы в некоторых старообрядческих приходах считалось зазорным везти покойника на кладбище на лошадях, а тем более на автомашине – гроб несли односельчане на жердях или носилках, иногда за 10-15 километров" [11, с. 65]. Трэба заўважыць, што такая традыцыя шырока фіксавалася і ў старавераў Паўночна-Заходняй Беларусі. Пра гэта яскрава сведчаць матэрыялы палявых даследаванняў. Пра яе сведчаць і фотаздымкі пахаванняў (гл. малюнак 5). Але, як правіла, яна датычылася вынасу памерлага за межы вёскі: "І несут далёка туда, дзе аж дом, дарога ў Мількі. Госці ідут пешком і гроб несут на руках мужыкі… Да, і абязацельна з выхадам на дзеревню, на крыжаванку"[28].

У шэрагу выпадкаў, перад тым як ісці на могілкі, нябожчыка яшчэ адпявалі ў храме: "Нясуть у маленную, паюць провады" (в. Кублішчына Мёрскага р-на) [7, с. 57]. Як сведчаць матэрыялы, у мінулым такая практыка была паўсюднай і разглядалася як абавязковы этап пахавальнай абраднасці. Згодна з традыцыяй і кананічнымі правіламі, у храме не адпявалі самагубцаў, тых, хто пры жыцці вёў «бязбожны» лад і інш., таму адсутнасць магчымасці адпяваць памерлага ў храме іншы раз прыводзіла да сур'ёзных канфліктаў у абшчыне. У гэтай сувязі паказальны прыклад з Мінкавіцкай абшчыны (Браслаўскі раён) міжваеннага часу. Справа ў тым, што абшчынныя могілкі размяшчаліся ў в. Лапушэнішкі, якія знаходзіліся на пэўнай адлегласці ад храма. Больш таго, Мінкавіцкі храм размяшчаўся ў нязручным месцы. Восенню і вясной з-за разліву ручая і балоцістай мясцовасці ў храм вельмі цяжка было дастаўляць памерлых для адпявання. І гэта стала адной з прычын, якая ледзьве не прывяла да раздзялення абшчыны. Частка вернікаў вырашыла нават будаваць новы храм у в. Лапушэнішкі, дзе і знаходзіліся могілкі[29].

Як вынікае з матэрыялаў палявых даследаванняў, а таксама архіўных крыніц, абавязковым элементам на этапе адпраўкі памерлага на могілкі (а ў сімвалічным плане – на той свет) было «позвонить с колоколами по умершему». Сведчаннем важнасці такой традыцыі можа быць выпадак, які здарыўся ў Буеўшчынскай абшчыне (Браслаўскі раён) ў міжваенны перыяд. Духоўны настаўнік не пагадзіўся хаваць аднаго прыхажаніна і зачыніў храм. Тады частка вернікаў хацела нават зламаць дзверы храма і ўвайсці ў яго, каб «позвонить с колоколами по умершему»[30].

У старавераў прынята хаваць памерлага толькі на сваіх могілках, разам з астатняй сям'ёй. У рэгіёне нават фіксуюцца выпадкі, калі нябожчыка для гэтага вязуць з далёкіх мясцін і нават з іншых краін. Трэба заўважыць, што ў структуры стараверскіх могілак выдзяляюцца асобныя сямейныя ўчасткі, якія іншы раз нават абносіліся адмысловай агароджай. Гэта фіксуецца як у сучасны перыяд, так і па больш ранніх матэрыялах. Напрыклад, такая асаблівасць была характэрнай для Апідамскіх могілак (Пастаўскі раён) яшчэ ў 1920-я гг.: "так как у нас с Куклянского общества половина нашего общества хоронются на Апидамском кладбищы, имеится в каждыва хозяева свое место обнесено оградой и поставлина памятники в находящыхся обозначенных местах есть место предавать земле усопших"[31].

Па прыбыцці на могілкі труну здымаюць з воза (у сучасны перыяд – з машыны) і ставяць каля выкапанай магілы. Затым адбываецца малебен і развітанне з памерлым. Пасля гэтага труну апускаюць у магілу. Падчас пахавання ў магілу нярэдка кідалі грошы, тым самым як бы выкупалі для нябожчыка месца на могілках (і тым свеце) [11, с. 65]. Як сведчаць крыніцы, у старавераў рэгіёна да нашага часу паўсюдна фіксуецца традыцыя апускаць труну ў магілу не на вяроўках, а на адмысловых ручніках ("навінках", "палаценцах"). Лічылася, што апускаць на вяроўках нельга: "Пакойніка апускаюць на палаценцах / на вяроўках апускаць ня будуць" [6, с. 145]. Староверы ўсходняй Літвы лічылі, што "палаценцы" – гэта шырокі і зручны шлях на той свет, надзейная пераправа праз мора ці раку, якія душа памерлага павінна пераадолець [11, с. 63]. Выкарыстанне "навінак" у старавераў Шаркаўшчынскага раёна іншы раз тлумачылася некамфортным прабываннем на тым свеце, калі апускаць труну будуць на вяроўках: "У нас должны были опускать на навинки называлися. С льна ткали такое полотно, и полотно это тогда у дзве половинки складвалася, и скручивали у трубочку и на навинки потом опускали. Чем опустишь, на том потом на тым свете будешь ходить. А если по верёвке, будешь по веревке ходить. А теперь навинок этых нет, полотенца купляли, полотенца. Ну а у кого нет, и на веревках опускают" (г.п. Шаркаўшчына) [1, с. 310]. У старавераў Літвы гэтае палатно даволі часта кідалі ў магілу, ці пакідалі ў малельні для бедных, а часам забіралі дадому і потым выкарыстоўвалі на пахаванні іншых членаў сям'і – "каб па адной дарозе хадзіць" [11, с. 63]. У большасці мясцовасцяў Беларускага Падзвіння палатно, на якім апускалі труну, забіралі дадому, але часам, як, напрыклад, у в. Кірыліна Браслаўскага раёна, яго аддавалі бедным [5, с. 54].

Пасля таго як труну засыпалі зямлёй, на магіле ўстанаўлівалі крыж, абавязкова "ў нагах". На гэты конт у старавераў існавала павер'е, згодна якому падчас Другога прышэсця Ісуса Хрыста ўсе праведнікі і грэшнікі паўстануць з магіл, каб ісці на Страшны Суд. Пры гэтым яны будуць паднімацца, трымаючыся за крыж [10, с. 6]. Гэта асаблівасць адрознівала стараверскія могілкі ад мясцовых беларускіх. Нават у праваслаўнага беларускага насельніцтва рэгіёна больш пашыранай была традыцыя ўсталёўваць надмагільны крыж "у галаве". А таму на гэту рысу пастаянна звяртаюць увагу рэспандэнты: "То есць там бажніца і ставіцца не вот так пряма, а к бажніце і тагда, кагда ўстаёшь, то ўзяў у рукі крэст і пайшоў к Хрысту… Вот, крэст ставіцца ў нагах, а ў каталікаў ставіцца,

[28] Запісана ў 2022 г. аўтарам ад Цылінскай Р.І., 1939 г.н., Паповай Ф.І., 1943 г.н. у в. Більдзюгі Шаркаўшчынскага р-на.
[29] LCVA. – F. 1681. Ap. 1. B. 34. – L. 92r, 102r.
[30] LCVA. – F. 1681. Ap. 1. B. 450. – L. 137.
[31] LCVA. – F. 1681. Ap. 1. B. 350. – L. 31.

чем атлічаецца, у галаву” [32]. Крыж у старавераў васьміканцовы, што таксама адрознівала стараверскія могілкі ад праваслаўных.

Традыцыйным завяршэннем пахавальнага абраду з’яўляецца памінальнае застолле, якое ладзіцца пасля пахавання. У рэгіёне сярод стараверскага насельніцтва фіксаваліся і выпадкі, калі жалобны стол адбываўся яшчэ да пахавання: “Было ў нас это, я сама яшчэ была, пакойніка вынасілі на вуліцу, вот стаць гроб уже всё, закрыты і в доме уже памінальны стол” [33]. Рэспандэнты іншы раз тлумачаць такую асаблівасць вялікай адлегласцю да могілак і нерацыянальнасцю вяртання назад пасля пахавання. Як правіла, памінальны стол ладзіўся пасля пахавання ў хаце памерлага. У сучасны перыяд у рэгіёне жалобная вячэра іншы раз адбываецца ў сталовай ці кавярні. Фіксаваліся выпадкі, калі памінанне адбывалася непасрэдна на могілках пасля завяршэння пахавання [5, с. 54].

Перад пачаткам памінальнай вячэры прысутныя чыталі малітвы, успаміналі памерлага, і толькі тады садзіліся за стол. Характэрнай рысай жалобнай вячэры ў старавераў-беспапоўцаў рэгіёна была адсутнасць на стале гарэлкі. Аднак у больш познія перыяды, як сведчаць матэрыялы, гэту забарону выконвалі толькі фармальна – каб бутэлек не было на стале: “А водку раньше насілі кружкамі с каморы. … Ну нельзя было ставіць бутылкі на стол, а цяпер можна і бутылкі ставіць”[34]. Памінальная трапеза ў наш час яшчэ прадугледжвае прыгатаванне традыцыйных абрадавых страў, сярод якіх у старавераў на першае месца выступае куцця. Да цяперашняга часу сярод стараверскага насельніцтва рэгіёна захоўваецца патрабаванне гатаваць куццю з пшанічнага зерня: “Ну кутью делают. Ну унас кутья как яна, ну пшаніцу атварівают, перямоют, мёду туды і кутья. Ну её памінаць, еслі хто ўмерші, ідут памінаць, ну вот з кутьёй нада”[35]. “У нас куцья сварана з пшаніцы, мёду ложат, вадзічкай разводзят ну і тады вот…”[36]. У мінулым, як сведчаць матэрыялы, памінальны стол быў посным. Аднак у сучасны перыяд, як адзначаюць рэспандэнты, гэтай традыцыі ўжо не прытрымліваюцца: “У нас, в старобрадцев, как похороны были; раньше мяса не было, токо рыба была. А теперь уже пошло” (в. Каралева Шаркаўшчынскі р-н) [1, с. 158]. Традыцыя ў посным памінальным стале фіксавалася таксама ў старавераў Літвы [11, с. 66].

**Заключэнне.** Падводзячы высновы, неабходна адзначыць, што стараверская супольнасць з’яўляецца неад’емнай часткай этнакультурнага ландшафту Паўночна-Заходняй Беларусі. За больш чым трохсотгадовы перыяд пражывання на гэтых землях сфарміравалася ўнікальная этнаканфесійная група з адметнымі культурнымі традыцыямі. Найбольш выразна этнакультурная спецыфіка рускіх стараверaў у рэгіёне прасочваецца ў элементах духоўнай культуры, сярод якіх асаблівае месца займае пахавальны абрад. Пахавальная абраднасць стараверaў Паўночна-Заходняй Беларусі з’яўляецца неад’емнай часткай іх культуры, якая захавала нямала архаічных элементаў і ўяўленняў, праяўляе рысы ўласна рускай этнічнай культуры, але ў той жа час мае шмат падабенстваў з традыцыямі мясцовага беларускага насельніцтва. Даследаванне паказала, што нават на сучасным этапе пахавальны абрад стараверaў рэгіёна ўключае вялікую колькасць традыцыйных элементаў, характэрных яшчэ для абраднасці XIX – пачатку XX ст. Як вынікае з аналізу матэрыялаў, на рытуалы гэтага цыклу значны ўплыў аказвалі (і працягваюць аказваць) рэлігійныя нормы і асаблівасці веравучэння стараверaў. Гэта прадвызначыла захаванне традыцыйнай структуры і паслядоўнасці абраду, а таксама праявілася ў наяўнасці характэрных частак, элементаў і рытуальных дзеянняў. Аналіз матэрыялу паказаў, што ў пахавальным комплексе стараверaў відавочна прасочваюцца і ўласна рускія этнічныя традыцыі, якія таксама фіксуюцца ў стараверскага насельніцтва суседніх рэгіёнаў Літвы. Разам з тым, у гэтай частцы культуры маюцца агульныя рысы з мясцовым беларускім насельніцтвам. Гэта абумоўлена не толькі этнакультурным узаемадзеяннем, але і шэрагам агульных заканамернасцей развіцця сямейнай абраднасці ва ўсходнеславянскага насельніцтва. Аналіз матэрыялаў таксама паказаў істотную эвалюцыю абраду, у параўнанні нават з архіўнымі матэрыяламі першай паловы XX ст. На сучасным этапе адзначаецца знікненне шэрагу частак і этапаў абраду, асобных элементаў і рытуальных дзеянняў.

ЛІТАРАТУРА


1. Адамкович А. Фольклор старообрядцев Шарковщины (социолингвистический аспект): магист. работа; Вильн. пед. ун-т. – Вильнюс, 2008. – 321 с.
2. Анимеле Н. Быт белорусских крестьян // Этнографический сборник. – 1854. – Вып. II. – С. 111–268.
3. Байбурин А.К. Ритуал в традиционной культуре. Структурно-семантический анализ восточнославянских обрядов. – СПб.: Наука, 1993. – 240 с.
4. Глыбоччыны духоўнасці глыбіні: Народная духоўная культура Глыбоцкага раёна / аўт. кал.: В.С. Новак [і інш.]; пад агул. рэд. В.С. Новак. – Мінск: БЕЛТА, 2014. – 304 с.
5. Горбацкий А.А., Добжинская Т.В. Семейные похоронные обряды старообрядцев Витебщины в конце XIX – первой половине XX вв. (по материалам историко-этнографических экспедиций) // Вестник Полоцкого государственного университета. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2005. – № 1. – С. 52–54.
6. Минина Н.Е. Говор и материальная культура старообрядцев Витебщены (ареальный аспект) // Белорусское Поозерье: язык и духовная культура. – Минск, 2001. – С. 135 – 151


[32] Запісана ў 2022 г. аўтарам ад Цылінскай Р.І., 1939 г.н., Паповай Ф.І., 1943 г.н. у в. Більдзюгі Шаркаўшчынскага р-на.
[33] Запісана ў 2022 г. аўтарам ад Цылінскай Р.І., 1939 г.н., Паповай Ф.І., 1943 г.н. у в. Більдзюгі Шаркаўшчынскага р-на.
[34] Запісана ў 2022 г. аўтарам ад Цылінскай Р.І., 1939 г.н., Паповай Ф.І., 1943 г.н. у в. Більдзюгі Шаркаўшчынскага р-на.
[35] Запісана ў 2022 г. аўтарам ад Несцеравай М.О., 1945 г.н. у в. Кублішчына Мёрскага р-на.
[36] Запісана ў 2022 г. аўтарам ад Цімафеевай М.П., 1944 г.н. у в. Фралоўшчына Мёрскага р-на.

7. Минина Н.Е. «Нам всем подобает умирать за единый язъ...»: (о взаимосвязи языка и обрядности в старообрядческом социуме) // Веснік Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава. – 2004. – № 4(34). – С. 56–60.
8. Овсейчик В.Е. Погребальная обрядность белорусского сельского населения Подвинья на современном этапе // Этнография. – 2021. – № 2(12). – С. 52–71.
9. Овсейчик В.Е. «Нечистые» покойники в представлениях населения белорусско-русского (Полоцко-Псковского и Витебско-Смоленского) пограничья // Studia mythologica Slavica. – 2022. – Vol. 25. – S. 141–163.
10. Паншина А. Старообрядцы // Витебский курьер. – №35 (322). – 23 августа. – 1996. – С. 6.
11. По заветам старины. Мифологические сказания, заговоры, поверья бытовая магия старообрядцев Литвы. Издание подготовил Ю.А. Новиков. – СПб.: Тропа Троянова, 2005. – 296 с.
12. Седакова О.А. Поэтика обряда: Погребальная обрядность восточных и южных славян. – М.: Индрик, 2004. – 320 с.
13. Толстая С.М. Семантические категории языка культуры: Очерки по славянской этнолингвистике. – М.: Книж. дом «ЛИБРОКОМ», 2010. – 368 с.
14. Хурсан Т.І. Стараабраднікі Беларусі: мінулае і сучаснасць. – Мінск: Белар. навука, 2020. – 175 с.

*Паступіў 21.10.2025*

# ТРАДИЦИОННАЯ ПОГРЕБАЛЬНАЯ ОБРЯДНОСТЬ СТАРОВЕРОВ СЕВЕРО-ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ (НА ОСНОВЕ МАТЕРИАЛОВ ПОЛЕВЫХ ИССЛЕДОВАНИЙ НАЧАЛА XXI В.)

***канд. ист. наук, доц. В.Е. ОВСЕЙЧИК***
***(Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой)***

*Статья посвящена характеристике традиционной погребальной обрядности староверов Северо-Западной Беларуси. Основой для работы стали материалы современных фольклорно-этнографических исследований, проведенных в среде старообрядцев региона. Для исследования также привлечены и более ранние материалы и архивные источники. В статье выявлена традиционная структура похоронного обряда, охарактеризованы его основные этапы и ритуальные действия, прослежена эволюция погребального обряда в течение второй половины XX – начала XXI в. Приходим к выводу, что даже на современном этапе эта часть народной культуры староверов сохраняет немало архаичных черт. Как следует из анализа материалов, на похоронный обряд значительное влияние оказывали религиозные предписания и нормы староверов, что предопределило его структуру и повлияло на комплекс представлений и ритуальных действий. Эта особенность характерна и для современного периода. Анализ материалов также показал, что в структуре погребального обряда староверов явно прослеживаются собственно русские этнические традиции.*

***Ключевые слова:*** *погребальная обрядность, старообрядцы, Северо-Западная Беларусь, ритуал, похороны, традиция, эволюция.*

# TRADITIONAL FUNERAL RITUALITIES OF THE OLD BELIEVERS OF NORTHWESTERN BELARUS (BASED ON FIELD RESEARCH IN THE EARLY 21ST CENTURY)

***U. AUSEICHYK***
***(Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk)***

*This article examines the traditional funeral rites of the Old Believers of northwestern Belarus. This work draws on materials from modern folklore and ethnographic research conducted among Old Believers in the region. Earlier materials and archival sources were also used. The article identifies the traditional structure of the funeral rite, characterizes its main stages and ritual actions, and traces the evolution of the funeral rite during the second half of the 20th and early 21st centuries. We conclude that even today, this aspect of Old Believer folk culture retains many archaic features. As revealed by the analysis of the materials, the funeral rite was significantly influenced by the religious prescriptions and norms of the Old Believers, which determined its structure and influenced the complex of beliefs and ritual actions. This characteristic persists into the modern period. The analysis of the materials also revealed that the structure of the Old Believers' funeral rite clearly reflects distinctively Russian ethnic traditions.*

***Keywords:*** *funeral rites, Old Believers, northwestern Belarus, ritual, funeral, tradition, evolution.*

**УДК.77.041.7** **DOI 10.52928/2070-1608-2026-77-1-105-111**

# БЕЛОРУССКАЯ НАРОДНАЯ КУЛЬТУРА В ВЕРНАКУЛЯРНОЙ И ЭТНОГРАФИЧЕСКОЙ ФОТОГРАФИИ: СРАВНИТЕЛЬНЫЕ АСПЕКТЫ

***А.В. МАРКИШ***
***(Национальный центр современных искусств Республики Беларусь, Минск)***
***ORCID: https://orcid.org/0009-0001-9104-2016***
***e-mail: markish.a@bk.ru***

*Статья посвящена исследованию различий между вернакулярной и этнографической фотографией в контексте репрезентации белорусской народной культуры XX века. Рассмотрены цели, методы создания и особенности интерпретации этих двух типов визуальных источников. Акцентируется внимание на различиях в авторстве, композиции. Проанализированы примеры фотографий, иллюстрирующие различные подходы к фиксации и представлению белорусской народной жизни, а также их влияние на формирование представлений о культурном наследии.*

***Ключевые слова:*** *вернакулярная фотография, этнографическая фотография, белорусская народная культура, визуальная репрезентация, история, визуальные источники.*

**Введение.** Фотография, этот мощный инструмент фиксации реальности, оказала значительное влияние на сохранение и интерпретацию народной культуры. В XIX в. фотография стала значимым орудием для документирования и интерпретации народной культуры. Важным событием, подчеркнувшим её значение, стала Всероссийская этнографическая выставка 1867 г. Фотографический раздел выставки был призван запечатлеть этнографические особенности народов Российской империи, включая и белорусские земли[1]. Еще в 1865 г. фотографическая комиссия призвала фотографов создавать портреты в полный рост и поясные, детально отображающие национальные костюмы. На выставке было представлено около полутора тысяч этнографических фотографий, сопровождавшихся информацией о месте происхождения, этнической принадлежности и порядковым номером, что облегчало навигацию по каталогу. Этнографическая фотография, благодаря научной обоснованности и широкому распространению, оказала значительное влияние на формирование представлений о белорусской народной культуре как о целостном и систематизированном явлении [1, с. 3–5].

Вернакулярная же фотография оставалась в тени, не рассматриваясь как ценный источник информации. Так, как это почти без исключений портреты, созданные сначала в ателье и профессиональными фотографами, а после, с расширением любительской фотографии, кем-то из членов семьи или коллектива. Съемки выпускных, свадеб, застолий и похорон, портреты детей и взрослых, в формальной и неформальной обстановке заполняют семейные альбомы и собрания почти в каждой белорусской семье. Термин «вернакулярная фотография» впервые был введен в 1964 г. Джоном Шарковским, а в 2000 г., благодаря эссе Джеффри Бэтчена, интерес к этому направлению возродился. Однако, с развитием визуальной антропологии и ростом интереса к личной истории, вернакулярная фотография приобретает всё большую ценность как свидетель повседневной жизни и культурных практик белорусского народа. Кроме того, важно учитывать, что границы между вернакулярной и этнографической фотографиями не всегда четкие. В некоторых случаях фотографии, созданные для личного пользования, со временем приобретают этнографическую ценность, становясь важным источником информации о прошлом [2, с. 4–7].

Актуальность сравнительного изучения белорусской народной культуры в вернакулярных и этнографических фотографиях обусловлена развитием визуальной антропологии и расширением источниковой базы. Анализ этих разнородных источников, требующий учета контекста создания, целей фотографа, особенностей эпохи и культурных норм, позволяет выявить различия в репрезентации культуры изнутри и извне. Сопоставление открывает новые горизонты в понимании особенностей восприятия и репрезентации культуры различными группами, роли фотографии в формировании исторической памяти, а также способствует более полному осмыслению, сохранению и популяризации белорусского культурного наследия.

Целью данной статьи является изучение в сравнительном аспекте вернакулярной и этнографической фотографии как визуальных источников для изучения белорусской народной культуры, раскрытие их сходства и различия в подходах к фиксации и интерпретации культурных практик, а также оценка их вклада в формирование представлений о белорусской идентичности. Задачами, являются: во-первых, определить целевую аудиторию обоих типов фотографии; во-вторых, выявить цели и ключевые признаки вернакулярной и этнографической фотографий; в-третьих, исследовать стилистические различия вернакулярной и этнографической фотографий; в-четвертых, сопоставить особенности авторства в вернакулярной и этнографической фотографии.

**Основная часть.** В русском языке термин «фотография» охватывает как визуальный артефакт, полученный посредством фототехнологий, так и сам процесс его создания. Будучи репрезентацией реальности, фотографическое изображение приобретает значительный культурный потенциал, функционируя как её заместитель. По выражению Сьюзен Зонтаг, фотография представляет собой своего рода материализованную память, фиксирующую физические отпечатки [3, с. 5; 4, с. 102; 5, с. 105].

[1] Бояров П.И., Лобко В.Д., Макаенок С.А. Фотография. Энцикл. справ. – Минск: Бел. энцыкл. імя П. Броўкі, 1992. — 399 с.

На вернокулярную фотографию в Беларуси до недавнего времени обращали мало внимания. Хотя в каждом белорусском деревенском доме можно отыскать, фотографии, которые попадают в определение вернакулярных, в литературе не так часто можно встретить работы, посвященные этой теме. Связано это со спецификой научных дисциплин, которые могли бы ей заинтересоваться. Этнологи и фольклористы исследовали народные фотографии в контексте свадебной и застольной культуры, но мало было исследований, посвященных самой культуре фотографии в сельской или городской общине и её связи с культурой памяти. Например, обзоры и исследования о белорусском костюме и народном текстиле Л.В. Раковой, В.Н. Белявиной, В.А. Лобачевской и представленные в этих работах фотографии использованы для анализа и изучения традиционного белорусского костюма и текстиля [6, с. 435]. Особого внимания заслуживают работы О.А. Селях, посвященные «Трансформации повседневной жизни белорусских сельских девушек в Западном Полесье в 20 – 80-е гг. XX в.», где визуальным источником стали фотографии из семейных архивов, музейных фондов и опубликованных коллекций. Проблематизируя изменения в девичьем быте, автор прослеживает динамику этнокультурных процессов в Западном Полесье[2].

Существенный вклад в изучение роли и значения вернокулярной фотографии в белорусской культуре XX в. внёс С.В. Грунтов. В его статьях, посвящённых траурной и портретной фотографии, рассматривались истоки вернокулярной фотографии, её типология и социальный контекст. Итогом этих исследований стала книга «Фотография и культура памяти у белорусов во второй половине XIX – начале XXI века» – значимое исследование, раскрывающее вклад фотографии в белорусскую культуру и историю, а также глубоко исследующее роль и значение вернокулярной фотографии. Исследователь анализирует, как этот вид фотографии стал важным инструментом сохранения и передачи памяти о прошлых поколениях [2, с. 9; 4, с. 102]. Также нельзя не отметить работы И.А. Швед, рассматривающие взаимосвязь фотографии, реликвий и нарративов в контексте устной истории и фольклора. Анализ полевого материала показывает, что комментарии при просмотре фотографий и реликвий – идеальный объект для фольклористического исследования [8, с. 142]. Отдельного внимания заслуживает статья историка-музейщика, Т.А. Караевской «Фотопортрет конца XIX – начала XX века», посвященная изучению коллекции фотопортретов Горецкого районного историко-этнографического музея. Автор делает интересные выводы о значении фотографии как исторического ресурса и его важности для изучения истории и культуры белорусского народа [6, с. 436].

Традиционно фотография в первую очередь воспринимается как объект, который должно изучать искусствоведам. В этой перспективе основной фокус внимания сосредотачивается на деятельности и работах выдающихся фотографов, таких как Сигизмунд Юрковский, Лев Дашкевич или Зофья Хаментовская. Для искусствоведа большое значение имеет авторство фотографии и возможность оценить все работы фотографа, перспективы и художественное качество. Наиболее выдающимся достижением в этом направлении можно считать проект Надежды Савченко по изучению наследия Саввы Сивко и фотографического наследия Ивана Комара, или статья Ирины Смирновой по настенным фотоальбомам Неглюбки, фотографа Ф.И. Ковалева, Ольги Лобачевской, с публикацией, посвященной сельским фотографам 1930 – 1960-х гг. в Беларуси. Кроме собственно научных исследований, большую роль в привлечении внимания к вернокулярной фотографии имеет проект VEHA. До нашего времени из частных и музейных собраний были скомпелированны три коллекции, каждая из которых была представлена в виде альбома. Альбомы, где также встречается вернакулярная фотография, представлены каталогами выставки “Відзікі”, посвященной белорусской традиционной росписи на стекле, из музейных и личных, частных коллекций [2, с. 12; 6, с. 434; 9, с. 39; 10, с. 160; 11, с. 64; 12, с. 528; 13].

Во второй половине XIX века, под влиянием этнографических рисунков и гравюр, появилась этнографическая фотография. Этот научный жанр фотографии призван документировать этническую культуру, включая уклад жизни, традиционную одежду, обряды и окружающую среду. В рамках этнографической фотографии выделяются следующие ориентиры: постановочный (в данном случае съёмочный) процесс организуется для акцентирования определенных деталей, но может выглядеть искусственно; документальность – стремление к объективной фиксации материала без вмешательства, обеспечивая условную объективную достоверность; репортажность позволяет спонтанно запечатлеть живые моменты этнокультурной реальности, что ценно для динамичных обрядов и повседневных практик. Белорусские этнографы и фольклористы А.К. Сержпутовский и И.А. Сербов сыграли значимую роль в развитии этнографической фотографии как способа визуальной документации и сохранения культурного наследия Беларуси. В 1906 г. А.К. Сержпутовский, выполняя задание этнографического отдела Русского музея (Санкт-Петербург), осуществлял фотосъемку в Слуцком уезде, целью которой было запечатление образов крестьян, архитектурных памятников и других значимых элементов, характеризующих материальную и духовную культуру региона. И.А. Сербов как член Северо-Западного отдела Русского географического общества в период с 1910 по 1912 гг. провел ряд целенаправленных экспедиций, в ходе которых было создано около 5 тысяч фотоснимков. Данные материалы представляют собой значимый фонд визуальной информации, отражающий разносторонние аспекты жизни белорусского крестьянства того времени, включая их быт, ремесла, традиционную одежду и взаимодействие с природной средой, что делает их ценным ресурсом для изучения и сохранения культурного наследия. Информация о полевых фотофиксациях середины XIX вв. содержится

[2]Селях А.А. Трансфармацыя паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20-80-я гг. ХХ ст.: аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.07 / Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. – Мінск, 2025. – 30 с.

в работах М.Ф. Кустинского, принявшего участие во Всероссийской этнографической выставке 1867 г.: им выполнены фотоснимки этнографических типов и сцен народной жизни Витебской губернии [1, с. 65–89]. Отдельная роль в систематической фотофиксации этнографического материала принадлежит В.К. Костко – первому официальному фотографу Этнографического отдела Русского музея императора Александра III. В рамках экспедиционной деятельности Костко осуществил масштабную фотофиксацию этнографического материала на территории Могилёвской губернии, а также в Игуменском и Слуцком уездах Минской губернии. Со второй половины XX в. осуществлял систематическое изучение белорусской культуры М. Ф. Романюк. В 1969 г. им была проведена полевая экспедиция в Гомельской области. Результатом работы стали полевые дневники под общим названием «З вандровак па роднай старонцы», которые существенно пополнили корпус визуальных источников по белорусской этнографии[3].

